PolotskSU

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

УДК 902 (4/9)
№ дзяржрэгістрацыі 20142989
Інв. № ________________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Прарэктар па навуковай
рабоце

________________Д.А. Глухаў

«14» сакавіка 2016 г.

# СПРАВАЗДАЧА
аб навукова-даследчай рабоце

# СЕЛЬСКИЕ ПОГРЕБАЛЬНЫЕ ПАМЯТНИКИ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ XIV-XVIII ВВ.:ЛОКАЛЬНЫЕ ОСОБЕННОСТИ И РАЗВИТИЕ ПОГРЕБАЛЬНОЙ ОБЯЗАННОСТИ

# СЕЛЬСКІЯ ПАХАВАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII СТСТ.: ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І РАЗВІЦЦЁ ПАХАВАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ»
(заключная)

Кіраўнік навукова-даследчай работы ____________ В.У. Чараўко
«15» сакавіка 2016 г.

Нормакантралёр ____________ В.Ф. Кулеш
«15» сакавіка 2016 г.

Наваполацк 2016

PolotskSU

СПІС ВЫКАНАЎЦАЎ

Кіраўнік работы
старшы выкладчык
кафедры гісторыі і турызму,
магістр гістарычных навук (подпіс, дата) 15.03.2016. В.У. Чараўко
(рэферат, уводзіны,
заключэнне, раздз. 1–4, дадаткі)

Выканаўца тэмы
выкладчык кафедры гісторыі і турызму,
магістр гістарычных навук (подпіс, дата) 15.03.2016. А.Л. Коц
(падраздз. 3.1)

Нормакантралёр (подпіс, дата) 15.03.2016. В.Ф. Кулеш

PolotskSU

# РЭФЕРАТ

Справаздача 126 старонак, 46 малюнкаў, 10 табліц, 88 крыніц, 4 дадаткі.

БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ, ПАХАВАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ, МОГІЛЬНІКІ, ПАХАВАЛЬНЫ КОМПЛЕКС, МАГІЛА, ПАХАВАННЕ, НАДМАГІЛЛЕ, ТРУНА, ШКІЛЕТ, КАСЦЯК, АРЫЕНТЫРОЎКА ПАХАВАННЯ, ПАХАВАЛЬНЫ ІНВЕНТАР, ПАМІНАЛЬНЫ ІНВЕНТАР

Аб'ект даследавання: пахавальныя традыцыі на Беларусі ў XIV–XVIII стст.

Прадмет даследавання: сельскія пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

Мета даследавання: вылучэнне лакальных асаблівасцей і этапаў развіцця пахавальнай абраднасці насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. (па даных археалогіі).

Задачы даследавання:

1. распрацоўка класіфікацыі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам трохузроўневай структуры пахавальнага помніка (могільнік — пахавальны комплекс — пахаванне);
2. выяўленне адметнасцей размяшчэння асобных катэгорый пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з картаграфаваннем атрыманых вынікаў;
3. правядзенне археалагічных раскопак на раней не вывучаных пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.;
4. камеральная апрацоўка матэрыялаў археалагічных даследаванняў 2013–2015 гг. на могільніках каля вв. Івесь, Клешчыно, Жарнасекава, Мураўшчына, Доўгае, Васькавічы, што не былі ўведзены ў навуковы зварот;
5. вылучэнне канструктыўных асаблівасцей і параметраў магільных ям і трун з могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.;
6. правядзенне класіфікацыі інвентара пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам уласных матэрыялаў;
7. правядзенне рэканструкцыі элементаў пахавальнай абраднасці па даным археалогіі, этнаграфіі і пісьмовых крыніц з вывучэннем залежнасці пахавальнага абрада ад рэлігійнай прыналежнасці і сацыяльнага статуса пахаванага з вывучэннем эвалюцыі і вылучэнне лакальных варыянтаў пахавальнай абраднасці пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

У выніку даследавання:

1. распрацавана класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам трохузроўневай структуры пахавальнага помніка (могільнік — пахавальны комплекс — пахаванне);
2. устаноўлена, што на тэрыторыі Беларускага Падзвіння арэалы канцэнтрацыі жальнічных могільнікаў у асноўным супадаюць з арэаламі распаўсюджання грунтовых пахаванняў з каменнымі крыжамі, што пацвярджаецца іх картаграфаваннем;
3. упершыню праведзены археалагічныя раскопкі грунтовых пахаванняў з каменнымі надмагіллямі на могільніку каля вв. Доўгае, Васькавічы Глыбоцкага, в. Дубраўка Гарадоцкага р-на. Абвергнута наяўнасць познесярэднявечнага могільніка каля в. Аўдзейкава Гарадоцкага р-на.
4. праведзена камеральная апрацоўка матэрыялаў археалагічных даследаванняў 2013–2015 гг. на могільніках каля вв. Івесь, Доўгае, Васькавічы Глыбоцкага, Клешчыно,

Жарнасекава Бешанковіцкага, Мураўшчына Полацкага, Дубраўка Гарадоцкага р-наў, якія раней не былі ўведзены ў навуковы зварот;

5. вызначаны канструктыўныя асаблівасці і метрычныя параметры магільных ям і трун з могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам матэрыялаў уласных археалагічных даследаванняў. Праведзена графічная рэканструкцыя трун з захаваўшыміся цвікамі з могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага р-на;

6. праведзена класіфікацыя інвентара пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. (уключаючы кераміку) з улікам уласных матэрыялаў;

7. правядзена рэканструкцыя элементаў пахавальнай абраднасці па даным археалогіі, этнаграфіі і пісьмовых крыніц з вывучэннем залежнасці пахавальнага абрада ад рэлігійнай прыналежнасці і сацыяльнага статуса пахаванага з вывучэннем эвалюцыі і вылучэнне лакальных варыянтаў пахавальнай абраднасці пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.



PolotskSU

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ .......... 6
1 СЕЛЬСКІЯ ПАХАВАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.: КЛАСІФІКАЦЫЯ, ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ І КАРТАГРАФАВАННЕ .......... 7
1.1 Класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. .......... 7
1.2 Гісторыя вывучэння сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. .......... 9
1.3 Картаграфаванне сельскіх могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. .......... 12
2 ХАРАКТАРЫСТЫКА ПАХАВАЛЬНЫХ КОМПЛЕКСАЎ МОГІЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст. (ПА ВЫНІКАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 2013–2015 гг.) .......... 14
2.1 Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на .......... 14
2.2. Могільнік каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на .......... 17
2.3 Могільнік каля в. Клешчыно Бешанковіцкага р-на .......... 21
2.4 Могільнік каля в. Мураўшчына Полацкага р-на .......... 24
2.5 Могільнік каля в. Дубраўка Гарадоцкага р-на .......... 25
2.6 Могільнік каля в. Доўгае Глыбоцкага р-на .......... 28
2.7 Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на .......... 30
2.8 Канструктыўная асаблівасці магільных ям і трун пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. .......... 30
3 ІНВЕНТАР ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст. .......... 33
3.1 Кераміка: памінальны інвентар .......... 34
3.2 Пахавальны інвентар .......... 40
4 ЭЛЕМЕНТЫ ПАХАВАЛЬНЫ АБРАДА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст. .......... 43
ЗАКЛЮЧЭННЕ .......... 53
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ .......... 55
ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ І ПРАКТЫЧНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ АТРЫМАНЫХ ВЫНІКАЎ .......... 60
ДАДАТАК А .......... 62
Размяшчэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. .......... 62
ДАДАТАК Б .......... 69
Карты. Планы могільнікаў .......... 69
ДАДАТАК В .......... 93
Калекцыйныя вопісы знаходак .......... 93
ДАДАТАК Г .......... 123
Размеркаванне выяўленага ў пахаваннях Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. інвентара па катэгорыях .......... 123



PolotsSU

PolotskSU

## УВОДЗІНЫ

Сельскія пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з'яўляюцца маладаследаванай катэгорыяй помнікаў археалогіі. Да канца 1980-х гадоў сельскія пахаванні не былі прадметам спецыяльнага вывучэння, а даследаваліся толькі пры выпадковым выяўленні. Пачынаючы з канца 1980-х гг. пачаліся сістэматычныя раскопкі гэтых археалагічных помнікаў (В.М. Ляўко, Д.У. Дук, М.В. Клімаў, В.У. Чараўко). Работ, прысвечаных вывучэнню структуры і развіцця сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст., няма. Маюцца толькі артыкулы, прысвечаныя вынікам раскопак на асобных помніках. Усе наяўныя матэрыялы па данай тэме абагульнены ў двух публікацыях: В.М. Ляўко, Л.У. Дучыц, А.В. Іова [1]; М.В. Клімава і В.У. Чараўко [21].

Пахавальная абраднасць з'яўляецца кансерватыўнай, аднак падлягае зменаў у выніку рэлігійных, сацыяльных і палітычных працэсаў. Картаграфаванне вядомых пахавальных помнікаў XIV–XVIII стст. паказала іх пераважную канцэнтрацыю ў двух археалах (1 — Гарадоцкі раён, 2 — Полацкі, Ушацкі, Глыбоцкі раёны). Даследаванне сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з правядзеннем археалагічных раскопак дасць магчымасць вылучыць лакальныя варыянты пахавальнага абрада і вылучыць этапы яго развіцця. Прынцып вывучэння пахавальнай абраднасці шляхам вылучэння лакальных варыянтаў і этапаў развіцця з'яўляецца традыцыйным для археалогіі. Вывучэнне сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. такім чынам праводзіцца ўпершыню.

Мэтай работы па тэме «Сельскія пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.: лакальныя асаблівасці і развіццё пахавальнай абраднасці» з'яўляецца вылучэнне лакальных асаблівасцей і этапаў развіцця пахавальнай абраднасці насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. (па даных археалогіі). У межах работы вырашаліся наступныя задачы:

1. распрацоўка класіфікацыі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам трохузроўневай структуры пахавальнага помніка (могільнік — пахавальны комплекс — пахаванне);

2. выяўленне адметнасцей размяшчэння асобных катэгорый пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з картаграфаваннем атрыманых вынікаў;

3. правядзенне археалагічных раскопак на раней не вывучаных пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.;

4. камеральная апрацоўка матэрыялаў археалагічных даследаванняў 2013–2015 гг. на могільніках каля вв. Івесь, Клешчыно, Жарнасекава, Мураўшчына, Доўгае, Васькавічы, што не былі ўведзены ў навуковы зварот;

5. вылучэнне канструктыўных асаблівасцей і параметраў магільных ям і трун з могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.;

6. правядзенне класіфікацыі інвентара пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з улікам уласных матэрыялаў;

7. правядзенне рэканструкцыі элементаў пахавальнай абраднасці па даным археалогіі, этнаграфіі і пісьмовых крыніц з вывучэннем залежнасці пахавальнага абрада ад рэлігійнай прыналежнасці і сацыяльнага статуса пахаванага з вывучэннем эвалюцыі і вылучэнне лакальных варыянтаў пахавальнай абраднасці пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

PolotskSU

# 1 СЕЛЬСКІЯ ПАХАВАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.: КЛАСІФІКАЦЫЯ, ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ І КАРТАГРАФАВАННЕ

## 1.1 Класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

Класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст., улічваючы іх шматузроўневую структуру, павінна праводзіцца на кожным узроўні. На узроўні могільнікаў (пахавальных груп) пахавальныя помнікі мае сэнс класіфікаваць па трох крытэрыях. Першы крытэрый – знешнія прыкметы пахавальных комплексаў, што ўтвараюць групу. Могільнікі традыцыйна падзяляюць на *курганныя* і *бескурганныя* (або *грунтовыя*) [6; 49]. Гэтыя таксанамічныя адзінкі мы будзем называць відамі могільнікаў. Акрамя курганных і бескурганных, варта вылучыць яшчэ два віды могільнікаў – *жальнікі* і *змешаныя*. Апошнія ўтвараюцца пахавальнымі комплексамі некалькіх відаў. Да іх трэба аднесці курганна-жальнічныя могільнікі [1; 15; 18].

Змешаны могільнік сведчыць аб бытаванні розных пахавальных традыцый, што ўказвае на працяглае яго функцыянаванне і альбо на змены ў пахавальнай практыцы, альбо на выкарыстанне могільніка прадстаўнікамі розных этнасаў і канфесій. Ужо адзначалася, наяўнасць у межах аднаго могільніка пахавальных комплексаў, пазначаных як курганнымі насыпамі, так і каменнымі надмагіллямі, традыцыйна для левабярэжжа Дзвіны і выступае характэрнай знешняй прыкметай помнікаў вывучаемага перыяду.

У залежнасці ад таго, адносіліся пахавальныя групы да горада (мястэчка, замка) або выкарыстоўваліся вясковым насельніцтвам, вылучаюцца два тыпы могільнікаў: *гарадскія* (некропалі) і *сельскія* [1, с. 129, 132, 135].

Паколькі ў пахавальную групу могуць ўваходзіць не толькі пахавальныя комплексы, але і дадатковыя звязаныя з могілкамі элементы, важнай будзе наяўнасць на могільніку або пры ім культавай пабудовы (напрыклад, царквы, касцёла, капліцы). Паводле гэтага крытэрыя пахавальныя групы будзем дзяліць на дзве катэгорыі – *могілкі з культавай пабудовай* і *могілкі без культавай пабудовы*.

На ўзроўні пахавальнага комплекса класіфікацыю мэтазгодна праводзіць паводле пахавальнага збудавання. Выкарыстаўшы гэты крытэрый, мы атрымаем наступныя віды пахавальных комплексаў: *курганнае пахаванне, грунтовае пахаванне, жальнічнае пахаванне* і *пахаванне ў культавай пабудове*. Падвідам грунтовага пахавання будзе з’яўляцца *жальнічнае пахаванне*.

Пахавальны комплекс першага віда мае над пахаваннем земляны або каменны насып (курган). Грунтовае (бескурганнае) пахаванне яго не мае і можа не мець прыкмет на паверхні. Больш карэктна будзе казаць пра адсутнасць зафіксаванага пахавальнага збудавання: не выключана, што грунтовыя пахаванні першапачаткова мелі надмагіллі (напрыклад, у выглядзе невысокага землянога насыпа або драўлянай канструкцыі), якія не захаваліся да часу даследавання. Такім чынам, да грунтовых будуць адносіцца пахаванні, ніяк не пазначаныя на паверхні, пазначаныя невысокімі землянымі насыпамі і драўлянымі канструкцыямі. Для *пахаванняў у культавай пабудове* пахавальным збудаваннем будуць з’яўляцца сама пабудова – царква або касцёл. Таму вылучэнне пахаванняў у культавай пабудове ў якасці самастойнага віда пахавальных комплексаў таксама цалкам апраўдана.

Пытанне сэнсавага напаўненне тэрміна “жальнік” патрабуе асобнага разгляду па прычыне рознага вызначэння паняцця «жальнік» у літаратуры. У спецыялізаваных энцыклапедычных выданнях жальнікі вызначаюцца як “магілы XIII – XVIII стст., абазначаныя абкладкай круглаватай, авальнай ці чатырохвугольнай формы з камянёў, 1 – 2 валунамі ў галавах і нагах, каменнымі крыжамі або пакрытыя валунамі” [3].

У чацвёртым томе “Археалогіі Беларусі” паняцце “жальнік” не вызначаецца, аднак маецца тэрмін “курганна-жальнічныя могільнікі”, якія дэтэрмінуюцца як “пахавальныя

PolotskSU

помнікі, дзе земляныя курганы змяняюцца каменнымі курганамі, затым грунтовымі магіламі (якія зверху маюць валунныя кладкі авальнай ці прамавугольнай формы), а потым магіламі, дзе на паверхні валуны толькі ў галавах і нагах” [2, с. 125-126]. Акрамя таго, у згаданым абагульняючым выданні выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны:

– “каменныя магілы” – пахавальныя помнікі XI – XVII стст., што маюць каменныя кладкі авальнай ці прамавугольнай формы. Праўда, у якасці прыкладаў прыведзены надмагіллі ў выглядзе не *кладак*, а *абкладак* па перыметры;
– “жальнічныя магілы” – тое ж, што і каменныя магілы (?), пахавальныя помнікі з валуннымі абкладкамі; супрацьпастаўлены пазнейшым пахаванням са стэлападобнымі камянямі ў галавах;
– “могільнікі з каменнымі надмагіллямі” – пахавальныя помнікі з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі, “перш за ўсё” ў выглядзе валуноў у галавах або ў галавах і нагах, прычым валуны ў галавах, як правіла, абцясаныя;
– “могілкі з камянямі і каменнымі крыжамі” [1, с. 125-126].

Пералічаныя паняцці адназначна не вызначаны, што не дазваляе ў поўнай меры зразумець, як яны размяжоўваюцца і ў якіх іерархічных адносінах знаходзяцца. Незразумелымі застаюцца некаторыя прынцыповыя моманты. Напрыклад, паколькі тэрмін “курганна-жальнічны могільнік” утвораны спалучэннем двух паняццяў (“курган” і “жальнік”), жальнік можна вызначыць як “курганна-жальнічны могільнік мінус курганы”. Але адносяцца пры такім падзеле каменныя курганы да курганоў або прылічваюцца да жальнікаў? Жальнік і жальнічная магіла – гэта адно і тое ж? Чаму могільнікі з каменнымі надмагіллямі адасабляюцца ад каменных магіл, якія таксама маюць каменныя надмагільныя канструкцыі? Якія варыянты надмагілляў, акрамя валуноў у галавах (галавах і нагах), могуць мець “могільнікі з каменнымі надмагіллямі”?

Паняцце “жальнік” утворана не штучна. В.В. Сядоў вызначае жальнік як мясцовы наўгародскі тэрмін [36, с. 180]. Але арэал бытавання слова “жальнік” шырэй і не абмяжоўваецца Наўгародчынай. Паводле З. Даленгі-Хадакоўскага і К. Тышкевіча, жальнікамі называла старыя могілкі і насельніцтва Навагрудчыны і Віцебшчыны [52, с. 273]. В. Ластоўскі ў сваім “Расійска-крыўскім (беларускім) слоўніку” вызначае жальнік як магілу або магільнік [24, с. 174].

Паводле І.І. Сразнеўскага і М. Фасмера, слова “жальнік” узыходзіць да старажытнарускага і стараславянскага “*жаль*” – грабніца [33, стб. 845; 40, с. 35; Археалогія СССР-14, с. 180]. “Жаль” паходзіць ад праславянскага **žalь*, утворанага на аснове індаеўрапейскага кораня *$g^{u}el$-, што абазначаў боль і смерць [50, с. 207]. Наяўнасць слова “жáлець” (“тлець”) можа сведчыць аб тым, што, паводле паходжання, падобныя словы маглі ўказваць на трупаспаленне [50, с. 206-207].

У лік археалагічных тэрмінаў яно трапіла ў XIX ст. з жывой гутарковай мовы. З. Даленга-Хадакоўскі выкарыстоўваў тэрмін “жальнікі” як у дачыненні да “старажытных могілак, пакінутых пагостаў”, так для вызначэння “ўвогуле малых магіл мірных жыхароў” і нават “посуду, што напоўнены спаленымі касцямі” [8, с. 2; 52, с. 272-273]. Для паўнаты ўзгадаем і вызначэнне жальнікаў як “магіл, абкладзеных унутры камянямі” [8, с. 416]. В.В. Сядоў таксама кажа аб наяўнасці магіл, у якіх сценкі і дно магільных ям былі выкладзены камянямі [36, с. 180].

А.А. Спіцын і В.В. Сядоў называлі жальнікамі не асобныя пахавальныя комплексы, а “могілкі з грунтовых магіл, абстаўленых на паверхні валунамі ў выглядзе кола або прамавугольніка” [36, с. 180; 39]. Асобныя пахавальныя комплексы з разнастайнымі каменнымі надмагіллямі В.В. Сядоў вызначаў як “жальнічныя магілы” і адзначаў, што каменныя надмагіллі эвалюцыянавалі ад кладак у выглядзе кола да авальных і прамавугольных кладак, валуноў у галавах і нагах і галавах, каменнага крыжа ў галавах [36, с. 180]. Такі падыход (жальнік – гэта могілкі, жальнічная магіла – асобны пахавальны комплекс) падаецца слушным, таму мы будзем прытрымлівацца яго.

PolotskSU

Унутры жальнічных пахаванняў як віда пахавальных комплексаў вылучаюцца тыпы. Крытэрыем будуць служыць канструктыўныя асаблівасці каменнага надмагілля. Вылучэнне каменных магіл, могільнікаў з каменнымі надмагіллямі і могілак з камянямі і каменнымі крыжамі, аб якіх казалася вышэй, якраз звязана з класіфікацыяй жальнічных пахаванняў. Тэрмін "каменныя магілы" для апісання пахавальных помнікаў Беларускага Панямоння ўвялі ў навуковы зварот у канцы XIX ст. В.А. Шукевіч і Э.А. Вольтэр [1]. Акрамя каменных магіл, яны вылучалі таксама каменныя курганы. Але паслядоўнае размежаванне згаданых катэгорый праведзена не было [].

У канцы 1980-х – 1990-х гадах жальнічныя магілы Беларускага Панямоння і, часткова, Падзвіння грунтоўна вывучала А.В. Квяткоўская. Зыходзячы з формы каменнага надмагілля, пахавальныя комплексы, датуемыя перыядам да канца XVII ст., яна падзяліла на тры тыпы магіл (з кладкамі круглай, авальнай і прамавугольнай формы). Паводле канструкцыйных асаблівасцей надмагілляў унутры II і III тыпаў вылучаліся варыянты. Для пахаванняў XVIII – XIX стст. даследчыца адзначыла наяўнасць двух тыпаў магіл – з кладкамі авальна-падоўжанай формы з бессістэмна выкладзеных камянёў і з надмагіллямі з камянёў, пакладзеных у некалькі паралельных радкоў. У абодвух выпадках у галавах і нагах фіксаваліся вялікія камяні [18, с. 42-47].

Каменныя могільнікі, што даследавала А.В. Квяткоўская, маюць вялікі храналагічны дыяпазон (X – XVII ст.) і пераважна лакалізаваны ў Панямонні. Жальнічныя пахаванні Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. мы прапануем падзяліць на два тыпы: з *надмагіллем у выглядзе кладкі* (суцэльнай вымасткі, выбрукоўкі) і з *надмагіллем у выглядзе абкладкі* магілы па перыметры. Унутры кожнага тыпа вылучым наступныя варыянты: надмагілле без буйных камянёў у галавах і нагах; надмагілле з буйным камянем у галавах і нагах; надмагілле з буйным камянем у галавах; надмагілле з каменным крыжам у галавах.

Такім чынам, улічваючы шматузроўневую структуру пахавальных помнікаў, іх класіфікацыю трэба праводзіць на кожным узроўні. На ўзроўні могільнікаў (пахавальных груп) вылучаюцца віды, тыпы і катэгорыі. Крытэрыем вылучэння віда служаць знешнія асаблівасці пахавальных комплексаў, што ўтвараюць групу. Вылучаюцца курганныя, грунтовыя (у т.л. жальнікі) і змешаныя могільнікі. Тып могільнікаў (гарадскія, сельскія) вызначаецца з улікам таго, адносіліся пахавальныя групы да гарадоў або выкарыстоўваліся сельскім насельніцтвам. У залежнасці ад наяўнасці на могільніку або пры ім культавай пабудовы, могільнікі дзеляцца на две катэгорыі. На ўзроўні пахавальных комплексаў класіфікацыя праводзіцца паводле пахавальнага збудавання з вылучэннем наступных відаў: курганныя, грунтовыя (у т.л. жальнічныя) пахаванні, а таксама пахаванні ў культавых пабудовах. Унутры жальнічных пахаванняў вылучаюцца наступныя тыпы: з надмагіллямі ў выглядзе кладкі і ў выглядзе абкладкі. Зыходзячы з канструктыўных асаблівасцей надмагілляў, тыпы падзяляюцца на варыянты (надмагіллі без буйных камянёў у галавах і нагах, надмагіллі з буйнымі камянямі ў галавах і нагах, надмагіллі з буйнымі камянямі ў галавах, надмагіллі з каменнымі крыжамі).

## 1.2 Гісторыя вывучэння сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

З чатырох дзесяткаў магільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII, даследаваных з ускрыццём культурнага пласта, на долю сельскіх прыходзіцца ўсяго 16. Між тым як колькасць сельскіх населеных пунктаў, так і колькасць сельскага насельніцтва ў вывучаемы перыяд значна перавышалі колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва.

Сельскія могільнікі звычайна размяшчаліся на адлегласці 1 – 2 км ад вёскі, каля дарогі, у гаі, у лесе [1, с. 124]. Тыповым для было размяшчэнне могілак на пагорках (калі гэта дазваляў рэльеф). Гэта датычыцца, напрыклад, могілак каля вв. Двор Павулле і

PolotskSU

Варонічы Полацкага раёна. Каля вёскі Глыбачка Полацкага раёна могілкі, наадварот, размешчаны на роўнай пляцоўцы [9, с. 267].

Могільнікі былі абмежаваны, галоўным чынам, адмыслова прарытымі ровікамі. Межавыя ровікі вакол могілак для аховы ад выпасу жывёлы ў Расіі прадпісваліся царскім указам 1731, які распаўсюдзіўся на беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Аднак, магчыма, яны існавалі і раней. Ровікі стваралі сімвалічнае магічнае кола, што адмяжоўвала сакральную прастору (могілкі) ад прафаннай [31, с. 73]. Плот вакол праваслаўных могілак укараніўся на Беларускім Падзвінні толькі ў пасляваенны час. На каталіцкіх могілках агароджа мела больш глыбокія традыцыі [31, с. 73].

Пануючым відам могільнікаў у вывучаемы перыяд былі жальнікі, грунтовыя і змешаныя могільнікі. Для левабярэжжа Заходняй Дзвіны характэрны змешаныя могільнікі, якія складаліся з курганных і жальнічных пахаванняў. Гэтая адметнасць не раз адзначалася ў археалагічнай і этнаграфічнай літаратуры [9; 18; 31].

Курганныя пахаванні з’яўляюцца нешматлікай катэгорыяй археалагічных помнікаў XIV – XVIII стст. Дамінуючы від пахавальнага збудавання з VIII – IX стст., курганы паступова выцясняюцца грунтовымі магіламі пасля прыняцця хрысціянства. З XII ст. звычай насыпаць над пахаваннямі курганы пачаў знікаць, а ў XIII ст. курганныя пахаванні саступілі месца бескурганным. Тым не менш, як рэліктавая з’ява курганныя пахаванні практыкаваліся і ў эпоху позняга сярэднявечча і ранняга новага часу [1, с. 124-125; 3, с. 491-492; 5, с. 178].

Адзін курган у складзе курганнай групы каля в. Нарушова Глыбоцкага раёна быў даследаваны археолагамі А. і У. Галубовічамі. У насыпе было знойдзена тры пахаванні. Знаходка фрагментаў керамікі дазволіла датаваць іх XIII – XIV стст. [16, с. 77-78; 47, с. 44; 51, s. 5].

Два курганных пахавання, што былі размешчаны на могілках каля маёнтка Забалоцце Лепельскага павета, даследаваў М.Ф. Кусцінскім. Інфармацыю аб гэтым падае А.М. Семянтоўскі. Група з 12 курганоў знаходзілася на ўскраіне закінутых могілак, насыпы якіх былі абкладзены камянямі. Размова, такім чынам, ідзе аб курганна-жальнічным могільніку. Могілкі не мелі крыжоў. Раскопкі двух бліжэйшых да жальніка курганоў выявілі два пахаванні, адно з якіх надзейна датуецца на падставе нумізматычнай знаходкі другой паловай XVI ст. [38, с. 27-28].

Аб падобных раскопках паведамляе і сам М.Ф. Кусцінскі. У адпаведнасці з другім паведамленнем, ён праводзіў раскопкі курганоў у Лепельскім павеце. Курганоў было каля 10. Яны размяшчаліся ў адну лінію. Апошні курган прымыкаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх даўно не хавалі. Усе крыжы згнілі. На могілках былі заўважаны невялікія насыпы, абкладзеныя камянямі. Раскопкі праводзіліся на двух бліжэйшых да могілак курганах, у адным з якіх была знойдзена манета [23, с. 235]

У гэтых апісаннях супадае мясцовасць, від пахавальнага збудавання, асаблівасці курганнага магільніка і яго размяшчэнне, колькасць даследаваных курганоў, пол пахаваных, факт наяўнасці манеты на лобнай костцы, іншыя знаходкі. У абодвух выпадках курганны абрад пахавання звязваецца з перажыткамі паганства. Можна меркаваць, што размова ідзе аб адных і тых жа раскопках [45].

Яшчэ адно курганнае пахаванне, датуемае на падставе манеты другой паловай XVI ст., было даследавана каля в. Кузьмаўшчына на Браслаўшчыне [1, с. 125; 16, с. 77].

Пахавальны комплекс, пераходны ад курганнага да дальнічнага пахавання, быў выяўлен А.В. Квяткоўскай на могільніку каля в. Перавоз Глыбоцкага раёна. Надмагільныя канструкцыі пахавальных комплексаў у асноўным уяўлялі каменныя кладкі (у адзін слой) прамавугольнай або авальнай формы з буйнымі валунамі ў галавах і нагах. Адна намагільная канструкцыя ўяўляла сабой круглы насып вышынёй 0,65 м з пяску, з заходняга боку насыпа знаходзілася два камяня. Касцяк размяшчаўся ў пахавальнай яме. Пахаванне датуецца XIII – XIV стст. [19, с. 31-32].

Пяць жальнічных пахаванняў былі даследаваны В.У. Чараўко каля в. Бірулі Докшыцкага раёна. Пахавальныя комплексы былі пазначаны кладкамі падавальнай формы. У

некаторых выпадках у галавах змяшчаўся вялікі валун. Пахаванні датуюцца пачаткам XVI ст. Побач размяшчаўся курган з 7 упускнымі пахаваннямі, даследаваны А.В. Вайцяховічам. Упускныя пахаванні маркіраваліся каменнымі кладкамі з буйнымі камянямі ў галавах. На падставе нумізматычных знаходак гэтыя пахаванні датуюцца другой паловай XVI ст. Паводле В.В. Сядова, у наўгародскім рэгіёне спачатку засвойвалася міжкурганная прастора, упускныя пахаванні ў курганы рабіліся пазней [37]. Можна дапусціць, што падобная сітуацыя існавала і на Падзвінні.

Жальнічную магілу XII – XIV стст. каля в. Пуцілкавічы Ушачскага раёна даследаваў А.М. Ляўданскі. Надмагільнае збудаванне ўяўляла сабой каменную абкладку. Насып адсутнічаў. Касцяк быў знойдзены ў неглыбокай яме [32, с. 234].

Археалагічныя раскопкі жальнічнага могільніка каля в. Новы Болецк Гарадокскага раёна праводзіла В.М. Ляўко. Могільнік моцна пацярпеў ад выбухаў у часы Вялікай Айчыннай вайны, таму, нягледзячы на значную ўскрытую плошчу, у большасці выпадкаў першапачатковая форма надмагільных канструкцый і магільных ям невядома. Тым не менш, былі зафіксаваны і непарушаныя надмагіллі ў выглядзе абкладак магіл валунамі па перыметру (“каменныя аградкі”), знойдзены каменны крыж. У асобных выпадках размешчаныя побач надмагіллі маюць агульную “сценку”. Мяркуемы час функцыянавання могільніка – XIV – XVI стст. [27; 28].

Археалагічныя даследаванні трох жальнічных магіл XVII – XVIII стст. на могільніку каля в. Туржэц 2 Полацкага раёна праводзіў Д.У. Дук. Надмагільныя канструкцыі ўяўлялі сабой каменныя абкладкі магіл па перыметры з буйнымі камянямі ў галавах і нагах, у т.л. з выбітым крыжам. Магілы размяшчаліся побач, надмагіллі мелі агульныя “сценкі” [9, с. 263-265].

Аддзінаццаць пахаванняў было ўскрыта на жальніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна. Надмагільныя канструкцыі ва ўсіх выпадках уяўлялі каменныя абкладкі магіл па перыметры з буйнымі камянямі ў галавах і нагах. У адным выпадку на валуне быў высечаны крыж. Прасочваецца такая ж тэндэнцыя да агульнай “сценкі” ў абкладках у тым выпадку, калі надмагіллі размешчаны побач. Адно пахаванне датуецца XII – XIV, астатнія – в XV – XVI стст.

Два жальнічных пахаванні былі даследаваны В.У. Чараўко на могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна. Адно пахаванне было пазначана буйным валуном з усходняй і камянем меншага памера з заходняга бакоў. Паміж імі ў адзін слой ляжалі камяні меншага памера, якія ўтваралі суцэльную кладку. У цэнтры былі размешчаны буйнейшыя, па краях – драбнейшыя камяні. Другое пахаванне было пазначана каменным крыжам з усходняга боку. Аснаванне крыжа было абкладзена камянямі з мэтай яго ўмацавання. На крыжы быў высечаны знак – крыж з паўсферай. Акрамя таго, канструкцыя ўключала абкладку магілы па перыметру. Пахаванні датуюцца XV – XVI стст.

Пахаванне, якое было пазначана каменным крыжам, даследаваў на могілках в. Ветрына Полацкага раёна К. Гаворскі. У магіле было знойдзена некалькі касцякоў. Пахаванне на падставе нумізматычнай знаходкі датуецца першай паловай XVII ст. У адрозненне ад іншых могільнікаў, аб гэтым нам вядома, што пры ім мелася царква [7, с. 100].

У час архелагічных раскопак на в. Манастыр (воз. Неспіш) на Браслаўшчыне Л.У. Дучыц былі выяўлены рэшткі пахавання без рэшткаў надмагільных канструкцый, а таксама пабытовае і будаўнічае смецце XVI – XVIII стст. На в. Манастыр працяглы час размяшчаўся праваслаўны манастыр, потым ператвораны ва ўніяцкі [14, с. 20]

Грунтовыя пахаванні без рэшткаў надмагільных збудаванняў былі выяўлены і даследаваны З.А. Харытановіч на могілках каля в. Стары Лепель Лепельскага раёна [41, с. 300]. З.А. Харытанович было ўскрыта 7 пахаванняў, у т.л. 6 цэлых і адно парушанае. Пахаванні датуюцца XVI ст. [41, с. 300].

Такім чынам, пахавальныя помнікі у межах вывучаемага перыяду былі прадстаўлены некалькімі відамі. У якасці рэліктавай з’явы зафіксаваны адзінкавыя курганы з пахаваннямі XIII – XIV і нават другой паловы XVI ст. Але пануючым відам сталі жальнічныя пахаванні.



PolotsSU

Прыкладам пахавальнага комплекса, пераходнага ад курганнага да жальнічнага пахавання, з'яўляецца курган з элементамі каменнай надмагільнай абкладкі з могільніка каля в. Перавоз. У далейшым насып змяншаецца ці ўвогуле знікае, а каменная канструкцыя набывае від кладкі або абкладкі. На левабярэжжы Заходняй Дзвіны прасочваецца традыцыя працягу выкарыстання курганных могілак, так утвараюцца курганна-жальнічныя пахавальныя комплексы. На левабярэжжы Дзвіны знешнія асаблівасці пахавальных комплкесаў сведчаць аб няўнасці падабенства ў пахавальных традыцыях. Акрамя ўласна канструктыўнага падабенства каменных надмагілляў, назіраюцца такія характэрныя рысы, як агульная "сценка" абкладак у суседніх надмагіллях, арыентыроўка іх па лініі "ўсход – захад", размяшчэнне магіл шэрагамі з поўначы на поўдзень з невялікім змяшчэннем адносна адна другой і бакоў света. Жальнічныя пахаванні эвалюцыянуюць у бок змяншэння надмагільнай пабудовы да каменнага крыжа. Акрамя таго, прадстаўлены грунтовыя пахаванні без слядоў надмагільных канструкцый.

У межах вывучаемага перыяду XV–XVI стст. адзначаны паралельным існаваннем курганных, жальнічных і грунтовых пахаванняў. Агульныя рысы матэрыяльнай культуры сведчаць аб агульнасці або блізкасці пахавальных абрадаў. З іншага боку, суіснаванне некалькіх пахавальных традыцый указвае на незавершанасць працэсаў у звязаных з пахавальнымі абрадамі сферах матэрыяльнай і духоўнай культуры. XV – XVI стст. з'яўляюцца своеасаблівым пераломным пунктам, часам, калі адны пахавальныя традыцыі сышлі ў нябыт, іншыя замацаваліся і атрымалі развіццё. Суіснаванне розных відаў пахавальных комплексаў на адных і тых жа могільніках указвае на наяўнасць пераемнасці паміж старымі і новымі традыцыямі.

### 1.3 Картаграфаванне сельскіх могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

Беларускае Падзвінне (Паазер'е) – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі ў сярэднім і верхнім басейне Заходняй Дзвіны. На захад рэгіён распасціраецца да возера Нарач, на поўдні ўмоўная мяжа праходзіць па лясных масівах на поўнач ад Лагойска і Барысава і далей па водападзеле Заходняй Дзвіны і Дняпра [42, с. 372].

На поўначы, ўсходзе і часткова на захадзе мяжа Беларускага Падзвіння вызначаецца дакладна з прычынай супадзення з дзяржаўнай мяжой Рэспублікі Беларусь, чаго нельга сказаць аб паўднёвым рубяжы. Паўднёвая мяжа Беларускага Падзвіння павінна разглядацца хутчэй як буферная або кантактная зона, чым як лінія, што адпавядае вызначэнню рэгіёна як гісторыка-этнаграфічнага.

Пры картаграфаванні тэрыторыі Беларускага Падзвіння, з невялікімі ўдакладненнямі ў адпаведнасці з водападзелам Заходняй Дзвіны, за аснову была ўзята карта з кнігі В.С. Цітова «Этнаграфічная спадчына» [43, с. 56].

У Беларускае Падзвінне як гісторыка-этнаграфічны рэгіён, такім чынам, амаль цалкам уваходзіць Віцебская вобласць, за выключэннем паўднёва-заходняй часткі Пастаўскага, паўднёва-ўсходняй часткі Сенненскага раёнаў, Аршанскага, большай часткі Талачынскага і Дубровенскага раёнаў. Да рэгіёна адносяцца таксама ўсходняя частка Мядзельскага, паўночна-ўсходняя частка Вілейскага, поўнач Лагойскага, Барысаўскага і Крупскага раёнаў Мінскай вобласці.

Для археалогіі традыцыйным з'яўляецца вызначэнне арэалаў зыходзячы не столькі з гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, колькі з басейнаў рэк, з водападзелаў. З гэтага пункта арэал даследавання было б можна вызначыць як частку басейна Заходняй Дзвіны, што знаходзіцца ў межах Рэспублікі Беларусь. У гэтым выпадку арэал даследавання быў бы меншы, без уключэння тэрыторый Мядзельскага, Вілейскага, Лагойскага, Барысаўскага і Крупскага раёнаў. Распаўсюджванне арэала даследавання на гэтыя тэрыторыі, аднак, дазваляе параўнаць пахавальныя помнікі басейна Заходняй Дзвіны і паўночнай часткі



PolotskSU

PolotskSU

цэнтральнай Беларусі. Таму мы будзем зыходзіць з больш шырокага разумення тэрыторыі Беларускага Падзвіння, усведамляючы пераходны, памежны статус яго паўднёвай ускраіны.

Пры вывучэнні пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння трэба мець на ўвазе, што археалагічнымі раскопкамі, археалагічным назіраннем і археалагічнымі разведкамі з ускрыццём культурнага пласта было ахоплена 43 помнікі. Дваццаць з іх прыпадае на 2 населеных пункта – Віцебск і Полацк. Пры гэтым у межах даследуемага перыяда як колькасць сельскіх населеных пунктаў, так і колькасць сельскага насельніцтва значна перавышалі колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва. Улічваючы вялікі храналагічны дыяпазон (пяць стагоддзяў) і абшырны арэал даследавання, вынікі картаграфавання пры выкарыстанні толькі гэтых даных уяўляюцца больш чым сціплымі.

Колькасць вядомых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. можа быць пашырана за кошт аб’ектаў, якія маюць знешнія прыкметы пахаванняў разглядаемага перыяду. Прааналізаваўшы вынікі раскопак каменных могільнікаў на тэрыторыі Беларусі, А.В. Квяткоўская прыйшла да высновы, што форма і канструктыўныя асаблівасці каменнай намагільнай канструкцыі могуць дастаткова надзейна ўказваць на час, да якога адносіцца пахаванне. Напрыклад, каменная вымастка памерамі 2,8-3х1-1,4х0,2-0,35 м без вялікіх камянёў у галавах і нагах пахавання можа быць датавана перыядам не пазней за пачатак XIII ст. Надмагіллі з камянём вышынёй да 1 м у галавах, з выбітым на камяні крыжам або крыжападобным знакам датуюцца перыядам з сярэдзіны XVI – XVII ст. і пазней і г.д. [18, с. 161].

Не закранаючы пытання магчымасці вузкага датавання пахавальных помнікаў без раскопак па намагільных канструкцыях (вопыт уласных шурфовак на могільніках каля вв. Івесь і Доўгае Глыбоцкага, Бірулі Докшыцкага раёнаў і іншых сведчыць аб тым, што без зняцця дзёрану выяўленне намагільных канструкцый часта немагчыма), можна канстатаваць апраўданасць падыхода для выяўлення і вызначэння пахавальных помнікаў у межах храналагічнага дыяпазона XIV – XVIII стст. Так, Л.У. Дучыц і В.М. Ляўко у якасці маркераў пахаванняў XIV – XVIII стст. вылучаюць валунныя кладкі-вымасткі, каменныя абкладкі намагільнага насыпа па перыметры, вялікія валунныя камяні ў галавах або ў галавах і нагах пахавання, каменныя крыжы [1, с. 126, 136].

Безумоўна, варта ўлічваць, што дакладнае вызначэнне храналогіі пахаванняў магчыма толькі па выніках археалагічных раскопак, бо магілы з каменнымі крыжамі і абкладкамі могуць адносіцца і да XIX ст. Не выключана і «другаснае выкарыстанне» каменных крыжоў. Прымаючы да ўвагі, што на тэрыторыі Беларускага Падзвіння фіксуецца традыцыя працяглага выкарыстання могільнікаў і ў межах аднаго помніка часта сустракаюцца курганы і грунтовыя магілы з каменнымі вымасткамі, такое спалучэнне можна лічыць важкім аргументам на карысць выкарыстання могільніка ў XIV – XVIII стст. і наяўнасці на ім пахаванняў гэтага перыяду (гл. Дадатак А).

Пераважная большасць пахавальных помнікаў лакалізавана на левабярэжжы Заходняй Дзвіны (гл. мал. А.1) [44]. Можна казаць як мінімум аб двух адасобленых арэалах распаўсюджанасці пахавальных помнікаў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі. Першы размешчаны на правым беразе Дзвіны ў Гарадоцкім раёне. Другі – на тэрыторыі Глыбоцкага, паўднёвым захадзе Полацкага, Лепельскім, Докшыцкім раёнах. Найбольшая шчыльнасць пахавальных комплексаў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі назіраецца ў Глыбоцкім, на паўднёвым захадзе Полацкага і ў Лепельскім раёнах.

Заходні арэал распаўсюджання каменных надмагільных канструкцый на Беларускім Падзвінні мяжуе з рэгіёнам найбольшага пашырэння каменных магіл – Панямоннем. Можна казаць аб сувязі насельніцтва гэтых рэгіёнаў. Разам з тым, А.В. Квяткоўская ўказвае на наяўнасць адметнасцей у пахавальных традыцыях насельніцтва Панямоння і Падзвіння. Так, у Беларускім Падзвінні пахаванні збольшага безынвентарныя [18]. А.В. Квяткоўская кажа аб сувязі каменных надмагільных канструкцый з пахавальным абрадам балцкіх (яцвяжскіх) плямён. У такім разе, наяўнасць такой істотнай лакальнай асаблівасці павінна сведчыць або аб змешванні прыйшлага і аўтахтоннага насельніцтва (на гэта ўскосна ўказвае

PolotskSU

“левабярэжная” традыцыя наяўнасці на могілах курганоў побач з каменнымі магіламі), або аб моцным уплыве хрысціянскай рэлігіі на практыку ажыццяўлення пахавальнага абрада (праяўляецца ў безынвентарнасці) пры захаванні некаторых яго адметных рысаў (пабудова каменных надмагілляў). Улічваючы этнічныя і канфесійныя працэсы, можна казаць аб паступовай асіміляцыі балцкага насельніцтва славянскім пры захаванні адметных традыцый пахавальнага абрада, якія, у прынцыпе, не супярэчылі хрысціянскім дагматам і аб прыстасаванні гэтых традыцый да нормаў хрысціянства.

У гэтым кантэксце варта асабліва вылучыць пахавальныя комплексы з каменнымі крыжамі. Высокая канцэнтрацыя пахаванняў з каменнымі крыжамі назіраецца ў Глыбоцкім, паўднёвым захадзе Полацкага і ў Бешанковіцкім раёнах. Арэал іх распаўсюджанасці збольшага супадае з арэалам пашырэння іншых каменных намагільных канструкцый (гл. мал. А2–А3). Калі разглядаць каменныя крыжы як маркер больш позніх пахавальных помнікаў (у межах XIV – XVIII стст.), то супадзенне арэалаў распаўсюджвання пахаванняў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі і з каменнымі крыжамі можна разглядаць як прыкмету эвалюцыі ў вырабе надмагільных збудаванняў, пераемнасці у традыцыях стварэння надмагілляў.

## 2 ХАРАКТАРЫСТЫКА ПАХАВАЛЬНЫХ КОМПЛЕКСАЎ МОГІЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст. (ПА ВЫНІКАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 2013–2015 гг.)

### 2.1 Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на

Могільнік каля в. Івесь размешчаны на заходнім беразе воз. Івесь (Псуеўскі сельсавет Віцебскай вобласці) па дарозе з в. Івесь у в. Шо, паміж возерам і дарогай (гл. мал. Б1). Інфармацыя аб могільніку атрымана ў 2009 г. ад дацэнта ПДУ, к.г.н. Уладзіміра Аляксандравіча Лобача. У тым жа годзе на помніку намі была праведзена візуальная разведка. Была зафіксавана наяўнасць чатырох каменных крыжоў, неглыбокай ямы (верагодна, ад несанкцыянаваных раскопак).

Мясцовае насельніцтва называе магілы французскімі або аўстрыйскімі.

У 2010, 2011 і 2012 гг. на могільніку намі праводзіліся археалагічныя даследаванні. У 2013 г. на ўсходнім ускрайку могільніка на расчышчанай у 2010 г. пляцоўцы намі быў закладзены раскоп (гл. мал. Б2) першапачатковай плошчай 28 м$^2$, які прымыкаў з паўночнага боку да раскопа 2 2012 г. Паміж раскопам 2 2012 г. і раскопам 2013 г. засталася недаследаванай плошча 2 м$^2$, занятая дубам, высякаць які ўяўлялася немагчымым. На планах недаследаваны ўчастак у 2 м$^2$ пазначаны шэрым колерам. У працэсе раскопак былі выяўлены пахаванні, што выходзілі за межаў першапачатковага раскопа. Таму ў паўночна-заходнім куце была зроблена прырэзка плошчай 6 м$^2$. Агульная ўскрытая ў 2013 г. плошча склала такім чынам 36 м$^2$ (гл. мал. Б3)

Была працягнута нумарацыя квадратаў, пачатая ў 2010 г. У межах раскопа 2013 г. размяшчаліся квадраты А9, А10, Б9, Б10, А′10, А′11 цалкам, квадраты А8, А11, Б8, Б11, А′8, А′9 — часткова. Пахаванні нумараваліся з пазначэннем года (2013) ў парадку выяўлення ад 2013-1 да 2013-7. Усяго было выяўлена 7 пахаванняў.

Візуальны агляд і нівеліроўка дзённай паверхні раскопа выявілі нязначны перапад вышынь паміж паўночна-ўсходнім кутом раскопа і астатняй яго плошчай (розніца ў 0,2–0,3 м) (гл. мал. Б4)

Размяшчэнне камянёў надмагільных канструкцый у межах раскопа на ўзроўні дзённай паверхні дазваляла меркаваць наяўнасць там 4–5 пахаванняў, пры гэтым валунныя камяні

маглі разглядацца як маркеры галавы/ног пахавання (мал. Б5). На самой справе было выяўлена 7 пахаванняў.

На ўзроўні дзённай паверхні ў паўночна-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б10–Б11 знаходзілася 8 камянёў памерамі ад 0,1 да 0,6 м (мал. Б5). Камяні ўтваралі абкладку магілы па перыметры. Абкладка была арыентаваная па лініі «паўночны захад — паўднёвы ўсход». У пласце 1 (глыбіня 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) канструкцыя набылі якасна іншы выгляд і ўяўляла сабой суцэльную вымастку з 21 каменя памерамі 0,1–0,6 м (мал. Б6). У пл. 2 (0,4 м ад узроўня дзёнай паверхні) выявіліся яшчэ 8 камянёў памерамі 0,1–0,3 м (мал. Б7). У пл. 3 (0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) быў зафіксаваны ячшэ 1 камень (мал. Б8). У пл. 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася 18 камянёў памерамі 0,05–0,2 м (мал. Б9). Камяні ў пластах 2–4 размешчаны хаатычна і без камянёў на ўзроўні дзённай паверхні і ў пл. 1 не даюць уяўлення аб характары надмагільнай канструкцыі. Пад згаданымі камянямі было выяўлена пахаванне 2013-2.

У паўднёва-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б9–Б8 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 4 камяні памерамі 0,3–0,85 м. Самы вялікі камень маркіраваў галаву пахавання і меў высечаны з заходняга боку крыж. У пл. 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было, аднак у пл. 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася суцэльная вымастка з 28 камянёў памерамі 0,1–0,5 м, арыентаваную па лініі «паўночны захад — паўднёвы ўсход». У пл. 3 (0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) было выяўлена ячшэ 10 камянёў, у пл. 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) — 2 камяні памерамі ад 0,05 да 0,25 м. Каменная канструкцыя аналагічная папярэдняй. Пад ёй выяўлена пахаванне 2013-3.

У паўднёвай частцы раскопа ў квадратах А8–А9 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 4 камяні памерамі ад 0,2 да 0,85 м. У пл. 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было. У пл. 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) зафіксавана 4 каменя, у пл. 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) — 8 камянёў памерамі 0,1–0,3 м. Каменная канструкцыя можа быць вызначана як вымастка з вялікім камянём у нагах пахавання. Пад ёй выяўлена пахаванне 2013-4.

У паўночна-заходняй частцы раскопа ў квадратах А10, А11, А′10, А′11 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 7 камянёў памерамі 0,2–0,8 м. У пласце 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было. У пл. 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася вялікая колькасць камянёў памерамі 0,05–0,6 м, якія складалі суцэльную вымастку. Паколькі пад ёй было выяўлена 3 пахаванні: 2013-1, 2013-6 і 2013-7, — згаданая канструкцыя ўяўляла сабой вымасткі трох пахаванняў, дакладнае размежаванне якіх уяўляецца праблематычным.

У межах раскопа 2013 г. стратыграфія мела наступны выгляд. Пад слоем дзёрану на глыбіню 0,2–0,4 м ішоў пласт шэра-жоўтага, попелападобнага па структуры пяску, падзолу. Глыбей залягаў пласт жоўтага пяску магутнасцю 0,3–0,5 м. На глыбіні 0,5–0,8 м ад дзённай паверхні знаходзіўся слой мацерыковага шчыльнага пяску бледна-жоўтага колеру. Магільныя ямы былі запоўнены шэрым пяском. Стратыграфія раскопа 2013 г. суадносіцца са стратыграфіяй шурфоў 2010–2011 гг. і раскопаў 1–2 2012 г.

*Пахаванне 2013-1* (гл. мал. Б10) размяшчалася ў заходняй частцы раскопа ў квадраце А′11 на глыбіні 0,62 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны галавой на паўночны захад. Правая рука пакладзена на грудзі, левая — на жывот. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, узрост пахаванага складае 50 або болей гадоў, пол вызначыць не ўдалося з прычыны нездавальняючай захаванасці костных парэшткаў.[1]

*Пахаванне 2013-2* (мал. Б10) размяшчалася ў паўночна-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б10–Б11 на глыбіні 0,82 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Правая рука пакладзена на грудзі, левая — на

[1] Ва ўсіх выпадках антрапалагічная экспертыза праведзена кандыдатам біялагічных навук, дацэнтам В.А. Емяльянчык, за што прыносім ёй падзяку.



PolotskSU

жывот. Паводле даных антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце ад 50 гадоў.

*Пахаванне 2013-3* (мал. Б10) размяшчалася ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопа ў квадраце Б9 на глыбіні 0,7 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны на паўночны захад. Рукі складзены на тазавых костках, правая на левай. Па высновах антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце 20–25 гадоў.

*Пахаванне 2013-4* (мал. Б10) размяшчалася ў паўднёва-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′9 на глыбіні 0,69 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны на паўночны захад. Левая рука пакладзена на грудзі, правая знаходзіцца на тазавых костках. Паводле антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце ад 50 гадоў.

*Пахаванне 2013-5* (мал. Б10) размяшчалася ў паўночна-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′11 на глыбіні 0,56 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа. Па даных антрапалагічнай экспертызы, пахаванне з’яўляецца дзіцячым, узрост пахаванага — 4 гады. Пахаванне мае інвентар — завушніцы, — таму належыць дзяўчынцы.

*Пахаванне 2013-6* (мал. Б10) размяшчалася ў паўднёва-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′9 на глыбіні 0,58 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа, сам касцяк быў пашкоджаны каранямі дрэва. Паводле антрапалагічнай экспертызы, пахаваны меў узрост ад 50 гадоў. Пол вызначыць немагчыма з прычыны адсутнасці костных парэшткаў.

*Пахаванне 2013-7* (мал. Б10) размяшчалася ў заходняй частцы раскопа ў квадраце А′10 на глыбіні 0,48 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, пахаванне з’яўляецца дзіцячым, узрост пахаванага — 5 гадоў.

Звяртае ўвагу арыентыроўка пахаванняў 2013-1, 2013-3, 2013-4. Пахаванні маюць моцнае адхіленне на поўнач, асабліва ў выпадку пахаванняў 2013-1 і 2013-3, што фіксуецца на могільніку каля в. Івесь упершыню.

Масавыя знаходкі прадстаўлены асобнымі фрагментамі керамікі. Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены:

— двумя завушніцамі з дзіцячага пахавання 2013-5. Завушніцы зроблены з меднага або бронзавага дроту і маюць выгляд пытальніка. Адна завушніца мае пашкоджаную пятлю. Рэшткаў прывесак не выяўлена, хаця наяўнасць пятлі кажа аб іх іх магчымай першапачатковай прысутнасці. Датуюцца XV–XVI стст.

— цвікамі ад трун з пахаванняў 2013-1, 2013-2, 2013-3, 2013-4. Дакладная фіксацыя цвікоў дала магчымасць правесці рэканструкцыю трун пахаванняў (гл. Дадатак В, табліцы В1–В2).

У 2015 г. вывучэнне могільніка каля в. Івесь было працягнута. Быў закладзены раскоп у 35 кв. м, які з усходу прымыкаў да шурфа 2010 г. На ўзроўні дзённай паверхні былі зафіксаваны каменныя надмагіллі. Камяні былі ў асноўным сканцэнтраваныя на поўначы раскопа. Даследаванне пластоў 1–2 удакладніла форму каменных канструкцый. Яны ўяўлялі абкладкі магіл па перыметры, у т.л. з вялікімі камянямі ў галавах і нагах пахавання.

У ходзе раскопак было ўскрыта 5 пахаванняў, у т.л. 3 мужчын, 1 жанчыны і 1 дзіця. Былі выяўлены цвікі ад труны (п. 5), фрагменты керамікі X–XI стст. (ад суседніх пашкоджаных курганаў?) і вузкашчытковы пярсцёнак з металу жоўтага колеру, пакрытага нязначнай карозіяй зялёнага колеру (медны сплаў), датуемы XVIII–XIX стст (п. 5).

Пахаванне 2013-5 датуецца XV–XVI стст. Астатнія пахаванні можна таксама датаваць XV–XVI стст., улічваючы падабенства пахавальнага абраду. Такім чынам, у 2013 г. намі было працягнута вывучэнне могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. У ходзе раскопак выяўлена 7 пахаванняў, адно з якіх (2013-5) магчыма дакладна датаваць XV–XVI стст. (паводле завушніц). Пераважнай формай надмагільных канструкцый, даследаваных у 2013 г., з’яўляюцца суцэльныя вымасткі магіл з вялікімі валунамі ў галавах/нагах пахавання. На могільніку ўпершыню зафіксавана моцнае адхіленне пахаванняў



PolotsSU

PolotskSU

на поўнач ад заходняй арыентыроўкі. Завушніцы з’яўляюцца трэцяй ювелірнай знаходкай, выяўленай за 2010–2013 гг. у 23 даследаваных пахаваннях, пасля знойдзеных у 2011 г. тонкіх бляшак ад жаночага галаўнога ўбору, выкананых з сярэбранага сплаву ў тэхніцы ціснення і датуемых XII–XIII стст. і выяўленага ў 2012 г. вузкапласцінчатага пярсцёнка з двайным рыфленнем з меднага (бронзавага) сплаву, што датуецца XIV–XV стст. Знаходкі укладаюцца ў раней вызначаны дыяпазон XIV–XVI стст. і пацвярджаюць, што пераважная большасць пахаванняў узнікла ў XV–XVI стст. Знаходкі не даюць магчымасць звузіць перыяд функцыянавання могільніка, а, наадварот, пашыраюць яго, што пацвярджае ўстойлівасць пахавальных традыцый у вызначаны час.

## 2.2. Могільнік каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на

У ліпені — жніўні 2013 г. археалагічны атрад Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта праводзіў даследаванні на могільніку каля в. Жарнасекава Бачэйкаўскага сельсавета Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Мэтай даследаванняў было вывучэнне кургана з каменнымі надмагіллямі, што вызначаюцца як знешнія прыкметы пахаванняў XIV–XVIII стст. [1, с. 126, 136]. Могільнік размяшчаецца на правым беразе р. Ула на адлегласці 0,8 км на паўночны захад ад вёскі Жарнасекава (гл. мал. Б11) і ўключае курганную групу, грунтовыя магілы з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі і сучасныя дзеючыя могілкі. Курганная група ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці рэгіянальнага значэння. У 1995 г. у межах археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта могільнік абследаваў У.А. Лобач [30, с. 45]. На момант экспедыцыі з пяці курганоў непашкоджанымі сучаснымі пахаваннямі заставаліся два, адзін з якіх і быў даследаваны. На другім, суседнім кургане захаваўся стрыжань ад ахоўнага знака. Сам знак на момант правядзення даследаванняў адсутнічаў.

Курганная група размешчана на дзеючых могілках, на захад ад уваходу, сярод сучасных пахаванняў (гл. мал. Б12). Адлегласць ад уваходу да курганоў складае 22 м. Адлегласць паміж цэнтрамі даследаванага кургана і кургана, на якім быў усталяваны ахоўны знак, складае 12,5 м. Плошча паміж уваходам на могілкі і курганамі занятая сучаснымі і закінутымі грунтовымі пахаваннямі. Надмагільныя насыпы старых пахаванняў арыентаваныя па лініі «ўсход — захад» і размешчаны шэрагамі з поўначы на поўдзень. Ад увахода на могілкі да курганоў прасочваецца пяць шэрагаў пахаванняў, прычым шэрагі магіл сучаснага выгляду (у т.л. з агароджамі) чаргуюцца з закінутымі магіламі, зараслымі хмызняком. Некаторыя з іх пазначаны каменнымі канструкцыямі ў выглядзе абкладак і вялікіх камянёў з высечанымі крыжамі. З усходу на захад шэрагі пахаванняў змешчаны ў наступным парадку: сучасныя пахаванні; закінутыя магілы; сучасныя пахаванні з агароджамі; закінутыя магілы з каменнымі надмагіллямі, у т.л. камянямі з высечанымі крыжамі; сучасныя магілы.

Могілкі маюць значны перапад рэльефу (некалькі метраў). Адразу на захад ад курганоў пляцоўка паніжаецца. Далей на захад працягваюцца сучасныя могілкі. Сучасныя магілы размешчаны таксама на поўдзень і на поўнач ад курганоў.

Непасрэдна каля даследаванага кургана, з усходняга боку, па лініі «поўнач — поўдзень» знаходзяцца два масіўных каменных крыжа, адлегласць паміж якімі складае 8 м. Першы з іх размешчаны на адлегласці 7 м на ўсход ад даследаванага кургана, мае вышыню надземнай часткі 0,8 м і даўжыню перакладзіны 1,1 м. Крыж несіметрычны, паўднёвая частка перакладзіны большая за паўночную. Другі размешчаны на адлегласці 11 м на паўночны ўсход ад даследаванага кургана, мае вышыню надземнай часткі 0,65 м і даўжыню перакладзіны 1,2 м.

PolotskSU

У якасці рэпера выкарыстоўвалася прыступка помніка Дзятла Пятра Захаравіча. Помнік знаходзіцца на адлегласці 21 м на паўночны захад ад цэнтра даследаванага кургана. Нівеліровачная адзнака — 173. Пасля даследавання курганны насып быў адноўлены.

Даследаваны курган мае паўсферычную форму. Дыяметр кургана — 11 м, і вышыня — 1,33 м. На паверхні кургана меліся камяні надмагільных канструкцый. Курган раскопваўся шырокай плошчай па контуру насыпа. Па лініях «поўнач — поўдзень» і «ўсход — захад» былі пакінуты броўкі шырынёй 0,5 м.

Асобныя камяні фіксаваліся на ўзроўні дзённай паверхні, аднак дэталёва каменныя канструкцыі выявіліся пасля зняцця дзёрану. У паўночна-ўсходнім сектары, каля паўночнага краю насыпа, была зафіксавана канструкцыя ў выглядзе абкладкі магілы па перыметры. Канструкцыя была арыентавана па лініі «ўсход — захад» і складалася з 18 камянёў памерамі 0,2–0,3 м і двух камянёў большага памеру (0,4–0,6 м), якія размяшчаліся з усходняга і заходняга бакоў і маркіравалі галаву/ногі пахавання. Камень, які размяшчаўся з захаду, меў высечаны крыж з Т-падобным завяршэннем ўсіх перакладзін. Крыж быў высечаны з усходняга боку камяня (гл. мал. Б13–Б14).

У паўночна-ўсходнім сектары, на поўдзень ад згаданай абкладкі, размяшчалася яшчэ адна канструкцыя. Яна складалася з 14 камянёў, якія ўтваралі паўавал. З заходняга боку канструкцыі размяшчаўся камень з высечаным крыжам. Як і ў першым выпадку, крыж быў высечаны з усходняга боку і меў Т-падобнае завяршэнне перакладзін.

У паўднёва-ўсходнім сектары з паўночнага краю размяшчалася абкладка з 19 невялікіх камянёў (0,2–0,3 м) і 2-х камянёў большых памераў, адзін з якіх маркіраваў усход надмагілля, а другі размяшчаўся сярод невялікіх камянёў з паўночнага краю абкладкі. Апошні камень меў высечаны шасціканцовы крыж з роўнымі папярочнымі перакладзінамі. Камень быў знойдзены ў паваленым стане, аднак можна меркаваць, што крыж першапачаткова быў арыентаваны на ўсход. Абкладка можа суадносіцца з пахаваннямі 1, 2 або 3.

Чацвёртая канструкцыя фіксавалася ў паўднёва-ўсходнім і паўднёва-заходнім сектарах ля паўднёвай мяжы насыпу. Яна складалася з 7 невялікіх камянёў (0,1–0,2 м), што ўтваралі абкладку магілы з паўночнага краю і камяня з высечаным крыжам, які пазначаў усход магілы. Крыж быў высечаны з заходняга боку камяня.

Акрамя таго, у паўночна-ўсходнім і паўднёва-ўсходнім сектарах фіксаваліся камяні, якія складана аднесці да той або іншай надмагільнай канструкцыі.

У паўночна-заходнім сектары была зафіксавана канструкцыя-абкладка з 11 невялікіх камянёў памерамі каля 0,2. У паўднёва-заходнім сектары назіралася скапленне камянёў, якое нагадвала незамкнутыя з заходняга боку абкладкі двух магіл з агульнай сценкай.

Характар каменных канструкцый пад слоем дзёрану сведчыць аб тым, што даследаваны насып уяўляе сабой 1) курганны насып + 2) насыпы пазнейшых грунтовых пахаванняў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі, што прымыкаюць да кургана з поўначы і з поўдня. У выніку натуральнага разбурэння і ажыццяўлення ўпускных пахаванняў насыпы зліліся. Гэта пацвярджаецца стратыграфіяй. Курганны насып з жоўтага пяску абкружаны чорнай, насычанай арганікай глебай насыпаў грунтовых пахаванняў. Гэтыя грунтовыя пахаванні, што прымыкалі да кургана, не ўскрываліся.

Курганны насып складаўся з жоўтага пяску. У паўднёва-заходнім, паўднёва-ўсходнім і паўночна-ўсходнім сектарах кургана на глыбіні 0,8–1,0 м ад вяршыні кургана на ўзроўні гарызонта прасочвалася попельная праслойка шэрага колеру магутнасцю ад 0,1 да 0,2 м. Мацярык уяўляў светла-жоўты пясок.

Пры даследаванні кургана было выяўлена чатыры пахаванні, у т.л. адно асноўнае і тры ўпускных.

*Пахаванне 1* упускное, знаходзілася ў паўднёва-ўсходнім сектары на глыбіні 1,18 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Анатамічны парадак касцей часткова парушаны, чэрап знойдзены асобна ад астатняга касцяку ніжэй за яго. Шкілет захаваўся не цалкам, практычна цалкам адсутнічаюць косткі

PolotskSU

рук і грудной клеткі. Палажэнне рук прасачыць не ўдалося, аднак фрагменты костак пальцаў выяўлены на тазавых костках. У нагах пахавання выяўлена 5 цвікоў ад труны з валокнамі драўніны. Рэштак самой труны не знойдзена. Пахавальны інвентар адсутнічае. Згодна з высновамі антрапалагічнай экспертызы, фрагменты костак, выяўленых у пахаванні 1, належаць двум індывідам: мужчыне 30–40 гадоў і дзіцяці 5–6 гадоў. Наяўнасць двух касцякоў у пахаванні візуальна не прасочвалася (гл. мал. Б15).

*Пахаванне 2* упускное, знаходзілася ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана на глыбіні 0,67 м ад узроўня дзённай паверхні. Шкілет не захаваўся за выключэннем фрагмента чэрапа з фрагментамі папяровага галаўнога венчыка на ім. Выяўлены рэшткі труны. Цвікі не знойдзены. Труна арыентавана па лініі «ўсход — захад».

*Пахаванне 3* упускное, знаходзілася ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана на глыбіні 0,62 м ад узроўня дзённай паверхні. Пахаванне практычна не захавалася і было прадстаўлена асобнымі косткамі чэрапа і посткраніяльнага шкілету. Анатамічны парадак касцей парушаны. Рэшткі труны, пахавальны інвентар адсутнічалі. У адпаведнасці з данымі антрапалагічнай экспертызы, выяўленыя ў пахаванні 3 фрагменты костак належалі двум індывідам: даросламу чалавеку нявызначанага полу і дзіцяці 3–4 гадоў. Візуальна наяўнасць двух касцякоў у пахаванні не прасочвалася.

*Пахаванне 4* асноўнае, знаходзілася ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана на глыбіні 0,79 м ад вяршыні (нівеліровачная адзнака 103) (гл. мал. Б15-Б16). Касцяк быў змешчаны на гарызонце і арыентаваны галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўдня. Шкілет збольшага захаваўся. Левая рука была выцягнута ўздоўж цела, косткі правай рукі адсутнічалі. Рэшткі труны не выяўлены. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы пахаванне належала дзіцяці ва ўзросце 7 гадоў. Пахаванне мела інвентар. Злева ад чэрапа было выяўлена скроневае кальцо. У раёне грудной клеткі знойдзены пацеркі з сіняга празрыстага шкла (15 штук) і каменя (1 штука), а таксама драцяное палутараабаротнае кальцо (дэталь касцюма?). Злева ад тазавых костак выяўлены пярцёнак. Справа ад тазавых костак зафіксаваны фрагмент жалезнага нажа. Жаночыя ўпрыгожванні (пацеркі, пярсцёнак, скроневае кальцо) сведчаць аб тым, што гэта пахаванне дзяўчынкі.

Акрамя таго, у ходзе разбора насыпа былі выяўлены шматлікія асобныя косці і фрагменты касцей, у т.л. непасрэдна пад слоем дзёрану. Гэта сведчыць аб тым, што касцякі парушаліся пры ажыццяўленні пазнейшых упускных пахаванняў.

*Індывідуальныя знаходкі* прадстаўлены інвентаром пахаванняў 2 і 4 і цвікамі ад труны пахавання 1 (гл. Дадатак В, табл. В3).

Інвентар, выяўлены ў пахаванні 4, прадстаўлены:

— скроневым бранзалетападобным кальцом крывіцкага тыпу з завязанымі канцамі. Кальцо выраблена з дроту з меднага сплаву і мае пакрыццё з металу белага колеру. Дыяметр дроту (з пакрыццём) складае 1,1 мм. Выраб пашкоджаны і складаецца з трох фрагментаў. У выніку дэфармацыі скроневае кальцо атрымала форму, блізкую да эліпсападобнай, з вялікай воссю ў 38,5 мм;

— зоннымі пацеркамі з празрыстага шкла сіняга колеру (15 адзінак), вырабленымі ў тэхніцы кручэння, у т.л. 4-мя адначасткавымі, сямю двухчасткавымі, двумя трохчасткавымі (памерамі 4,1–5,3х14–15,9 мм), адной пяцічасткавай (памерамі 4,1х17,9 мм) і адной не да канца дэробленай або бракаванай шматчасткавай пацеркай (памерамі 3,2х10,3 мм);

— каменнай пацеркай чорнага колеру 6,5–8,1 мм;

— шчытковым пярсцёнкам з меднага сплаву з завязанымі канцамі. Дыяметр пярсцёнка складае 17 мм;

— дэталлю касцюма ў выглядзе палутараабаротнага кальца з дроту з меднага сплаву (№ 10). Дрот мае дыяметр 3 мм. Кальцо дэфармаванае і мае форму, блізкую да эліпсападобнай, з вялікай воссю ў 15 мм і малой воссю ў 11 мм;

— фрагментам тронка жалезнага нажа з рэшткамі драўніны. У раёне перахода тронка ў лязо на рэштках драўлянай рукаяткі захавалася кальцо з дроту з меднага сплава,

PolotskSU

абвітага вакол рукаяткі тры разы. Фрагмент нажа каразіраваны, лязо не захавалася. Даўжыня фрагмента — 41 мм.

Названы пахавальны інвентар дазваляе датаваць асноўнае пахаванне (№ 4) XI–XII стст.

Інвентар пахавання 2 прадстаўлены рэшткамі папяровага венчыка з імітацыяй галаўнога ўбору. Улічваючы факт захаванасці папяровага галаўнога венчыка на фрагменце лобнай косткі шкілету пры тым, што за выключэннем згаданай косткі касцяк не захаваўся, пахаванне 2 можна датаваць канцом XIX–пачаткам XX ст.

Цвікі ў магільнай яме пахавання 1 невялікія, 6–9 см у даўжыню, сведчаць аб наяўнасці труны.

*Масавыя знаходкі* прадстаўлены фрагментамі керамікі (сценак, венцаў і донцаў керамічнага начыння, агулам — 54 пазіцыі) (гл. Дадатак В, табл. В4). Асноўная маса керамічнага матэрыялу выяўлена ў паўднёва-ўсходнім і паўночна-ўсходнім сектарах кургана у дзёране і пад ім на глыбіні да 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні. Нязначная глыбіня залягання, пераважная канцэнтрацыя ў сектарах з каменнымі канструкцыямі, у т.л. у сектары з пахаваннямі, дазваляе інтэрпрэтаваць гэтыя фрагменты керамікі як памінальны інвентар. Сярод керамічнага матэрыялу, які дазваляе датаваць пахаванні, адзначым наступныя знаходкі:

— фрагменты сценак і донца керамічнага начыння, выяўленыя ў паўднёва-ўсходнім сектары ў дзёране. Маюць шурпатую, дрэнна загладжаную паверхню. Цеста дрэнна абпалена, з дамешкамі жарствы. Фрагменты керамікі могуць быць датаваны XVI–XVIII стст.;

— 2 фрагменты венца керамічнага начыння, выяўленыя ў паўднёва-ўсходнім сектары (№ 34). Маюць шурпатую, дрэнна загладжаную паверхню. Звонку маюцца сляды загладжвання і рэшткі белага пакрыцця (ангобу?) белага колеру. Цеста з дамешкамі буйной жарствы. Край венца няроўны, што робіць немагчымым правільную замалёўку. Фрагменты керамікі, магчыма, адносяцца да міскі або талеркі і могуць быць датаваны XVIII ст. Візуальнае падабенства са згаданымі знаходкамі маюць фрагменты венца (№ 33) і сценак (№№ 42,44) керамічнага начыння.

— 2 фрагменты венца керамічнага начыння (№ 12), выяўленыя ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана. Маюць гладкую, добра загладжаную паверхню. З унутранага боку венца глазуравана, з вонкавага — пакрыта па верху венца белым ангобам. Чарапок на зломе шчыльны, аднародны, добра абпалены. Паліва светла-карычневая, па краю венца — светла-шэрая. Фрагменты могуць быць датаваны XIX–XX стст. Візуальнае падабенства са згаданымі фрагментамі венца мае фрагмент сценкі керамічнага начыння (№ 11). Фрагменты керамікі могуць быць датаваны XIX–XX стст.;

— 4 фрагменты донца і сценкі керамічнага начыння, выяўленыя ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана ў дзёране (№ 6). Мае гладкую, добра загладжаную паверхню, глазураваную з унутранага боку. Чарапок на зломе шчыльны, аднародны, добра абпалены. Паліва цёмна-карычневага колеру на сценках і карычневая на донцы. Прасочваецца пераход паміж колерамі. Фрагменты керамікі адносяцца да XIX–XX стст. Візуальнае падабенства са згаданымі фрагментамі маюць фрагменты сценак керамічнага начыння (№№ 7–9, 13, 17–18)У паўночна-заходнім сектары на гарызонце выяўлены 2 фрагменты венцаў і 5 фрагментаў сценак ляпнога керамічнага гаршка (№№ 48–54). Паверхня загладжана неахайна, вельмі няроўная. Цеста дрэнна абпалена, з дамешкамі буйной жарствы. Фрагменты венцаў невялікія і маюць няроўны край, што робіць немагчымым іх правільную замалёўку. Даныя фрагменты керамікі аднычасовыя асноўнаму пахаваню (4) і могуць адносіцца да яго інвентару.

Такім чынам, даследаваны помнік уяўляе сабой складаны пахавальны комплекс, рэканструяваць працэс ўзнікнення якога можна наступным чынам:

1. першапачатковым з'яўляецца пахаванне 4 з інвентаром, характэрным для крывіцкіх пахавальных помнікаў XI–XII стст. Пахаванне курганнае, было ажыццёўлена на гарызонце;

2. у XVI–XVIII стст. былі ажыццёўлены ўпускныя пахаванні 1 і 3, якія парушылі першапачатковы курганны насып. Улічваючы парушаны анатамічны парадак касцякоў,

PolotskSU

наяўнасць у згаданых пахаваннях касцей двух людзей, факт наяўнасці фрагментаў шкілету пад слоем дзёрану, больш раннія ўпускныя пахаванні былі пашкоджаны пазнейшымі. Пахаванні пазначаюцца каменнымі абкладкамі. Фрагменты керамікі XVI–XVIII стст. з'яўляюцца рэшткамі памінальнага інвентару;

3. У XVIII–XIX стст. з поўначы і поўдня курганнага насыпу ажыццяўляюцца грунтовыя пахаванні, маркіраваныя каменнымі абкладкамі (якія не даследаваліся за выключэннем разбора прымыкаючых да кургана насыпаў і каменных абкладак). Фрагменты керамікі XVIII–XIX стст. з'яўляюцца рэшткамі памінальнага інвентару гэтых пахаванняў;

4. у XIX — пачатку XX ст. у насып кургана ажыццяўляецца пахаванне 2 (з папяровым галаўным венчыкам);

5. наяўнасць дзіцячых костак у пахаваннях дарослых, у т.л. мужчын, пры парушаным анатамічным парадку касцей сведчыць аб ажыццяўленні падпахавання дзяцей у існуючыя пахаванні, магчыма, да іх продкаў.

### 2.3 Могільнік каля в. Клешчыно Бешанковіцкага р-на

Даследаваны ў 2013 г. могільнік знаходзіцца на адлегласці 0,5 км на поўнач ад в. Клешчыно, паміж вёскай Клешчыно і аграгарадком Бачэйкава. Ён размешчаны на правым беразе ракі Ула, на поўдзень ад трасы Віцебск — Лепель (гл. мал. Б17). Могільнік быў выяўлены, абследаваны і апісаны ў 1995 г. кіраўніком археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, к.г.н., дацэнтам У.А. Лобачам [30, с. 45, 48].

Старыя, закінутыя пахаванні, маркіраваныя каменнымі надмагіллямі, размяшчаюцца на паўночна-заходняй ускраіне могільніка. Гэтая частка могільніка ўяўляе сабой схіл пагорка, што паніжаецца з захаду на ўсход. На поўдзень і ўсход ад старых пахаванняў знаходзяцца дзеючыя могілкі. Асобныя сучасныя магілы размешчаны таксама на поўнач і на захад ад старых. Старая частка могільніка зарасла хмызняком. Каб скласці ўяўленне аб характары каменных канструкцый, што былі схаваны хмызняком і прасочваліся толькі фрагментарна, на паўночна-заходняй ускраіне могільніка была расчышчана пляцоўка. На ўзроўні дзённай паверхні фіксаваліся камяні памерамі 0,3–0,6 м, якія пазначалі галаву або ногі пахаваных. Намі быў закладзены шурф 3х7 м, арыентаваны па баках свету. Памеры 3х7 м (а не 4х8 м) тлумачацца імкненнем пазбегнуць сітуацыі, калі ў шурф патрапіць частка пахавання, якое ў такім выпадку застанецца недаследаваным (рабіць прырэзку было немагчыма зыходзячы з абмежаванага часу экспедыцыі). Адлегласць ад рэпера да паўночна-заходняга, паўночна-ўсходняга, паўднёва-заходняга і паўднёва-ўсходняга кутоў шурфа складае 12,5, 19,2, 15 і 17,4 м адпаведна (гл. мал Б17). Нівеліровачная адзнака — 220. Пасля заканчэння раскопак шурф быў засыпаны, каменныя абкладкі — адноўлены.

Шурф быў разбіты на квадраты 2х2 м. З поўначы на поўдзень квадраты абазначаны літарамі кірылічнага алфавіту, з усходу на захад — пранумараваны арабскімі лічбамі. У межах шурфа, т.ч., цалкам апынуліся квадраты А1, А2, А3 і часткова — А4, Б1, Б2, Б3, Б4.

У межах шурфа на ўзроўні дзённай паверхні фіксавалася 5 камянёў (гл. мал. Б18).

У заходняй частцы шурфа ў квадраце А4 быў размешчаны камень памерам 0,8 м. У паўночна-заходняй чвэрці квадрата А3 мелася два камяні памерамі 0,4–0,6 м. На тым з іх, што знаходзіўся каля заходняга краю квадрата А3, з заходняга боку быў высечаны крыж. У паўночна-ўсходняй чвэрці квадрата А2 размяшчаўся камень памерам 0,4 м. У паўднёва-ўсходняй чвэрці квадрата Б2 ляжаў камень памерам 0,7 м. У паўднёва-ўсходняй частцы шурфа ў квадраце Б1 фіксаваўся надмагільны насып, які быў арыентаваны па лініі «захад — усход». Яшчэ адзін насып, квадратны па форме, фіксаваўся на мяжы квадратаў А2, А3, Б2, Б3 (гл. мал. Б19).

PolotskSU

Частка каменных канструкцый была схавана пад слоем дзёрану. У пласце 1 (глыбіня 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) ў паўночнай частцы квадрата А3 было выяўлена 7 камянёў памерамі 0,1–0,2 м (гл. мал. Б20). Камяні размяшчаліся ўздоўж лініі «паўночны захад — паўднёвы ўсход». У пласце 2 (глыбіня 0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) дэталёва выявілася каменная канструкцыя ў паўночнай частцы квадратаў А3 і А2, да якой адносіліся і папярэднія камяні (гл. мал. Б21). Канструкцыя ўяўляла сабой авальную абкладку магілы па перыметры, выкананую з невялікіх камянёў памерамі 0,1–0,2 м. У шурф патрапіла толькі паўднёвая частка абкладкі. Акрамя таго, у пласце 2 было выяўлена 3 невялікія камяні памерамі да 0,2 м у паўднёва-заходняй чвэрці квадрата А2, якія размяшчаліся па лініі «поўнач — поўдзень». У пласце 3 (глыбіня 0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) было выяўлена 2 камяні, адзін з якіх размяшчаўся ў заходняй частцы квадрата Б3 і меў памеры 0,2 м, а другі быў зафіксаваны на мяжы квадратаў Б2 і Б3 і меў памеры 0,2–0,3 м (гл. мал. Б22).

Стратыграфія шурфа мела наступны выгляд. Пад дзёранам знаходзіўся слой шэрага попелападобнага пяску, падзолу, магутнасцю 0,1–0,2 м. Пад ім ляжаў слой жоўтага пяску магутнасцю 0,6–0,8 м. На глыбіні 0,7–1,0 м ад узроўня дзённай паверхні размяшчаўся светла-жоўты мацерыковы пясок.

Пры даследаванні шурфа было выяўлена 5 пахаванняў. Антрапалагічная экспертыза астэалагічных і краніялагічных матэрыялаў праводзілася к.б.н., дацэнтам В.А. Емяльянчык.

*Пахаванне 1* знаходзілася ў паўднёва-ўсходняй частцы шурфа ў квадраце Б1 на глыбіні 0,9 м ад узроўня дзённай паверхні (гл. мал. Б23). На ўзроўні дзённай паверхні пахаванне было пазначана насыпам, прамавугольнай формы, арыентаваным па лініі «захад — усход». Каменных канструкцый ні на ўзроўні дзённай паверхні, ні пад слоем дзёрану не мелася.

Касцяк арыентаваны галавой на захад, верагодна, з адхіленнем да поўдня. Дакладна вызначыць арыентыроўку пахаванага немагчыма, паколькі шкілет захаваўся дрэнна. Выяўлены толькі асобныя косткі, анатамічны парадак якіх парушаны. Палажэнне рук устанавіць не ўдалося. У магільнай яме знойдзена 10 жалезных цвікоў ад труны, у т.л. з валокнамі драўніны, а таксама скаба. Акрамя таго, у пахаванні 1 знойдзена кераміка: фрагменты венца, донца і сценак начыння.

Згодна з высновамі антрапалагічнай экспертызы, фрагменты выўленых у пахаванні 1 костак належаць двум індывідам. Пол і ўзрост аднаго з іх устанавіць немагчыма з прычыны фрагментарнасці і пашкоджанасці костных парэшткаў, другі касцяк належыць дзіцяці ва ўзросце 1–1,5 гады. Наяўнасць двух касцякоў у пахаванні візуальна не прасочвалася.

*Пахаванне 2* размяшчалася ў паўднёвай частцы шурфа ў квадратах Б3 і А3 на глыбіні 1,12 м ад узроўня дзённай паверхні. На мяжы квадратаў А2, А3, Б2, Б3 меўся надмагільны насып квадратнай формы памерамі каля 1х1 м, які мог адносіцца як да пахавання 2, так і да пахавання 3. Пахаванне 2 не было маркіравана камянямі на ўзроўні дзённай паверхні, аднак у пласце 3 (глыбіня 0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) справа ад ног пахавання быў знойдзены камень памерам 0,2–0,3 м.

Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне костак ног не характэрнае: ногі сагнуты ў каленях, нібыта касцяк ляжаў на правым баку. Астатнія астатнія косткі шкілета сведчаць аб тым, што касцяк ляжаў на спіне. Палажэнне рук прасачыць не ўдалося з прычыны незахаванасці костак. На чэрапе захаваліся валасы і 3 фрагменты тканіны памерамі да 1 см$^2$. У магільнай яме было знойдзена 12 цвікоў ад труны. Паводле вынікаў антрапалагічнай экспертызы, выяўленыя ў пахаванні 2 косткі належалі двум індывідам, у т.л. жанчыне 30–50 гадоў і дзіцяці. Наяўнасць двух касцякоў у пахаванні візуальна не прасочвалася.

*Пахаванне 3* размяшчалася ў паўднёвай частцы шурфа ў квадратах Б2 і А2 на глыбіні 1,6 м ад узроўня дзённай паверхні. На ўзроўні дзённай паверхні, каля галавы пахавання, пачынаўся згаданы ў апісанні пахавання 2 насып квадратнай формы. На ўзроўні дзённай паверхні у нагах пахавання 3 меўся валун памерам 0,7 м, які мог адносіцца і да пахавання 4. У пласце 2 (глыбіня 0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) злева ад галавы пахавання

PolotskSU

знаходзаліся 3 камяні, размешчаных па лініі «поўнач — поўдзень». Яны маглі быць рэштакамі парушанага надмагілля пахавання 3.

Шкілет арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Левая рука ляжала на жываце, палажэнне правай устанавіць не ўдалося з прычыны незахаванасці адпаведных костак. У магільнай яме знойдзена 14 цвікоў ад труны. Па выніках антрапалагічнай экспертызы, выяўленыя ў пахаванні 3 косткі належалі двум індывідам: жанчыне ва ўзросце 50 гадоў або старэй і дзіцяці. Наяўнасць двух касцякоў у пахаванні візуальна не прасочвалася.

*Пахаванне 4* размяшчалася ў паўднёвай частцы шурфа ў квадратах Б1 і Б2 на глыбіні 1,36 м ад узроўня дзённай паверхні. На ўзроўні дзённай паверхні ў галавах пахавання знаходзіўся валун памерам 0,7 м, які мог адносіцца і да надмагілля пахавання 3.

Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Левая рука знаходзілася на тазавых костках, правая — на грудзях. У магільнай яме быў знойдзены 31 цвік ад труны. Паводле антрапалагічнай экспертызы, выяўленыя ў пахаванні 4 косткі належалі двум індывідам: жанчыне ва ўзросце ад 50 гадоў і дзіцяці ва ўзросце да 3–4 гадоў. Наяўнасць двух касцякоў у пахаванні візуальна не прасочвалася.

*Пахаванне 5* размяшчалася ў паўночнай частцы шурфа ў квадратах А2 і А3 на глыбіні 1,17 м ад узроўня дзённай паверхні. На ўзроўні дзённай паверхні у галавах і ў нагах пахавання знаходзіліся камяні памерамі 0,6 і 0,4 м адпаведна. Акрамя таго, на адлегласці 1 м на паўднёвы захад ад галавы пахавання знаходзіўся яшчэ адзін валунны камень памерамі 0,6 м, на якім з заходняга боку быў высечаны крыж. Каменная канструкцыя працягвалася ў пласце 1 (глыбіня 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні), дзе на паўднёвы захад ад галавы пахавання было зафіксавана 7 камянёў памерамі 0,1–0,2 м, размешчаных па лініі «паўночны захад — паўднёвы ўсход». У пласце 2 (глыбіня 0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) была абкладка з 26 камянёў памерамі 0,1–0,2 м, якая мела форму авальнай абкладкі магілы па перыметры.

Шкілет арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўдня. Рукі складзены на жываце, правая на левай. Рэшткі труны адсутнічалі. Па высновах антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належала жанчыне ва ўзросце 30–40 гадоў.

Знаходкі (гл. Дадатак В, табл. В5)**.** Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены:

— фрагментамі крэменя, выяўленымі ў пл. 2 кв. А2;

— фрагментам рога, выяўленым у кв. Б1, пл. 2;

— жалезным нявызначаным прадметам, выяўленым у кв. Б1, пл. 2;

— жалезнымі цвікамі ад трун пахаванняў 1–4. Цвікі ў большасці каваныя, з масіўнай шляпкай. У пахаванні 4 разам з масіўнымі каванымі цвікамі выяўлены цвікі, блізкія да сучасных, што тлумачыцца наяўнасцю падпахаванага ў больш позні час касцяка;

— фрагментамі тканіны з пахавання 2.

Названыя знаходкі не даюць магчымасці датаваць даследаваныя пахаванні.

Масавыя знаходкі прадстаўлены фрагментамі сценак, донцаў, венцаў керамічных гаршкоў (агулам — 158 пазіцый) (гл. Дадатак В, табл. В6). Выяўленая кераміка падзяляецца на дзве групы. Кераміка першай групы мае шурпатую, дрэнна загладжаную паверхню. Цеста неаднароднае, з дамешкамі буйной жарствы. Асаблівую каштоўнасць для датавання ўяўляюць фрагменты венцаў керамічнага начыння, адно з якіх выяўлена ў пахаванні 1 і можа быць датавана XVII–XVIII стст., а другое знойдзена ў кв. А1, пл. 2 і датуецца XVI–XVII стст.

Кераміка другой групы выразна адрозніваецца меншай таўшчынёй сценак, добрым абпалам, шчыльным, аднародным на зломе чарапком, гладкай, добра загладжанай паверхняй, а таксама наяўнасцю палівы (не заўсёды), што дазваляе датаваць яе XVIII — пачаткам XX ст. Сярод керамічнага начыння гэтай групы вылучаюцца фрагменты донца керамічнай талеркі, выяўленыя ў кв. Б3, пл. 2. Унутраная паверхня талеркі глазураваная, колер палівы — цёмна-карычневы і жоўты. У кв. А2, пл. 1 выяўлены фрагменты керамічнага начыння, на якіх з унутранага і вонкавага бакоў маюцца сляды пакрыцця белага колеру (ангоб), з вонкавага — таксама сляды ўзору з палівы зялёнага колеру.

Нязначная глыбіня залягання керамікі дазваляе інтэрпрэтаваць яе ў якасці памінальнага інвентару. Вялікая колькасць фрагментаў і шырокі храналагічны дыяпазон сведчыць аб працяглым перыядзе функцыянавання даследаванай часткі могільніка.

Такім чынам, у працэсе археалагічнага вывучэння могільніка каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна быў закладзены шурф плошчай 21 $м^2$. У межах шурфа знаходзілася 5 пахавальных комплексаў, якія ўтрымлівалі шкілеты 9 пахаваных. Пахаванні 1–4 утрымліваюць косці дарослых (выключна жанчын сталага ўзросту: старэй за 50 гадоў — у пахаваннях 3–4, 30–50 гадоў — у пахаванні 1) і дзяцей. Гэта ўказвае на ажыццяўленне падпахаванняў дзяцей у існуючыя магілы, дзе былі пахаваны сталыя жанчыны. Падобная з'ява выяўлена таксама ў пахаваннях на могільніку Жарнасекава Бешанковіцкага раёна. Можна выказаць меркаванне аб наяўнасці лакальнай традыцыі ажыццяўлення падпахавання памерлых дзяцей у магілы продкаў.

Пахаванні дзяцей не траплялі ў свабодную прастору паміж існуючымі магіламі, а ажыццяўляліся менавіта як падпахаванні. Гэта сведчыць аб тым, што магілы пазначаліся на ўзроўні дзённай паверхні. У ролі маркераў выступалі каменныя надмагіллі, земляныя насыпы і, магчыма, драўляныя крыжы. Каменныя канструкцыі нескладаныя, уяўляюць сабой абкладку магілы па перыметры невялікімі камянямі з валуннымі камянямі ў галавах/нагах (пахаванне 5), валуны ў галавах/нагах пахавання (пахаванні 4, і, магчыма, 3), земляны надмагільны насып (пахаваннем 1).

Значная колькасць фрагментаў керамічнага начыння, якія інтэрпрэтуюцца як памінальны інвентар, сведчыць аб працяглым ажыццяўленні памінальнага рытуалу. Гэта ўказвае на тое, што ўшаноўванне памяці пахаваных тут адбывалася працяглы час. Выяўленая практыка падпахаванняў можа вытлумачыць гэта неаднаразовай актуалізацыяй ужо існуючых пахаванняў пры падпахаванні дзяцей.

## 2.4 Могільнік каля в. Мураўшчына Полацкага р-на

Могільнік размешчаны на адлегласці каля 0,3 км на паўночны ўсход ад в. Мураўшчына Полацкага р-на (гл. мал. Б24). Інфармацыя аб ім атрымана ў 2008 г. ад прарэктара па вучэбнай рабоце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, д.г.н. Дзяніса Уладзіміравіча Дука. Могільнік дзеючы, размяшчаецца на пагорку, выцягнутым з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. У паўночна-ўсходняй частцы могільніка сярод сучасных магіл з агароджамі знаходзіцца каменны крыж з кірылічным надпісам. Надпіс знаходзіцца з таго боку крыжа, які арыентаваны на паўднёвы захад. Каменны крыж быў выяўлены і апісаны ў 1996 г. к.г.н., навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі Маратам Васільевічам Клімавым [20, с. 13].

У верасні 2013 г. у паўночна-ўсходняй частцы могілак намі быў закладзены шурф плошчай 12 $м^2$, арыентаваны па баках свету. У якасці рэпера выкарыстоўвалася прыступка помніка з надпісам «Колесан Александр Олегович. 5.04.1995–19.03.1997». Помнік размешчаны на паўднёвы ўсход ад шурфа. Адлегласць ад рэпера да паўднёва-заходняга, паўночна-заходняга, паўночна-ўсходняга і паўднёва-ўсходняга кутоў шурфа складае 8,3 м, 12,3 м, 13 м, 9,3 м адпаведна. Нівеліровачная адзнака — 89.

*Апісанне шурфа.* Шурф быў разбіты на квадраты 2х2 м, якія нумараваліся арабскімі лічбамі з усходу на захад і пазначаліся літарамі з поўдня на поўнач (мал. Б25). Такім чынам, у межах шурфа меліся квадраты А1, Б1 цалкам і А2, Б2 часткова (гл. мал. Б26).

На ўзроўні дзённай паверхні акрамя крыжа з надпісам, які меў памеры надземнай часткі 0,85 м (у вышыню) х 0,9 м (даўжыня перакладзіны) і размяшчаўся ў квадратах А1–Б1, мелася яшчэ 6 надмагільных камянёў памерамі ад 0,15 да 0,5 м. Камяні не складалі выразнай канструкцыі і размяшчаліся ў квадратах А1 і Б1 (гл. мал. Б27).



PolotsSU

PolotskSU

У пласце 1 на глыбіні 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні выявіліся фрагменты двух каменных канструкцый. У кв. Б1 канструкцыя складалася з 16 камянёў памерамі 0,1–0,4 м. У кв. А1–А2 канструкцыя складалася з 13 камянёў памерамі 0,15–0,4 м. Да гэтай канструкцыі адносіўся і апісаны каменны крыж. Першая канструкцыя ўяўляе пераход ад вымасткі магілы да абкладкі яе па перыметры, другая — з’яўляецца абкладкай магілы па перыметры (гл. мал. Б28).

На глыбіні 0,25–0,3 м ад узроўня дзённай паверхні на ўсёй плошчы шурфа выявіўся пласт шчыльнай светла-шэрай гліны, якая запаволіла шурфоўку.

У кв. Б1 былі выяўлены фрагменты касцяка дзіцячага пахавання 1 (гл. мал. Б29). Пахаванне безынвентарнае. Выяўлены цвік ад труны (гл. Дадатак В, табл. В7).

У кв. А2 у працэсе вымання каменнага крыжа была выяўлена сцёгнавая костка пахавання 2 (якое і было маркіравана каменным крыжам).

Улічваючы лімітаваны тэрмін шурфоўкі (1 дзень), наяўнасць шчыльнага пласта гліны і заканчэнне рабочага дня, было прынята рашэнне закансерваваць шурф і працягнуць даследаванні ў наступным годзе.

Такім чынам, папярэдняя шурфоўка на могільніку каля в. Мураўшчына Полацкага р-на выявіла пад слоем дзёрану дзве каменныя канструкцыі, што маркіравалі пахаванні. Пахаванні знаходзіліся ў пласце шчыльнай гліны, што дастаткова рэдка сустракаецца на пахавальных помніках. Рэчавага матэрыялу, які дазваляў бы дакладна датаваць пахаванні, выяўлена не было, за выключэннем керамічнага матэрыяла. Аднак, магчыма зрабіць палеаграфічны аналіз надпіса на крыжы. Мяркуецца працягнуць археалагічнае даследаванне могільніка.

## 2.5 Могільнік каля в. Дубраўка Гарадоцкага р-на

У чэрвені — ліпені 2014 г. атрадам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў межах работы Пастаяннай экспедыцыі па вывучэнню Полацкай зямлі (навуковы кіраўнік — загадчык Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, д.г.н., прафесар В.М. Ляўко) праводзіліся археалагічныя даследаванні ў Гарадоцкім раёне. Іх мэтай было вывучэнне познесярэднявечных могільнікаў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі каля вв. Аўдзейкава і Дубраўка [47; 26]. У ходзе абследавання тэрыторыі было ўстаноўлена, што апісаныя ў розных крыніцах могільнікі з’яўляюцца адным аб’ектам, прывязаным да розных населеных пунктаў. У далейшым мы выкарыстоўваем прывязку да в. Дубраўка.

Могільнік каля в. Дубраўка знаходзіцца прыблізна ў 2 км на захад ад вёскі і прыблізна ў 2 км на ўсход ад в. Аўдзейкава (гл. мал. Б31). Ён складаецца з дзеючых могілак і закінутай часткі. На дзеючых могілках маюцца старыя магілы з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі: каменнымі крыжамі, плітами з высечанымі крыжамі, абкладкамі магільных насыпаў па перыметры. На закінутай частцы могільніка месцяцца курганы, грунтовыя пахаванні з каменнымі крыжамі. Гэтая частка могільніка пашкоджана аплыўшымі і зарослымі дзёранам і хмызняком ямамі і траншэямі (магчыма, ваеннага часу). І на дзеючай, і на закінутай частцы могільніка маюцца ахоўныя дошкі (на закінутай — дзве: часоў БССР і сучасная).

На закінутай частцы могільніка, на паўночны ўсход ад ахоўных дошак, намі быў закладзены шурф плошчай 16 м$^2$, арыентаваны па баках свету (гл. мал. Б32). Шурф меў Г-падобную форму, якая дазваляла даследаваць два пахаванні, пазначаных каменнымі крыжамі. Адзін каменны крыж размяшчаўся ў кв. 1 каля паўднёва-заходняга кута. З усходняга боку да яго прымыкаў надмагільны насып падпрамавугольнай формы, выцягнуты на захад. На ўсходзе ад каменнага крыжа ў насыпе меўся камень. Другі каменны крыж

PolotskSU

знаходзіўся ў квадраце 3 ў яго паўночна-ўсходняй чвэрці. Іншыя надмагільныя канструкцыі на ўзроўні дзённай паверхні адсутнічалі (гл. мал. Б33–34).

Зняцце слою дзёрана і разбор пласта 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) выявіў каменныя канструкцыі на ўсёй плошчы раскопа. Пераважна яны ўяўлялі сабой незамкнутыя абкладкі, арыентаваныя па лініі «паўночны ўсход — паўднёвы захад». У квадраце 3 (заходняя палова) размяшчэнне камянёў было хаатычным. У квадраце 1 абкладка ўтрымлівала вялікія валунныя камяні (да 0,8 м), аднак, у асноўным камяні мелі памеры 0,1–0,3 м (гл. мал. Б35).

Камяні былі выяўлены і ў пласце 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні). Канструкцыі пласта 2 з’яўляліся працягам выяўленых раней. Асобныя камяні (4 штукі) былі выяўлены таксама ў пласце 3 (0,6 м ад узроўня дзённай паверхні). Яны знаходзіліся ў квадратах 2–4 (гл. мал. Б36–37).

Шурф утрымліваў 15 пахаванняў, якія размяшчаліся ў двух умоўных ярусах. Першы ярус утрымліваў 6 пахаванняў (пахаванні 2–5, 7, 9) (гл. мал. Б38–39).

*Пахаванне 2* размяшчалася ў квадраце 1 на глыбіні 0,73 м ад узроўня дзённай паверхні. Анатамічны парадак касцей парушаны, чэрап знойдзены ў перагорнутым па вертыкальнай асі выглядзе. Шкілет арыентаваны налавой на паўднёвы захад. Палажэнне рук прасачыць не ўдалося з прычыны незахаванасці костак. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, выяўленныя костныя парэшткі належалі жанчыне ва ўзросце 20–30 гадоў.

*Пахаванне 3* выяўлена ў паўднёва-ўсходняй чвэрці квадрата 1 і прадстаўлена фрагментамі костак чэрапа, выяўленых на глыбіні 0,13 м. Па выніках антрапалагічнай экспертызы, косткі належалі чалавеку ва ўзросце ад 20 гадоў. Палавая прыналежнасць не ўстаноўлена. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 4* знаходзілася ў паўднёва-ўсходняй чвэрці квадрата 2 на глыбіні 0,6 м ад узроўня дзённай паверхні. Анатамічны парадак касцей быў парушаны. Мяркуючы па размяшчэнню чэрапа і сцёгнавых костак, шкілет быў арыентаваны галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўдня. Палажэнне рук устанавіць не ўдалося. Паводле антрапалагічнай экспертызы, косткі належалі мужчыне ва ўзросце 40–50 гадоў. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 5* выяўлена ў квадратах 3–4 на глыбіні 0,56 м ад узроўня дзённай паверхні. Косткі захаваліся не ўсе, чэрап адсутнічаў. Анатамічны парадак костак быў парушаны. Па выніках антрапалагічнай экспертызы, пахаванне ўтрымлівала косткі двух асобін: жанчыны ва ўзросце ад 20 гадоў і дзіцяці ва ўзросце 7 гадоў. Візуальна наяўнасць двух касцякоў не прасочвалася. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 7* выяўлена ў паўночна-заходняй чвэрці квадрата 3 і прадстаўлена фрагментам плечавой косткі, выяўленай на глыбіні 0,75 м ад узроўня дзённай паверхні. Паводле антрапалагічнай экспертызы, фрагмент належаў індывіду ва ўзросце ад 20 гадоў. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 9* выяўлена ў квадраце 2 на глыбіні 0,77 м ад узроўня дзённай паверхні і ўяўляла сабой скапленне костак з парушаным анатамічным парадкам. Косці знаходзіліся ў дрэнным стане. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, у пахаванні прысутнічалі косткі двух дзяцей: 4–5 і 8–9 гадоў. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 13* выяўлена ў квадраце 4 на глыбіні 0,6 м ад узроўня дзённай паверхні і ўяўляла сабой асобныя косткі. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, пахаванне ўтрымлівала фрагменты шкілетаў двух індывідаў: дарослага ва ўзросце ад 20 гадоў і дзіцяці ва ўзросце менш за 1 год. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

Другі гарызонт утрымліваў пахаванні 1, 6, 8, 10–12, 14–15 (гл. мал. Б40).

*Пахаванне 1* знаходзілася ў квадраце 1 на глыбіні 0,96 м ад узроўня дзённай паверхні. Пахаванне мела надмагільную каменную канструкцыю, у асноўным схаваную пад слоем дзёрану. Надмагілле ўяўляла сабой абкладку магілы па перыметры з каменным крыжам у галавах і двумя вялікімі камянямі справа і злева ад грудзей. Над левай галёначнай косткай

знаходзіўся вялікі камень. У астатнім канструкцыя складалася з невялікіх камянёў памерамі каля 0,2 м. Шкілет арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўдня. Палажэнне рук устанавіць не ўдалося з прычыны незахаванасці касцей. Паводле антрапалагічнай экспертызы, шкілет належаў жанчыне ва ўзросце 40–50 гадоў.

Пахаванне мела інвентар, прадстаўлены выраблена з меднага сплаву драцяной засцёжкай, выяўленай у раёне грудзей. Злева ад чэрапа быў выяўлены фрагмент сценкі керамічнага гаршка. Вышэй за косткі ног пахавання 1 на глыбіні 0,6 м ад узроўня дзённай паверхні быў знойдзены фрагмент жалезнага начыння (чугунка).

*Пахаванне 6* знаходзілася паўднёва-ўсходняй чвэрці квадрата 2 і трапіла ў шурф часткова. Косткі ног выходзілі за межы шурфа. Глыбіня шкілета — 0,89 м ад узроўня дзённай паверхні. Пахаванне мела схаваную пад дзёранам надмагільную канструкцыю ў выглядзе незамкнутай абкладкі па перыметры (справа). Можна меркаваць, што канструкцыя была парушана пры ажыццяўленні пахаванняў першага гарызонта. Касцяк арыентаваны галавой строга на захад. Правая рука пакладзена на грудзі, да левага плечавога сустава, левая рука сагнутая да лакця правай рукі. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, шкілет належыць жанчыне ва ўзросце 40–50 гадоў. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 8* знаходзілася ў квадратах 3–4 на глыбіні 0,92 м ад узроўня дзённай паверхні. Пахаванне мела схаваную пад дзёранам каменную канструкцыю ў выглядзе фрагментаў абкладкі магілы па перыметры. Каля ног злева і каля галавы справа мелася адпаведна 3 і 4 камяня. Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўдня. Левая рука была пакладзена на грудзі, косці правай не захаваліся. Паводле антрапалагічнай экспертызы, пахаванне ўтрымлівала фрагменты шкілетаў трох індывідаў: жанчыны ва ўзросце ад 50 гадоў, дзіцяці невядомага ўзросту, дзіцяці ва ўзросце менш за 1 год. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 10* знаходзілася ў квадраце 2 на глыбіні 1,0 м ад узроўня дзённай паверхні. Пахаванне мела рэшткі надмагільнай канструкцыі, схаванай пад слоем дзёрану, у выглядзе частковай абкладкі магілы па перыметры. Шкілет арыентаваны галавой на паўднёвы захад. Рукі складзены на тазавых костках. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, пахаванне ўтрымлівала косткі двух дзяцей: 4–5 і 6–7 гадоў. Пахавальны інвентар адсутнічаў, аднак, у запаўненні магільнай ямы знойдзены цвікі ад труны.

*Пахаванне 11* знаходзілася ў квадраце 2 на глыбіні 1,02 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк знаходзіўся ў шурфе не цалкам. Частка шкілета, за выключэннем тазавых костак і костак рук, размяшчалася па-за межамі шурфа. Паводле наяўных костак, шкілет быў арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да паўднёвага боку. Рукі складзены на жываце, правая паверх левай. Паводле антрапалагічнай эксперты, пахаванне ўтрымлівае косці двух індывідаў: мужчыны ва ўзросце ад 20 гадоў, а таксама дзіцяці невядомага ўзросту. У пахаванні выяўлены 3 невялікія фрагменты тканіны.

*Пахаванне 12* выяўлена ў квадраце 2 на глыбіні 0,95 м ад узроўня дзённай паверхні. Задзярнованая надмагільная канструкцыя ўяўляла фрагменты абкладкі магілы па перыметры з левага боку. У межах шурфа знаходзіўся не ўвесь шкілет. Галёначныя косткі выходзілі за межы шурфа. Касцяк арыентаваны галавой на захад з нязначным адхіленнем да паўднёвага боку. Рукі складзены на жываце, левая на правай. Паводле антрапалагічнай экспертызы, пахаванне ўтрымлівала косткі трох людзей: жанчыны ва ўзросце 20–25 гадоў і двух дзяцей ва ўзросце менш, чым 1 год. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 14* выяўлена ў квадраце 1 на глыбіні 0,93 м. У межах шурфа часткова трапіў чэрап, які быў вынуты са сценкі ў канцы раскопак. Чэрап быў на баку, што ўказвае на парушаны анатамічны парадак касцей (падобныя з'явы выяўлены ў пахаваннях, даследаваных у шурфе). Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, чэрап належаў жанчыне ва ўзросце 40–50 гадоў. Пахавальны інвентар, рэшткі труны адсутнічалі.

*Пахаванне 15* выяўлена ў квадраце 4 на глыбіні 1,05 м ад узроўня днённай паверхні. Касцяк трапіў у шурф не цалкам. Сцёгнавыя косткі часткова знаходзіліся ва ўсходняй сценцы шурфа. Пахаванне мела задзярнованую надмагільную канструкцыю ў выглядзе



PolotskSU

PolotskSU

фрагментаў абкладкі магілы па перыметры (захавалася ў выглядзе асобных камянёў зверху, злева і справа). Шкілет арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўдня. Рукі складзены на жываце, правая на левай. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, шкілет належаў мужчыне ва ўзросце 20–40 гадоў.

Пахаванне мела інвентар. У раёне грудной клеткі быў выяўлены крыжык з металу белага колеру з выявай крыжа на ім і драцяная засцёжка з меднага сплаву. Справа ад чэрапа знойдзены фрагмент керамікі. Таксама выяўлены цвікі ад труны (гл. Дадатак В, табл. В8).

Рэчавыя знаходкі, акрамя двух узгаданых засцёжак і крыжыка, прадстаўлены шматлікімі фрагментамі керамікі (144 фрагмента) (гл. Дадатак В, табл. В9). За выключэннем чарапкоў, знойдзеных у пахаваннях 1 і 15, усе астатнія фрагменты керамікі выяўлены ў пласце 1. У квадраце 1 было знойдзена 49 фрагментаў, у квадраце 2 — 6, у квадраце 3 — 77, у квадраце 4 — 7 фрагментаў. Глыбіня залягання дазваляе інтэрпрэтаваць фрагменты керамікі як памінальны інвентар. Цікавай з'яўляецца вялікая канцэнтрацыя керамікі ў квадраце 3, у якім знаходзілася 1 пахаванне цалкам (фрагменты касцей) і 2 пахаванні — часткова. Улічваючы значную колькасць камянёў, можна меркаваць, што ў гэтым квадраце былі ажыццёўлены дзіцячыя пахаванні, якія не захаваліся. Гэтым тлумачыцца вялікая колькасць выяўленай керамікі. Кераміка падзяляецца на дзве групы. Да адной адносіцца кераміка з няроўнай, дрэнна загладжанай паверхняй, у цесце якой прысутнічае жарства. Кераміка другой групы мае гладку, добра загладжаную паверхню, часам глазураваную. Абпал раўнамерны, цеста на зломе аднароднае. Кераміка можа быць датавана XVIII ст. і XVIII–XIX стст.

Важнай датуючай знаходкай з'яўляецца выяўленая ў дзёране на адлегласці 3,1 м на поўдзень ад шурфа манета — 5 капеек Расійскай імперыі 1776 г.

Адметнасцю даследаваных пахаванняў з'яўляюцца прапласткі гумусіраванага пяска з залой і ўкрапленнямі вугалькоў, якія чытаюцца на прафілях шурфа. Гэта сведчыць аб наяўнасці традыцыі развядзення вогнішча на магіле — памінальнага абрада, вядомага як звычай «грэць ногі нябожчыку». Падобная з'ява зафіксавана на могільніку Туржэц-2.

Такім чынам, у ходзе археалагічнага вывучэння могільніка каля в. Дубраўка Гарадоцкага раёна ў 2013 г. было даследавана 15 пахавальных комплексаў, што ўтрымлівалі рэшткі не менш як 24 чалавек, сярод якіх 11 дзяцей, 3 мужчын, 7 жанчын і 3 чалавекі, пол якіх не быў устаноўлены. Пахаванні былі размешчаны ў двух гарызонтах, што сведчыць аб выкарыстанні ўжо існуючых могілак для паўторнага пахавання. Пахаванні ніжняга гарызонта збольшага не былі парушаны пахаваннямі гарызонта 1, што сведчыць аб наяўнасці надмагільных канструкцый, маркіраваўшых пахаванні. Гэта пацвярджаецца тым, што каменныя канструкцыі добра суадносяцца з пахаваннямі ніжняга гарызонта (гл. мал. Б41–42). Пры ажыццяўленні пахаванняў верхняга гарызонта каменныя надмагіллі імкнуліся ўзнавіць.

Значная частка пахаванняў утрымлівае дзіцячыя падпахаванні, што можна разглядаць як лакальную традыцыю. Такой жа традыцыяй з'яўляецца звычай палення вогнішчаў на магіле.

Наяўнасць артэфактаў дазваляе вызначыць, што могільнік дзейнічаў у XVIII ст.

## 2.6 Могільнік каля в. Доўгае Глыбоцкага р-на

Могілкі размешчаны прыблізна за 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі Доўгае. Вёска адносіцца да Зябкаўскага сельскага савета Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці (гл. мал. 1). Могілкі складаюцца з трох частак: сучасных дзеючых могілак, закінутага грунтовага могільніка, на якім і праводзілася шурфоўка, і курганнага могільніка.

Курганы на могілках в. Доўгае ўзгадвае ў сваёй «Археалагічнай карце Віленскай губерні» Ф.В. Пакроўскі [Покровский, Ф.В. Археологическая карта Виленской губернии / Ф.В. Покровский – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1893. – XVIII с.+164 с., с. 14, 17].

PolotskSU

Адзначана, што 3 курганы абкладзены вялікімі камянямі. Курганная група на могілках в. Доўгае (са спасылкай на Ф.В. Пакроўскага, А. і В. Галубовічаў ўзгадваецца ў «Археалагічнай карце Беларусі» Г.В. Штыхава [Штыхов, Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма. Вып. 2 / Г.В. Штыхов. – Минск: Полымя, 1971. – 276 с.; ил., с. 43]. У 1981 г. курганную групу апісала Л.У. Дучыц, а ў 1995 г. яна правяла там археалагічныя раскопкі курганоў [Дучыц, Л. Курганны могільнік Зябкі – Доўгае / Л. Дучыц // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2001. – № 16. – С. 111-114, с. 111]. Л.У. Дучыц паведамляе аб наяўнасці побач з курганамі грунтовага могільніка плошчай у некалькі гектар, «дзе пахаванні адбываліся ад часоў сярэднявечча да сённяшняга дня» і выказвае меркаванне, згодна з якім грунтовы могільнік з'яўляецца працягам курганнага. На старой частцы могільніка «многія з грунтовых магіл пакрыты камянямі», маюцца каменныя крыжы і валуны з высечанымі крыжамі і іншымі знакамі.

Закінуты грунтовы могільнік мае форму, набліжаную да прамавугольнага трохкутніка з бакамі 113 м («гіпатэнуза»), 50 м і 89 м («катэты»). «Гіпатэнуза» адпавядае лініі «поўнач-поўдзень» (гл. мал. 17). З паўночнага захаду да могільніка прымыкае курганная група, з захаду – дзеючыя могілкі. З паўночнага ўсходу могільнік абмежаваны сцежкай, а з паўднёвага ўсходу – грунтовай дарогай. На паўночным захадзе ад могільніка, за курганамі, праходзіць ашфальтаваная дарога да в. Доўгае.

Рэльеф роўны. Могільнік густа парос ліставым лесам і хмызняком. Асабліва часта сустракаецца алешнік. Хмызняк на заходняй ускраіне, памежнай з дзеючымі могілкамі, часткова засыпаны смеццем з іх. Могільнік пакрыт тоўстым слоем мінулагодняга лісця, якое разам з дзёрнам хавае дробныя камяні з абкладак магіл. Аднак мяркуючы па заўважных валунах у галавах (нагах) пахаванняў, могільнік уключае каля сотні пахаванняў. Дакладна заўважны толькі асобныя магілы, абкладзеныя (абстаўленыя) камянямі большых памераў (гл. Фота 19-20). Зыходзячы з размяшчэння валуноў у галавах (нагах) пахавання, магілы арыентаваны па лініі «ўсход – захад » з невялікімі адхіленнямі ў абодва бакі. На могільніку маецца 5 каменных крыжоў (гл. Фота 21-25). Крыжы ўраслі ў зямлю, нахілены. Крыжы і большасць камянёў – з пароды шэрага колеру. Маецца адзін крыж, які рассыпаецца з прычыны нетрываласці каменя (граніт-рапаківі?).

Памеры крыжоў: 1. вышыня наземнай часткі – 0,52 м, шырыня перакладзіны – 0,38 м (гл. фота 22).

2. вышыня наземнай часткі – 0,38 м, шырыня перакладзіны – 1,01 м (гл. фота 23).

3. крыж з граніту-рапаківі (?), даўжыня – 0,79 м, шырыня перакладзіны – 0,42 м (крыж павалены, таму даецца не вышыня, а даўжыня) (гл. фота 24).

4. вышыня наземнай часткі – 0,29 м, шырыня перакладзіны – 0,47 м (гл. фота 25).

5. крыж, які знаходзіўся ў межах шурфа – вышыня 1,02 м, у т.л. наземнай часткі – 0,58 м, шырыня перакладзіны – 0,52 м (гл. фота 21, 29).

На ўсходнім ускрайку могільніка, каля 12 м ад сцежкі, што абмяжоўвае могільнік з паўночнага ўсходу, быў закладзены раскоп. Раскоп быў арыентаваны па баках свету. З прычыны прырэзак (для даследавання выяўленых пахаванняў, што выходзілі за межы першапачатковага раскопа) была ажыццёўлена прырэзка з заходняга боку, што тлумачыць няправільную канфігурацыю раскопа. З прычыны наяўнасці у раскопе вялікіх дрэў 6 кв. м унутры раскопа не даследаваліся (пазначаны заліўкай шэрага колеру).

На ўзроўні дзённай паверхні пасля расчысткі прасторы ад хмызняку і апалага лісця выявіліся каменныя канструкцыі. Яны ўяўлялі сабой абкладкі магіл па перыметры з вялікімі камянямі ў галавах і нагах пахавання ("ладдзепадобныя" надмагіллі) і скапленні невялікіх камянёў няпэўнай формы. Пры разборы пласта 1 выявіліся нябачныя на ўзроўні дзённай паверхні камяні невялікіх памераў, а таксама жорны, што знаходзіліся ў квадраце В2.

У працэсе раскопак было выяўлена 29 пахаванняў. Пахаванні арыентаваны галавой на захад з невялікімі адкланеннямі да поўдня. Выключэнне складаюць пахаванні 23, арыентаванае галавой на паўднёвы захад і пахаванне 29, арыентаванае галавой на паўднёвы ўсход. Падобныя радыкальныя адхіленні ад заходняй арыентацыі рэдкія, аднак сустракаюцца

PolotskSU

на могільніках Беларускага Падзвіння (напрыклад, на могільніку Бірулі Докшыцкага р-на). Стан захаванасці костак дрэнны, што тлумачыцца лёгкай пяшчанай глебай, якая добра прапускае паветра і ваду. Паводле даных антрапалагічнай экспертызы, знойдзеныя парэшткі належалі 3 мужчынам, 6 жанчынам і 11 дарослым людзям, пол якіх устанавіць не ўдалося з прычыны дрэннай захаванасці парэшткаў, а таксама 9 дзецям.

Уяўляе цікавасць пахаванне 28, размешчанае ў даўблёнай труне. Таксама выяўлены цвікі ад трун. Пахавальны інвентар адсутнічае ва ўсіх пахаваннях. У якасці памінальнага інвентара можна разглядаць фрагменты керамікі XV ст. Пры раскопках пад камянямі пахавання 1 была выяўлена манета — "денгу" Расійскай імперыі 1743 г. Можна меркаваць, што могільнік функцыянаваў у XV–XVIII стст.

### 2.7 Могільнік каля в. Ваською Глыбоцкага р-на

Могільнік каля в. Васькавічы з каменным крыжам узгадваецца ў археалагічнай карце Г.В. Штыхава. Вёскі Васькавічы зараз не існуе, самі могілкі надзвычай зараслі лесам і непралазным хмызняком. Могілкі размешчаны каля дарогі "Ушачы — Зябкі" з паўднёвага боку. Пасля расчысткі часткі могілах ад хмызняка і падлеску было выяўлена два крыжы. Раскоп у 10 кв. м быў закладзены з такім разлікам, каб уключыць адзін з іх.

На ўзроўні дзённай паверхні фіксаваліся дзве лініі камянёў, выцягнутыя з поўначы на поўдзець. Каменны крыж размяшчаўся на паўднёвы ўсход ад іх. У пласце 1 выявілася каменная выбрукоўка на ўсход ад крыжа, т.к. чынам сам крыж маркіраваў захад надмагілля. Акрамя таго, было выяўлена скапленне з 6 камянёў на поўнач ад надмагілля 1. У выніку раскопак выяўлена 2 пахаванні, арыентаваныя галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўначы. Абодва пахаванні мужчынскія. У абодвух магілах выяўлены цвікі ад трун. Інвентар прадстаўлены нацельным крыжыкам з распяццем і надпісам «MISSION» на адвароце, з металу жоўтага колеру, пакрытага нязначнай карозіяй зялёнага колеру (медны сплаў), а таксама авальным медальёнам з металу белага колеру, з трыманнем для ланцужка і адным звёнам ланцужка, гузікамі, у т.л. касцяным. Знаходкі датуюцца XIX — пачаткам XX ст.

Пасля выяўлення позняга археалагічнага матэрыяла раскопкі могільніка не працягваліся. Можна казаць пра ўстойлівасць пахавальных традыцый (выкарыстанне каменных канструкцый) у гэтым рэгіёне у XIX — пачатку XX ст. і, магчыма, пра паўторнае выкарыстанне каменнага крыжа.

### 2.8 Канструктыўная асаблівасці магільных ям і трун пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

Важным элементам пахавання з'яўляецца пахавальнае збудаванне. Пахавальнае збудаванне – гэта канструкцыўная характарыстыка замкнёнай прасторы і яе запаўнення, што прызначалася для змяшчэння астанкаў пахавальнага. Асноўным архетыпам пахавальнага збудавання з'яўляецца яма [34]. Яма ўяўляе сабой паглыбленне ў глебе, куда змяшчаліся астанкі нябожчыка. Для даследаваных грунтовых і жальнічных пахаванняў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. яма з'яўлялася адзіным варыянтам пахавальнага збудавання.

Контуры магільных ям фіксуюцца не заўсёды. Для гарадскіх могільнікаў, што актыўна выкарыстоўваліся працяглы час, характэрны шматслойныя пахаванні ў некалькі ярусаў. Контуры магільных ям пры гэтым не прасочваюцца. Зафіксаваныя магільныя ямы маюць падпрамавугольную форму з закругленымі краямі шырынёй 0,6-1,0 м і даўжынёй каля 2 м. Глыбіня магільных ям звычайна не перавышае 0,8 м. У межах аднаго і таго ж могільніка глыбіня ям можа істотна вар'іравацца. На гарадскіх могільніках магільныя ямы не абавязкова

PolotskSU

з'яўляюцца мацерыковымі ямамі, а могуць знаходзіцца ў тоўшчы культурнага слоя. Напрыклад, на могільніку на месцы саляных складоў у Віцебску глыбіня магільных ям знаходзілася ў інтэрвале 0,3 - 0,6, ніжні ярус складалі мацерыковыя ямы, верхні – ямы ў тоўшчы культурнага пласта [29]. Адносна невялікая глыбіня магільных ям азначае неглыбокія, не глыбей за 1,3 м, пахаванні. Метрычныя памеры магільных ям галоўным чынам маглі залежыць ад памераў памерлага і труны, а таксама ад наяўнасці побач іншых пахаванняў, характара грунта, пары года.

На могільніку каля в. Дубраўка намі былі выяўлены пахаванні, якія размяшчаліся ў двух стратыграфічных гарызонтах. Пры гэтым каменныя надмагіллі выяўлялі большую адпаведнасць менавіта ніжняму гарызонту і ў меншай ступені — пахаванням верхняга гарызонта. Пахаванні ніжняга гарызонта захаваліся лепш, у той час, як пахаванні верхняга гарызонта пашкоджаны перакопамі. Гэта сведчыць аб падзахаваннях ва ўжо існуючыя магілы, для чаго каменныя канструкцыі разбіраліся, а потым аднаўляліся ў набліжаным да першапачатковага варыянце. Прынцыповае адрозненне могільніка каля в. Дубраўка ад гарадскіх шматгарызонтных могільнікаў заключаецца ў тым, што пахаванні рабілі адно над адным спецыяльна, а не парушалі магілу выпадкова.

Характар грунта ў запаўненні магільнай ямы залежаў ад грунта, у якім ажыццяўлялася пахаванне. Для сельскіх пахаванняў гэта пераважна пясчаны грунт. Праслоек вугалю, якія фіксаваліся ў запаўненні магільных ям жальнічных пахаванняў Панямоння [18]. на Падзвінні не сустракаецца. Акрамя глебы, у запаўненні ямы могуць сустракацца буйныя камяні. Падобная сітуацыя прасочваецца ў адным з жальнічных пахаванняў могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага раёна. У некалькіх магіл з жальніка каля вв. Івесь Глыбоцкага і Бірулі Докшыцкага раёна ў верхяй частцы запаўнення магілы валуноў не меньш, чым на паверхні. У падобных выпадках не варта падзяляць надмагільную і ўнутрымагільную каменныя канструкцыі, якія складаюць адзінае цэлае.

У разглядаемы перыяд практыкаваліся як пахаванні як без трун, так і ў трунах. Труны можна падзяліць на чатыры катэгорыі. Да першай адносяцца труны, што складаліся з дошак без выкарыстання цвікоў. Такія труны можна прасачыць па наяўнасці драўніны або яе рэштак ад труны пры адсутнасці цвікоў. Такія труны сустракаліся, напрыклад, у пахаваннях каля в. Доўгае Глыбоцкага і Бірулі Докшыцкага раёна (Вайцяховіч). Другім варыянтам з'яўляюцца даўблёныя труны, наяўнасць якіх можна меркаваць пры выяўленні добра захаванай драўлянай труны пры адсутнасці цвікоў. Такая труна выяўлена намі ў 2015 г. на могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна. Трэці варыянт – труны з дошак, збітыя цвікамі. У разглядаемы час, асабліва бліжэй да канца перыяда, гэта найбольш пашыраны варыянт труны. Падобныя труны вызначаюцца па наяўнасці рэштакаў дрэва і цвікоў. Цвікі каваныя, масіўныя. Такія цвікі былі знойдзены пры раскопках некалькіх пахаванняў на могільніках каля вв. Івесь, Жарнасекава, Клешчыно, Мураўшчына, Дубраўка. Чацвёрты варыянт складалі адмысловыя труны з багатых пахаванняў. Прыкладам могуць служыць пахаванні ў віцебскай Свята-Духаўскай царкве, даследаваныя В.М. Ляўко. Такія труны маглі мець точаныя ручкі, накладкі, тканевую абабіўку, замацаваныя дэкаратыўнымі цвікамі. Такія труны характэрныя для гарадскіх пахаванняў і ў сельскіх могільніках не выяўлены.

Графічная рэканструкцыя трун, выяўленых на могільніку каля в. Івесь, прадстаўлена на малюнку (гл. мал. Б30).

Арыентацыя магіл адносна бакоў свету неаднолькавая на розных могілках Падзвіння. Напрыклад, на могільніках вв. Туржэц 2, Глыбачка, Двор Паўлле, Варонічы магілы арыентаваны па лініі паўднёвы-ўсход – паўночны-захад [9, с. 11-12]. Такім чынам, хоць агульны вектар усход-захад вытрымліваецца, ад яго маюцца досыць значныя адхіленні ў абодва бакі.

Для параўнання: на полацкіх гарадскіх могілках XVII – XVIII стст. (на гарадзішчы), дзе пахаваны асобы каталіцкага веравызнання, дамінавала арыентыроўка галавой на захад, але сустракалася і арыентацыя на паўночны-захад [10]. Такая ж арыентыроўка, з адхіленнямі

PolotskSU

ў абодва бакі ад заходняга напрамку, характэрная для ўсіх даследаваных намі сельскіх могільнікаў.

Адпаведна з хрысціянскімі традыцыямі, пахаванні павінны былі адбывацца галавой на захад, г.зн., што магіла павінна была быць арыентавана ў напрамку захад – усход [68, s. 137]. На Беларусі існавалі ўласныя традыцыі. Праваслаўных звычайна хавалі галавой на захад, католікаў – на ўсход [46, с. 242]. Лінія ўсход-захад, такім чынам, вытрымлівалася.

Тэарэтычна, адпаведна з паганскімі ўяўленнямі, арыентацыя павінна была быць звязана з напрамкам, у якім знаходзіцца іншы свет. Звычайна разумеецца, што памерлага кладуць у магілу так, каб ён нагамі (значыць, і тварам) ляжаў у бок “таго” свету. У традыцыйных культурах лічылася, што так нябожчыку прасцей знайсці дарогу туды. Адпаведна, калі нябожчыка пахавалі галавой на захад, ён павінен быў ісці на ўсход, а калі пахавалі галавой на ўсход – то на захад. Аднак магло існаваць і іншае тлумачэнне – напрамак да “таго” свету указваецца менавіта галавой, г.зн. ён процілеглы баку, куды глядзіць твар [51, с. 580; 58, с. 371]. Інакш кажучы, больш простае ўяўленне аб шляху ў іншасвет, прыбліжанага да разумення дарогі, прадугледжвала арыентацыю ў бок “таго” свету нагамі, а больш абстрактнае – галавой [51, с. 383].

У адпаведнасці з беларускай міфапаэтычнай карцінай свету, рай можа лакалізоўвацца як у гарызантальнай, так і ў вертыкальнай плоскасці. У першым выпадку ён месціўся недзе “вельмі далёка на зямлі, за гарамі да за марамі”, у другім – “угары там, каля яснага сонейка, дзесь на паўдні, куды й птушкі лятуць у вырай” [11, с. 421-422]. Беларускай паганскай традыцыі ўяўлення аб пекле ўласціва не было. З’явіўшыся пад уплывам хрысціянства, яно не набыло да канца кананічнага выгляду. Існавала нават уяўленне аб “пекным пекле”, дзе чэрці жывуць весела, “да й грэшным душам пазваляюць весяліцца” – перажытак язычніцтва [10, с. 373-374]. Лакалізоўвалася пекла або “ўнізе пад зямлёю”, або ўсярэдзіне вялікай гары “на канцу света”, або на “першым”, самым нізкім небе [10, с. 373-374]. У кожным разе, гарызантальныя лакалізацыі што рая, што пекла досыць няпэўныя. Паводле хрысціянскай трактоўкі, рай знаходзіўся на ўсходзе, а “царства Сатаны” – на захадзе [51, с. 582].

Аднак у хрысціянстве арыентацыя магілы і нябожчыка мела іншы сэнс. Звязвалася гэта з эсхаталагічнымі чаканнямі і спадзяваннем уваскрасення. Лічылася, што новае прышэсце Хрыста адбудзецца з усходу, таму твар нябожчыка павінен глядзець туды. Гэта агульнаеўрапейская хрысціянская традыцыя [51, с. 380-383; 65, с. 183; 68, s. 138]. Адпаведна, нябожчыка мусілі класці ў магілу галавой на захад. Аднак з чым на самой справе была звязана арыентацыя магіл – з паганскімі ці з хрысціянскімі ўяўленнямі? Для адказа на гэтае пытанне варта ўспомніць аб “якасці” хрысціянства, дакладней, аб тым, наколькі г.зв. “народнае хрысціянства” адпавядае хрысціянству кананічнаму. Уяўляецца, што ў дадзеным выпадку ў свой час адбылося чарговае дапасаванне новых тлумачэнняў да старой практыкі.

Ускосна пацвярджае гэта наступнае. На магілу памерламу ставяць крыж. Паводле паганскіх уяўленняў, крыж – гэта абярог, які перашкаджае нячысцікам шкодзіць целу. Таму яго патрэбна было размяшчаць у галавах. Адпаведна з хрысціянскім разуменнем сітуацыі, крыж патрэбна ставіць у нагах, каб пры ўсеагульным уваскрашэнні чалавек мог бачыць перад сабой крыж і хрысціцца на яго [58, с. 371-372]. Цікавае, прагматычнае і зусім не кананічнае тлумачэнне існавала ў Эстоніі: крыж у нагах быў патрэбен для таго, каб узяцца за яго ў дзень уваскрашэння і зручней вылезці з магілы [68, s. 138]. На Беларусі дагэтуль не існуе агульнай практыкі пастаўлення крыжа. Старыя людзі, гледзячы на магілы продкаў, кажуць, што ёсць альтэрнатыўны і пры гэтым абсалютна легітымны варыянт пастаўлення крыжа [30; 58, с. 372]. Такім чынам, нават у наш час у межах “народнага хрысціянства” працягвае існаваць традыцыя паганскага паходжання. Гэтак жа можна разумець сітуацыю з арыентацыяй магілы, дакладней, з яе тлумачэннем.

Арыентацыя магіл адносна бакоў свету неаднолькавая на розных могілках Падзвіння. Напрыклад, на могільніках вв. Туржэц 2, Глыбачка, Двор Паўлле, Варонічы магілы арыентаваны па лініі паўднёвы-ўсход – паўночны-захад [18, с. 11-12]. Тое ж з пахаваннямі на

PolotsSU

могілках в. Шо. Такім чынам, хоць агульны вектар усход-захад вытрымліваецца, ад яго маюцца досыць значныя адхіленні ў абодва бакі.

У суседняй Латвіі з XIV – XV стст. на сельскіх могілках канстатуецца напрамак паўднёвы-захад – паўночны-ўсход, які ў XVI – XVII стст. разам з напрамкам запад – усход становіцца дамінуючым. Археалагічныя даследаванні латвійскіх могільнікаў (Аўгусцінішкі, Слуцішкі, Вілмані і Шкершканы) выявілі наступныя дамінуючыя арыентацыі: захад – усход, паўднёвы-захад – паўночны-ўсход і нават поўдзень-поўнач [65, с. 183]. Даследаванне яцвяжскіх могільнікаў дала арыентацыі ўсход – захад, паўднёвы-захад – паўночны-ўсход, напрамак поўдзень-поўдзень-захад – поўнач-поўнач-усход, паўднёвы-ўсход – паўночны захад [33, с. 55].

Пытанне аб адхіленні ад лініі ўсход-захад вывучалася ў дачыненні да пахаванняў эстонскіх могілак, праўда, не зусім у такім кантэксце [68]. Выказваліся меркаванні аб тым, што адхіленні ад напрамку былі звязаны з сезоннымі ваганнямі кропкі ўсходу або заходу Сонца (летам, напрыклад, кропка заходу адхіляецца на поўнач), аднак яны былі абвергнуты. Была выказана цікавая гіпотэза аб тым, што раней уяўленні аб баках свету, магчыма, адрозніваліся ад сучасных. Для прыкладу, у старажытных нарвежцаў паўночны напрамак не супадаў з астранамічным, а знаходзіўся на ўсход ад яго. У фінаў зафіксавана адваротнае ўяўленне [43, с. 121; 68, s. 138, 141]. Наогул, у мелася тэндэнцыя вызначаць поўнач на ўсход ад астранамічнага напрамку.

Такім чынам, пры наяўнасці агульнага вектара ўсход-захад, можна канстатаваць наяўнасць на Беларускім Падзвінні адхіленняў ад дакладных бакоў свету. Падобныя адхіленні ад бакоў свету характэрныя і для пахаванняў ранейшага перыяду.

## 3 ІНВЕНТАР ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.

Пахавальным інвентаром называецца сукупнасць рэчаў, якія змяшчаліся ў магілу разам з нябожчыкам. Гэта маглі быць асабістыя рэчы, ахвяры, ежа для падарожжа памерлага ў іншасвет або жыцця там [4]. У адрозненне ад большасці археалагічных знаходак, якія былі калісьці згублены, загінулі разам з гаспадарамі і пабудовамі і г.д., пахавальны інвентар клаўся ў магілы спецыяльна. Пахавальны інвентар адлюстроўвае звычай забяспечваць нябожчыка ўсім неабходным для жыцця пасля смерці.

Даныя археалагічных даследаванняў сведчаць аб тым, што большая частка пахаванняў XIV – XVIII стст. – безынвентарныя, што добра суадносіцца з хрысціянскай практыкай. Артэфакты, якія былі знойдзены ў ходзе археалагічнага вывучэння пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. і адносяцца да пахавальнага інвентара, мэтазгодна падзяліць на дзве групы. У першую ўваходзяць дэталі вопраткі ў шырокім сэнсе (уключаючы ўласна адзенне, абутак, галаўныя ўборы, дэталі касцюма), а таксама ювелірныя вырабы і прадметы – маркеры канфесійнай прыналежнасці. Наяўнасць у пахаваннях падобных рэчаў таксама не супярэчыць нормам хрысціянскай рэлігіі. Да другой групы адносяцца манеты, асабістыя рэчы, посуд. Прысутнасць артэфактаў дадзенай групы ўказвае на тое, што пахаванне зроблена не строга па хрысціянскім канонам.

Павольнасць і першапачатковая павярхоўнасць хрысціянізацыі, пастаянныя кантакты насельніцтва Беларускага Падзвіння з балцкім насельніцтвам, трываласць пахавальнай традыцыі прывялі да фактычнага захавання язычніцкіх звычаяў [17]. Звычай класці ў магілу асабістыя рэчы фіксуецца этнографамі і зараз. Нельга, аднак, казаць, што распаўсюджанне хрысціянскай рэлігіі не аказала ніякага ўплыву. Адметнасць пахаванняў XIV – XVIII стст. у тым, што яны пераважна безінвентарныя. Але ёсць выключэнні.

Найбольш паслядоўнае выкананне хрысціянскіх канонаў павінна было быць уласцівым для духавенства, таму пахаванні людзей духоўнага сану павінны былі быць

PolotskSU

безінвентарнымі. Акрамя таго, пахаванні на прыходскіх могілках, якія здзяйсняліся пад кантролем святароў, павінны больш адпавядаць хрысціянскім нормам, чым тыя, якія былі ажыццёўлены ў аддаленасці ад цэркваў. Этнаграфічна фіксуецца магчымасць ажыццяўлення ў XIX стагоддзі пахавання без прысутнасці святара, і няма падстаў лічыць, што гэта было немагчымым у больш ранні час [46]. Улічваючы сацыяльныя аспекты хрысціянізацыі, можна меркаваць, што пахавальны інвентар будзе больш разнастайным у вёсцы, чым у горадзе, аднак у гараджан могуць сустракацца прадметы адзення і ўпрыгожванні, зробленыя з больш каштоўных матэрыялаў.

### 3.1 Кераміка: памінальны інвентар

Вытворчасць керамічнага посуду (па даным археалогіі) у сельскай мясцовасці даследавана недастаткова. Кераміка XIV-XVIII стст. з тэрыторыі Беларускага Падзвіння з’яўляецца белай плямай айчынай навукі. Ганчарную вытворчасць па этнаграфіных матэрыялах 19 – першай паловы 20 ст. шырока даследуе Я. Сахута [35]. Ім вылучаны пэўныя асаблівасці рэгіёнаў, тыпалагіныя схемы, але яго даследаванні не маюць сувязі з папярэднім перыядам. Пытанне керамічнага посуду з тэрыторыі Беларускага Падзвіння вызначанага перыяду толькі ўскосна, як прадстаўленне матэрыялаў, закранался ў артыкулах М.В. Клімава і А.Л. Коца [21; 22, с. 45-53]. Кераміка паўночна-ўсходняй Беларусі перыяду сярэднявечча падрабязна ахарактарызавана ў працы В.М. Ляўко. Безумоўна сельскія жыхары мелі цесныя кантакты з гарадскім асяроддзем, і таму пэўныя тэндэнцыі ў развіцці керамічнай вытворасці горада, пераймаліся і ў сельскай акрузе. Але пытанне лакальных асаблівасцяў, суаднясенне кансерватыўнасці вёскі ў ганчарнай вытворчасці і новых тэндэнцый прыйшоўшых з горада і інш. – гэта тое кола пытанняў, на якія сёння варта звярнуць увагу пры даследаванні керамічнага посуду ў сельскай мясцовасці.

Што датычыцца праблемы даследавання керамічнага посуду, які выкарыстоўваўся ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння у XIV–XVIII стст., то спецыяльныя публікацыі па гэтай тэме адсутнічаюць. Адзінай працай, дзе характарыстыцы выяўленай у пахавальных помніках керамікі ўдзяляецца асобная ўвага, з’яўляецца артыкул Д.У.Дука, па выніках раскопак грунтовага могільніка Туржэц-2. Аўтар падрабязна характарызуе памінальны посуд [9]. Праблема вывучэння керамічнага посуду з пахавальных помнікаў XIV-XVIII стст. заключаецца ў яго нешматлікасці. У час раскопак вяўленыя фрагменты керамікі не вызначаюцца разнастайнасцю і масавасцю.

Гэтае пытанне можна добра прасачыць па матэрыялах археалагічных раскопак грунтовых могільнікаў Беларускага Падзвіння, якія праводзіць В.У. Чараўко. За апошнія 6 гадоў ім праводзіліся раскопкі на 8 грунтовых могільніках, і керамічны матэрыял, як правіла, быў прадстаўлены фрагментамі сценак, донцаў, венцаў кругавых начынняў (гаршкоў). Таксама сярод адзіночных знаходак можна назваць ручку керамічнай накрыўкі, фрагменты керамічнага збанка з паліва, часткі ляпнога посуду. Разгледзім асноўныя з іх.

*Грунтовы могільнік Доўгае.*

У час шурфоўкі, праведзенай у 2010 г., было ўскрыта 5 м$^2$. Нягледзячы на нязначную ўскрытую плошчу, выяўлены керамічны матэрыял з’яўляецца каштоўным, паколькі гэта адзіны артэфакт, што дазваляе датаваць ускрытыя пахаванні. У час раскопак выяўлена 9 фрагментаў керамічнага посуду: 6 сценак і 3 венцы. У ходзе камеральнай апрацоўкі масавага матэрыялу вызначана, што ўсе фрагменты паходзяць ад аднаго гаршка. Іх атрымалася склеіць разам, так што атрымаўся амаль поўны профіль начыння, толькі без дна.

Гаршкок мае наступныя памеры: дыяметр венца 19 см, дыяметр прыдоннай часткі 10 см, дыяметр шыйкі 20 см, дыяметр найбольшага пашырэння на ўзроўні плечыка 23 см. Па плечыку гаршка зроблена яскрава выражанае рабро, венца нязначна выгнута і край зрэзаны вонкі з ледзьпрыкметнай бароздкай. Гаршок па плечыку ўпрыгожаны ямкавым арнаментам,

PolotskSU

якія зроблены неахайна, у выглядзе кропак прыбліжаных да трапецыяпадобнай формы. Таўшчыня сценкі гаршка паступова павялічваецца да дна: 0,6 см – каля плечыка, 0,8 см – прыдонная частка. Гаршок быў зроблены на ручным ганарным коле. Абпал якасны, цеста са шматлікім дабаўленнем жырствы дроднага і сярэдняга памеру. Пасля абпалу гашок выкарыстоўваўся ў гаспадарцы, аб чым сведчаць рэшткі нагару на ўнутраным баку і па печыку. Форма гаршка не тыповая для гарадской керамікі паўночнай Беларусі. З пэўнай доляй верагоднасці, яго можна датаваць XV–XVI стст. і вызначыць уплаў знешніх традыцый на выраб падобнага посуду ў сельскай мясцовасці.

На грунтовым могільніку Доўгае пад час раскопак у 2015 г. быў артыманы керамічны матэрыял: сценкі, донцы, венцы керамічных гашкоў і дробныя фрашменты керамічных вырабаў. У ходзе камеральнай апрацоўкі было вызначана, што усю кераміку можна падзяліць на 2 катэгорыя. Адну катэгорыю можна датаваць канцом X – XI стст. і звязаць яе пахожанне з курганнымі старажытнасцямі. Другая катэгорыя керамічнага посуду датуецца XIV – XV стст. і, верагодней за ўсё, адносіцца да перыяду існавання грунтовага могільніку.

Побач з грунтовым могільнікам Доўгае знаходзіцца курганны могільнік Зябкі-Доўгае, які быў даследаваны Л.У. Дучыц [32, с. 111]. Даследчыца датавала помнік XI-XII стст. На помніку захавалася каля 24 насыпаў. Але па дадзеным М.А. Ткачова у курганным могільніку Доўгае налічвалася  да 75 насыпаў. Частка іх была знішчана пад час будаўніцтва побач машыннага двара [32, с. 111, 112]. Відавочна, што частка курганнага могільніка была знішчана ў працэсе пашырэння плошчы грунтовых пахаванняў, якія з'явіліся пазней. Такім чынам кераміка старажытнарускага часу магла патрапіць у грунтовыя пахаванні.

Выяўлена адно венца старажытнарускага ("курганнага") перыяду. Яно захавалася на вышыню каля 5,5 см. Дыяметр венца каля 20-21 см. Па плечыку гаршка зроблена не выражанае (ледзьпрыкметнае) рабро, венца нязначна выгнута вонкі і край зрэзаны ўнутар з ледзьпрыкметнай бароздкай. Таўшчыня сценкі гаршка 0,7 см па плечыку і 0,9 см каля венца. Гаршок быў зроблены на ручным ганарным коле. Абпал якасны, цеста са шматлікім дабаўленнем дробнай жарствы. Паводле матэрыялаў Г.В. Штыхава (на аснове раскопак у Полацку) дадзенае венца можна вызначыць як не тыповае для гарадской традыцыі ганчарства і паводле стратыграфічных напластаванняў Верхняга замка ў Полацку яны датуюцца канцом X – XI стст. [83, с. 84]. Такім чынам у кантэксце храналогіі помніка (з улікам даных Л.У.Дучыц) апісаны керамічны посуд можна датаваць у межах XI ст.

У раскопе выяўлены фрагменты двух донцаў з клеймамі. Абадвы донца былі зроблены на ручным ганчарным коле. Цеста донцаў зроблена з дабаўленнем дробнай жарствы. Абпал посуду якасны. . Таўшчыня донцаў каля 0,3-0,6 см. Адно донца мае кляймо ў выглядзе. Дадзенае донца зроблена на падсыпцы з дробназярністага пяску. Па прычыне фрагментарнасці яго дыяметр не вызначаецца. На другім донцы выявва крыжа ў коле. Выраз крыжа расплыўчаны і вельмі неахайны. Дыяметр кола каля 2 см. Дыяметр дадзенага донца 8 см. Донца да гаршка было прылеплена ўручную (захаваўся бурцік па краю). Клема на донца характэрны выклчна для ганчарнай керамікі і былі распаўсюджаны ў XI – XII стст. на тэрыторыі ўсёй Усходняй Еўропы.

Існуе шэраг меркаванняў наконт паходжання ганчарных клеймаў. Адны даследчыкі лічаць, што яны насілі магічны характар і выкарыстоўваліся, каб абараніць уладальніка посуду ад уздзеянны нячыстай сілы [88, с. 166]. С.В. Тарасаў лічыць, што кухонны посуд з клеймамі выкарыстоўваўся ў дробных і сярэдніх разліках у якасці мернай тары [72, с. 129]. Іншыя бачаць у гэтым знакі майстроў [64, с 176-177]. Р.Л. Розенфельд лічыць клейма знакамі заказчыкаў [63]. Але большасць даследчыкаў падтрымліваюць меркаванне А.Л. Мангайта. Ён падкрэсліваў значнае адзінства ганчарных клеймаў на абшырнай славянскай тэрыторыі, што яны з'явілася яшчэ ў язычніцкія часы, калі характар рэлігійнай сімволікі быў агульным для славянскіх земляў. Са з'яўленнем ганчарнага кола, гэтыя, часта звязаныя з салярным культам сімвалы (кола, крыж, свастыка), былі перанесены на кераміку і сталі знакамі майстроў [55, с. 120-121]. Падобнага тлумачэння клеймаў прытрымліваецца і А.М. Плавінскі. Клейма як сімвалы, страціўшыя сваё першапачатковае культавае значэнне і

PolotskSU

пераўтварыўшыеся ў рамесныя вытворчыя тамгі, досыць дакладна тлумацыць іх падабенства і шырокі геаграфічны дыяпазон [60. с. 64]. Варта дадаць, што клейма акрамя знакаў майстроў, досыць апраўдана, наносіліся на донца гаршкоў як сімвалы-абярэгі. Праводзячы паралель паміж ганчарным рамяством і жалезаапрацоўкай, трэба адзначыць, што гэта былі не толькі найбольш шырокараспаўсюджаныя рамёствы, але і адны з самых небяспечных. Як для вырабу гаршкоў, так і для вырабу металічных прылад выкарыстоўваецца агонь, які атаясамліваўся з нячыстай сілай. І такім чынам выкарыстанне ганчарных клеймаў, як рэлігійнай сімволікі ў дадзеным кантэксце можа быць растлумачана як ахова ад нячыстага.

Да ліку керамікі XIV – XV стст. дакладна можна аднесці венца гаршка (2 фрагменты) і венца міскі.

Керамічная міска была зроблена з цеста з дабаўленнем дробнай жарствы. Абпал вырабу якасны. Дыяметр венца 13 см. Ад края венца сценкі паступова звужаюцца да дна. Таўшчыня сценкі 0,4-0,5 см. Край венца зрэзаны гарызантальна і зроблены валікам, які выступае вонкі. Хутчэй за ўсё венца было зроблена на ручным ганчарным коле і падпраўлена ўручную (старанна загладжана). Нагар не фіксуецца. Падобныя венца можна датаваць XIV – XV стст. паводле В.М. Ляўко, і аднесці да групы 1А [48]. Магчыма, што ў кантэсце археалагічнага помніка венца датуецца XV ст.

Венца керамічнага гаршка захавалася ў выглядзе дух фрагментаў, але яны не стыкуюцца. Венца гаршка мае хвалісты арнамент па плечыку. Сам гаршок быў пукатай формы. Валікападобнае венца (якое выступае вонкі і па краю закруглена) працягвалася высокай шыйкай і рэзка пераходзіла ў плечыка з яркавыражаным рабром, ніжэй рабра тулава гаршка плаўна пашыраецца. Па знешняй паверхні прасоваюцца сляда нагару. Венца керамічнага гаршка мае наступныя памеры: дыямер па краю 16 см, дыяметр па плечку 21 см. Керамічнае цеста для гаршка было падрыхтавана з нязначным дабаўленнем дробнай і сярэдняй жарствы кварцавага паходжання. Абпал зроблены не якасна, прасочваецца слаістасць на зломе. Падобныя гаршкі паволе Д.У. Дука можна датаваць у межах XV ст. [21. с. 103].

Сценкі керамічных гаршкоў не маюць дакладных вызначальных прыкмет для характарстыкі часу іх вырабу. Як і венца, сценкі з дадзенага археалагічнага помніка можна падзяліць на дзве катэгорыі.

Да адной можна аднесці знаходкі зробленыя на ручным ганчарным коле, з дабаўленнем у цесце кварцавай жарствы дробнага і сярэдняга памеру. Знешняя паверхня некаторых фрагментаў якасна загладжана. Таўшчыня сценак вагаецца ў межах 0,3-0,6 см. На некаторых фрагментах прысутнічаюць рэшткі нагару. У большасці выпадкаў абпал посуду якасны, але на асобных фрагентах знешні бок сколаты (што сведчыць аб не недастатковай тэрмічнай апрацоўцы керамікі).

Другая катэгорыя прадстаўлена адзіночнымі знаходкамі, якія магчыма зроблены на нажным ганчарным коле. Кераміка якасна апрацавана і загладжана. У цесце сустракаюцца нешматлікія дамешкі жарствы дробнага памеру. Таўшчыня сценак каля 0,3 см. Абпал праведзены якасна.

З усёй колькасці керамічнага посуду з раскопак на грунтовым могільніку Доўгае ў 2015 г. большая колькасць знаходак адносіцца да старажытнарускага перыяду, у той час як артэфакты XVст. прысутнічаюць адзінкава.

*Грунтовы могільнік Івесь*

Археалагіныя раскопкі на грунтовым могільніку Івесь праводзіліся на працягу 4-х гадоў (з 2010 па 2013). Тут было ўскрыта больш 100 м$^2$ плошчы помніка. На сённяшні момант гэта адзін з найбольш добра даследаваных пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVI стст.

Керамічны матэрыял нешматлікі, прыблізна роўна распаўсюджаны па плошчы могільніка. Вылучаюцца дзве групы посуду, выкарыстоўваемага на могільніках: пахавальны і памінальны. Першая катэгорыя посуду выкарыстоўвалася пад час здзяйснення пахавання, другая — пад час правядзення абрадаў памінання памерлага. На грунтовым могільніку Івесь

прадстаўлены керамічны посуд, як памінальны, так і пахавальны, з большай перавагай першага.

Агулам знаходкі керамінага посуду на грунтовым могільніку Івесь па спосабу вытворчасці можна падзяліць на дзве групы: пераходны – зроблены ўручную ці падпраўлены на ганчарным коле — і ганчарную кераміку.

Пад час раскопак 2010 г. выяўлены фрагменты чатырох керамічных гаршкоў і невялікія кавалкі ад іншых.

Гаршок №1 (па вопісу масавых знаходак №9 – донца, №3 – 3 сценкі, №14 – плечыка, №8 – плечыка, №8 – два венца). Па плечыку гаршка нанесены рыскавы арнамент (касыя рыскі прылізна пад вуглом у 45°); рыскі нанесены праз 0,9-1,5 см. Абпаленая гліна карычневатага колеру, у адным месцы сценкі трошкі чырванаватыя. Абпал не вельмі якасны. Зроблены гаршок на ручным ганчарным коле. Венца сфарміравана ўруную і падпраўлена на ганарным коле. Край венца нязнана атагнуты вонкі; плечыка пакатае. Дыяметр па венцу 26 см, дыяметр па плечыку 27,8 см. Цеста ўтрымлівае шмат буйной жарствы дыяметрам да 3 мм, пераважна белага або шэрага колеру. Знешняя паверхня гаршка больш якасна загладжаны адносна ўнутранай. Нагар адсутніае. Таўшчыня сценак 0,9 см, па плечыку – 0,5-0,6 см, шыйкі – 0,4 см.

Гаршок № 2 выяўлены ў мацерыковыя ямах 1 і 2. Ён складаецца з двух сценак і аднаго венца. Начынне ўпрыгожана хвалістым арнаментам па шыйцы і плечыку (у два рады). Гаршок сфрміраваны акуратна, на ручным ганчарным коле. Венца пастаўлена вертыкальна. Дыяметр венца 20 см, дыяметр па плечыку 22 см. Цеста утрымлівае вялікую колькасць дробнай жарствы. Абпал якасны, на зломе цеста цёмнашэрага колеру. Знешняя паверхня гаршка карычневага колеру, з унутранага боку цёмнашэрага. Са знешняга боку адна сценка загладжана ўруную. Таўшчыня сценак 0,5-0,9 см.

Гаршок № 3 складаецца з двух склееных частак (венца і донца), якія не стыкуюцца (8 фрагментаў). Абпаленая гліна чырвона-карычневага колеру. Абпал не вельмі якасны. Зроблены гаршок на ручным ганарным коле. Венца сфарміравана ўруную і падпраўлена на ганарным коле. Край венца нязнана атагнуты вонкі; плечыка пакатае. Дыяметр па венцу 19 см, дыяметр па плечыку 22 см, дыяметр донца 12 см. Донца фарміравана асобна і прылеплена ўрчуню. Цеста ўтрымлівае шмат жарствы. Знешняя паверхня гаршка больш якасна загладжаны адносна ўнутранай. Таўшчыня сценак 0,7-0,8 см па плечыку, 0,4 см у прыдоннай частцы.

Гаршок 4 зроблены на ручным ганчарным коле. Край венца выгнуты вонкі; плечыка пакатае. Дыяметр па венцу 23 см, дыяметр па плечыку 29 см, дыяметр прыдоннай часткі 19 см. Донца адсутнічае. Цеста ўтрымлівае шмат жарствы. Таўшчыня сценак 0,6 см на ўзроўні шыйкі, 0,7 см па плечыку, 0,5 см у прыдоннай частцы.

Паводле формаў і тэхніцы вырабу ўсе гаршкі, грунтуючыся па полацкай храналагічна шкале, надзейна можна датаваць у межах другой паловы X–XI ст. [48, с. 81]. Але ўлічваючы адставанне сельскай мясцовасці ў перайманні гарадскіх перадавых тэхналогій, гаршкі з раскопа 2010 г. на грунтовым могільніку Івесь, з пэўнай доляй верагоднасці, можна датаваць XII–XIII стст.

У раскопах іншых гадоў поўнапрофільных фрагментаў начынняў выяўлена не было.

У раскопе 2011 г. выяўлена 33 фрагменты (3 венца, сценкі і донца) гаршкоў, усе яны паходзяць ад розных начынняў. Кераміка зроблена пераважна на ручным ганчарным коле, ў асобных момантах падпраўленая ўручную. Цеста з дабаўленнем вялікай колькасці жарствы, зрэдку прысутнічае буйная жарства. Абпал керамікі, як правіла, якасны. Гаршкі карычневага або чырвонага колераў. На асобных фрагментах прысутнічаюць сляды нагару. Адно венца выгнута і мае тыповую для Полацка S-падобную форму (№1 па вопісу масавых знаходак). Дыяметр венца 20 см. Другое венца моцна выгнута вонкі і мае дыяметр 14 см (№ 8), зроблена вельмі якасна. Трэццяе венца мае валікападобнае патаўшчэнне па краю (№6). Край атагнуты вонкі, дыяметр венца 18 см. Агулам кераміку можна датаваць аналагічна гаршкам з раскопа 2010 г. – у межах XII–XIII стст.



PolotskSU

PolotskSU

Керамічны матэрыял з ракопа 2012 г. не адрозніваецца ад папярэдніх раскопаў. Цэлых начынняў тут не выяўлена. У 2012 г. сабрана самая прадстаўнічая калекцыя масавага матэрыялу – 50 фрагментаў (43 сценкі, 6 венцаў і 1 донца). Усе яны паходзяць ад розных начынняў. Керамічныя гаршкі зроблена на ручным ганчарным коле і падпраўлены ў асобных момантах уручную. Цеста з дабаўленнем вялікай колькасці жарствы, зрэдку прысутнічае буйная жарства. У рэдкіх фрагментах прасочваецца невялікая колькасць жарствы. Абпал керамікі, як правіла, якасны. Гаршкі карычневага або чырвонага колераў. На асобных фрагментах прысутнічаюць сляды нагару. Як правіла ўсе сценкі маюць дрэнна загладжаную знешнюю паверхню. Па фрагментам венца кераміку можна датаваць XII–XIII стст., асобныя элементы адцягваючы да XV ст.

Масавыя матэрыялы раскопа 2013 г. нешматлікія. Пераважна ўсе яны прадстаўлены сценкамі начынняў і адной ручкай накрыўкі. Сценкі аналагічныя кераміцы з папярэдніх раскопаў.

Ручка накрыўкі вельмі масіўная, дыяметр — каля 7 см і вышынёй да 5 см. Ручка сфарміравана на ганчарным коле. Знешняя паверхня груба загладжана. Цеста з дабаўленнем жарствы дробнага і сярэдняга памеру светлага колеру. Фрагмент мае цёмнакарычневы і шэраваты колер. Ручка накрыўкі, відавочна, падцвяджае выкарыстанне посуду як памінальнага, калі гаршок з ежай, накрыты накрыўкай, прыносілі на могілкі з дому.

Чарговыя раскопкі на грунтовым могльніку Івесь былі праведзены ў 2015 годзе. Яны далі новы кераміічны матэрыял. Керамічны матэрыял выяўлены пад час раскопак умоўна можна падзяліць на дзве групы: адну групу можна аднесці да курганных старажытнасцяў і папярэдне датаваць XI-XIII стст. Да другой групы адносяцца толькі асобныя сценкі гаршкоў і яны, магчыма, датуюцца больш познім часам.

Больш ранняя кераміка характарызуецца наяўнасцю кварцавай жарствы ў цесце і грубым выкананнем вырабу посуду: сценкі тоўстыя (да 0,6 см), у большасці выпадкаў груба загладжаныя. Але як правіла ўся кераміка мае якасны абпал. Большасць сценак змяшчаюць рэшткі нагару. Выяўленае донца зроблена на пячанай падсыпцы. Цеста з жарствой сярэдняга памеру (да 0,1 см). Донца прылеплевалася ўручную, што сведчць на карысць яго архаічнасці. Дыяметр донца 9 см.

Венца курганнага перыяду (першай групы) таксма можна падзяліць на дзве катэгорыі. Адна гэта ганчарная кераміка (2 фрагменты) і ляпная кераміка, загладжаная на ганчарным коле (1 фрагмент).

Апошняе зроблена грубай лепкай і венца загладжана на ручным ганчарным коле. Гаршок меў пукатую форму з невысокім венцам (каля 0,6 см вышынёю), якое пастаўлена вертыкальна. Край венца закруглены вонкі. На ўнутранай паверхні яскрава прасочваюцца сляды прымацаванне венца да тулава. Дыяметр венца 10 см. Цеста зроблена са шматлікімі дамешкамі бела дробнай жарствы і асобнымі рэдкімі ўключэннямі буйной жарствы. На ўнутранай паверхні гаршка прасоваюцца сляды нагару. Паводле матэрыялаў старажытнага Полацка яго варта датаваць канцом X – першай паловай XI стст.

Два другіх венца якасна зроблены на ручным ганчарным коле. Адно венца вельмі дробны фрагмент. Край венца аднягнуты вонкі ў пастаўлены вертыкальна (зроблены накшталт манжэтападобнага завяршэння). Фрагмент каршка зроблена з цеста з дабаўленнем пяску. Абпал начыння правдзены якасна. Сляды нагару не прасочваюцца. Гаршкі з падобнымі венцамі шырока распаўсюдзіліся ў XII ст. Другое венца мае хвалісты арнамент па плечку. Край венца адагнуты вонкі і адцягнуты ўверх. Дыяметр па краю венца каля 25 см. Захаваліся сляды нагару. Зроблена венца на ручным ганчарным коле якасна і акуратна. Абпал вырабу якасны. У цесце начыння прысутнічаюць нешматлікія ўключэнні буйной жарствы. Выраб мае цёмна жоўты колер. Падобныя венца шырока распаўсюджаны ў Полацку ў XI ст.

Сценка другой групы керамікі выглядае больш тонкай (да 0,4 см) у параўнанні з іншымі. Абпал гаршка зроблены якасны. Цеста з дабаўленнем дробнай жарствы. Колер

фрагмента керамічнага гаршка шэра-чырвоны. Верагодней за ўсё, што дадзеная кераміка была зроблена на ручным ганчарным коле.

Увесь керамічны матэрыял, які можна звязаць з грунтовымі пахаваннямі могільніка Івесь вельмі аднародны. Тыпалагічна і па тэхніцы вырабу гаршкоў датуецца XII–XIII стст. Але знойдзеныя ў пахаваннях артэфакты надзейна датуюць могільнік больш познім часам, а менавіта XIV–XVI стст. Для вызначэння больш дакладных храналагічных межаў і збору керамічнага посуду з пахавальнага комплексу плануецца працягнуць раскопкі на могільніку Івесь. Побач з грунтовымі пахаваннямі на могільніку Івесь знаходзяцца курганы. Можна меркаваць, што фрагменты керамікі больш ранняга часу трапілі ў пахаванні XIV–XVI стст. у ходзе пашырэння грунтовай часткі могільніка і знішчэння або пашкоджання курганных насыпаў, у якіх мелася кераміка XI–XIII стст.

Археалагічнае вывучэнне могільніка каля в. Дубраўка Гарадоцкага р-на ажыццяўлялася ў 2014 г. У шурфе былі выяўлены шматлікія фрагменты керамікі (144 фрагмента). За выключэннем чарапкоў, знойдзеных у пахаваннях 1 і 15, усе астатнія фрагменты керамікі выяўлены ў пласце 1. У квадраце 1 было знойдзена 49 фрагментаў, у квадраце 2 — 6, у квадраце 3 — 77, у квадраце 4 — 7 фрагментаў. Глыбіня залягання дазваляе інтэрпрэтаваць фрагменты керамікі як памінальны інвентар. Цікавай з’яўляецца вялікая канцэнтрацыя керамікі ў квадраце 3, у якім знаходзілася 1 пахаванне цалкам (фрагменты касцей) і 2 пахаванні — часткова. Улічваючы значную колькасць камянёў, можна меркаваць, што ў гэтым квадраце былі ажыццёўлены дзіцячыя пахаванні, якія не захаваліся. Гэтым тлумачыцца вялікая колькасць выяўленай керамікі. Кераміка падзяляецца на дзве групы. Да адной адносіцца кераміка з няроўнай, дрэнна загладжанай паверхняй, у цесце якой прысутнічае жарства. Кераміка другой групы мае гладку, добра загладжаную паверхню, часам глазураваную. Абпал раўнамерны, цеста на зломе аднароднае. Кераміка можа быць датавана XVIII ст. і XVIII–XIX стст.

*Грунтовы могільнік Мураўшчына*

Раскопкі на грунтовым могільніку праходзілі ў 2013 г. Археалагічныя матэрыялы прадстаўлены фрагментамі аднаго адметнага керамічнага начыння. Дзякуючы выяўленаму керамічнаму гаршку можна дастаткова дакладна прадатаваць археалагічны помнік. Канцэнтрацыя дадзенага керамічнага матэрыялу была засяроджана ў кв. 1 на узроўні першага ўмоўнага пласта. Дадзенае сведчанне кажа аб памінальным прызначэнні выяўленага начыння. У ходзе камеральнай апрацоўкі масавага матэрыялу вызначана, што ўсе фрагменты паходзяць ад аднаго гаршка. Іх атрымалася склеіць разам, у выніку чаго атрымаўся амаль поўны профіль начыння, за выключэннем донца. Таксама пры раскопках выяўлены фрагменты керамічнага збана і невыразныя сценкі керамічных гаршкоў.

Гаршкок мае наступныя памеры: дыяметр венца 18,5 см, дыяметр прыдоннай часткі 13 см, дыяметр найбольшага пашырэння на ўзроўні плечыка 22 см. У форме гаршка адсутнічае шыйка, венца адразу пераходзіць у плечыка. Венца зроблена ў выглядзе валіка, які нязначна выступае вонкі. Край венца плаўна закруглены унутр. Арнаментацыя не прасочваецца. Тулава гаршка плаўна звужаецца да донца. Дыяметр донца мог дасягаць каля 10 см. Ніжэй плечыка прасочваецца ледзь прыкметная бароздка, якая, верагодна, служыла для больш зручнага ўтрымання гаршка ў пячным ўхваце. Найбольшая таўшчыня сценкі гаршка фіксуецца на ўзроўні плечка. У прыдоннай частцы таўшчыня сценкі складае 0,5 см, на узроўні плечыка – 0,8 см, каля венца 0,7 см. Гаршок, відавочна, быў зроблены на нажным (быстраходным) ганарным коле. Цеста зроблена з дабаўленнем жарствы дробнага памеру. Абпал не якасны, на зломе прасочваецца слаістасць керамікі. Пры абпале унутраная паверхня набыла светлачырвоны колер, знешняя магчыма была задымлена ў чорны колер. Пасля абпалу гашок актыўна выкарыстоўваўся ў гаспадарцы, аб чым сведчаць рэшткі нагару на знешняй паверхні.Форму гаршка можна вызначыць у русле тэндэнцый развіцця ганчарнай вытворчасці на Беларусі ў XVIII – XIX стст. Дадзенае начынне варта датаваць XVIII ст.

Фрагменты керамічнага збана пад час камеральнай апрацоўкі атрымалася склеіць амаль у цэлае горлышка на вышыню да 5 см. Дыяметр венца 2 см. Венца збана нязначна

PolotskSU

выгнута вонкі, шыйка плаўна пераходзіць у плечыка. Таўшчыня сценкі збана вагаецца ў межах 0,3-0,4 см. Начынне зроблена на нажным (быстраходным) ганарным коле. Цеста чырвонага колеру, без дабавак і аташчальнікаў. Абпал якасны. Па ўсё паверхні збан пакрыты чырвона-пелай палівай (пярэстага колеру). Як правіла, падобныя збаны з'уляюцца матэрыяламі этнаграфічных калекцый. Дадзенае начынне датуецца канцом XIX – першай паловай XX ст.

Адзін фрагмент сценкі керамічнага начыння зроблены на нажным ганчарным коле. Цеста чырвонага колеру, без дамешак жарствы. Паверхня гаршка з абадвух бакоў якасна загладжана. Па знешніх прыкметах дадзены артэфакт датуецца канцом XIX-пачаткам XX стст.

Яшчэ адзін фрагмент керамічнага гаршка (№ 11 паводле калекцыйнага вопісу) зроблены вельмі груба, з дабаўленнем буйной жарствы. Абпал не якасны. Падобная кераміка можа дatavацца больш раннім часам, чым вышэй апасаны посуд. Але адзіночная падобная знаходка не дае агульных вызначэнняў па дадзеным помніку.

Такім чынам выяўлены на грунтовым могільніку каля в. Мураўшчына керамічны матэрыял можна датаваць XVIII – XIX стст.

Археалагічныя раскопкі грунтовага могільніка каля былой вёскі *Васькавічы* праводзіліся ў 2015 г. Да гэтага часу помнік абследаваўся толькі візуальна. У час раскопак выяўлены фрагменты керамічнага посуду, у т.л. сценак, донцаў і венцаў. У ходзе камеральнай апрацоўкі масавага матэрыялу вызначана, што ўсе фрагменты паходзяць ад аднаго начыння. Частку з іх атрымалася склеіць разам – атрымалася амаль цэлае горлышка керамічнага збанка ці міскі з высокімі краямі.

Збан мае наступныя памеры: дыяметр венца 18 см, дыяметр донца 11 см, вышыню збана, з пэўнай доляй верагоднасці, можна вызначыць у прамежку 15-25 см. Унутраная паверхня збана пакрыта чырвона палівай. Асобныя выпадковыя плямы чырвонай палівы фіксуюцца і на знешняй паверхні. Цеста, з якога зроблена керамічнае начынне, чырвонага колеру, чыстае, без дамешак. Абпал ганчарнага вырабу якасны, аднародны. Таўшчыня сценкі начыння 0,5-0,7 см. Па краю венца зроблена патаўшчэнне (да 0,9 см) і выгін на знешні бок. Прадмет зроблены ахайна, на нажным ганчарным коле, звонку якасна загладжаны. Такога прыкладу посуд бытаваў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў XIX – першай палове XX стст. Як правіла ён выкарыстоўваўся як сталовы або тарны посуд.

Керамічны матэрыял з археалагічнага помніка дазваляе ўдакладніць датыроўку пахавальнага комплексу. Паводле фрагментаў посуду і індывідуальным знаходкам могільнік можна датаваць у межах канца XIX-пачатку XX ст.

### 3.2 Пахавальны інвентар

Пахаванні Беларускага Падзвіння XIV–XVIII пераважна з'яўляюцца безынвентарнымі. За выключэннем керамікі, у магілах акрэсленага перыяду вельмі рэдка прыстунічаюць не толькі ювелірныя вырабы, манеты і прадметы хрысціянскага культу, але і рэшткі адзення і абутку (гл. Дадатак Г, табл. Г1).

Рэшткі адзення ў межах даследуемага арэалу фіксуюцца дастаткова часта. Звычайна гэта невялікія фрагменты тканіны, бо большая частка вопраткі стлевае. У сутарэннях Сафійскага сабора ў Полацку было выяўлена жаночае пахаванне, захавалася тканіна карычневага колеру [1, с. 131]. На могілках у Гарадку зафіксаваны ласкут палатна [1, с. 133]. Фрагмент тканіны знойдзены ў пахаванні каля меркаванай Нікольскай царквы ў Віцебску [25]. Рэшткі тканіны былі выяўлены пад час раскопак у склепе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы, але гэтая тканіна не ад вопраткі, у яе пры перапахаванні былі загорнуты косці [11].

Пахаванне ў познесярэднявечным кургане каля в. Крывец Лепельскага раёна ўтрымлівала скураны пояс, упрыгожаны «шпількамі» [38, с. 27-28].

PolotskSU

Сляды тканіны з меднай ніццю выяўлены на галаве касцяка з дзіцячага пахавання ў Полацку [13]. Венчык з шоўкавай тканіны з пазалочанымі бляшкамі знойдзены ў жаночым пахаванні з могільніка каля Пуцілкавіч [32, с. 234]. Ільняная павязка з рэшткамі валасоў прысутнічае ў жаночым пахаванні з могільніка Новы Болецк Гарадоцкага раёна [1, с. 136]. Стужка на галаве нябожчыка зафіксавана ў адным з пахаванняў на месцы былых саляных складоў у Віцебску [1, с. 134]. Тасьма з залачонай ніці мелася на чэрапе жаночага касцяка з могільніка Стары Лепель [41]. У 2011 г. на могільніку каля в. Івесь быў выяўлены ўбор з 12 тонкіх бляшак, выкананых з сярэбранага сплаву ў тэхніцы ціснення і датуемых XII–XIII (XIV) стст.

Рэшткі скуранога абутку знойдены ў пахаваннях на тэрыторыі дамініканскага кляштара ў Полацку [12].

Дастаткова шырока прадстаўлены дэталі касцюма – гузікі, спражкі і засцёжкі. Спражка і гузік з каляровага металу зафіксаваны ў пахаваннях у Свята-Духаўскай царкве ў Віцебску [1, с. 135]. У ходзе раскопак на полацкім гарадзішчы на адным касцяку быў знойдзены шкляны чорны гузік, на другім – адзін шкляны чорны і два шкляных белых гузіка [12]. Спражка была выяўлена ў час раскопак познесярэднявечнага кургана ў в. Кузьмаўшчына Браслаўскага раёна [16, с. 77]. У пахаванні на могілках у Гарадку знойдзена невялікая бронзавая спражка з касымі насечкамі [1, с. 133]. Спражачка з імітацыя кальцавога арнаменту была выяўлена на могільніку Новы Болецк Гарадоцкага раёна [1, с. 136]. Тры бронзавыя засцёжкі зафіксаваныя на двух касцяках могільніка на полацкім гарадзішчы: на адным – пад ніжняй сківіцай, на другім – пад ніжняй сківіцай і на ўнутраным баку лакцявога сустава [12]. Дзве аналагічныя засцёжкі выяўлены ў двух пахаваннях на могільніку каля в. Дубраўка Гарадоцкага р-на ў 2014 г.

Колькасць знойдзеных ювелірных упрыгожанняў меншая. Гэта пярсцёнак з устаўкай з каляровага металу з могільніка ў Гарадку, фрагменты дротавага кручанага пярсцёнка, бронзавага літога арнаментаванага бранзалета, завушніца ў выглядзе пытальніка і падвеска з уключаным у яе крыжам з Новага Болецка [1, с. 133, 136]. Пярсцёнкі і завушніцы былі знойдзены пры раскопках у віцебскай царкве Благавешчання і на могілках каля яе [1, с. 224]. Вузкапласцінчаты пярсцёнак 14-15(17) ст. з двайным рыфленнем з медзі або бронзы быў выяўлены ў пахаванні каля в. Івесь.

Завушніца таксама знойдзена ў пахаванні каля царквы Ражаства Багародзіцы ў Віцебску [29]. Завушніцы XIV – пачатку XVI стст. у выглядзе кола з трыма прымацаванымі да яго стрыжанькамі, на якіх замацаваны касцяныя падвескі, знойдзена ў жальнічнай магіле каля в. Бірулі Докшыцкага раёна. Дзве завушніцы з дзіцячага пахавання 2013-5 былі выяўлены на могільніку каля в. Івесь. Завушніцы зроблены з меднага або бронзавага дроту і маюць выгляд пытальніка. Адна завушніца мае пашкоджаную пятлю. Рэштkaў прывесак не выяўлена, хаця наяўнасць пятлі кажа аб іх іх магчымай першапачатковай прысутнасці. Датуюцца XV–XVI стст.

Прадметы хрысціянскага культа прадстаўлены пераважна нацельнымі крыжамі. Бронзавы крыжык быў знойдзены ў познесярэднявечным курганным пахаванні ў в. Кузьмаўшчына Браслаўскага раёна [1, с. 125; 16, с. 77]. Нацельны крыжык выяўлены ў пахаванні каля меркаванай віцебскай Нікольскай царквы побач са згаданым фрагментам тканіны [25, с. 7]. Фрагмент крыжыка знойдзены пры археалагічных раскопках могільніка ў Гарадку [1, с. С. 133]. Два алавяных нацельных крыжа знойдзена ў пахаваннях на полацкім гарадзішчы. Адзін з іх быў моцна каразіраваны і практычна распаўся пры расчытцы, другі захаваўся лепш. На яго аверсе змешчана сцэна распяцця, на рэверсе – лацінскі надпіс «laureatus» («увенчаны лаўровым вянком») [12]. Алавянны крыжык выяўлены ў пахаванні на могільніку Туржэц-2 [9, с. 264]. Аналагічны крыжык выяўлены на могільніку каля в. Дубраўка. Улічваючы стан нацельных алавяных крыжыкаў, можна меркаваць, што ў шэрагу іншых выпадкаў яны маглі мець месца, аднак не захаваліся.

Нацельныя крыжы выяўлены ў пахаваннях у царкве Благавешчання ў Віцебску. Там жа знойдзена распяцце з абрэвіятурай «INRI» («Iesus nasarenus rex Iudaeorum» – «Ісус

назарэцянін, цар Іўдзейскі») [1, с. 245]. Распяцце знойдзена таксама ў перапахаваннях у сутарэннях полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы знойдзена распяцце [11]. Да адзінкавых знаходак адносіцца выяўлены ў ходзе раскопак могілак на полацкім гарадзішчы бронзавы медальён з выявай біблейскіх сцэн (аверс) і Дзевы Марыі з немаўлём (рэверс) [12].

Да прадметаў, што мелі дачыненне да хрысціянскага культа, адносяцца і пацеркі ад ружанца. Такія знаходкі выяўлены ў пахаваннях у віцебскай царкве Благавешчання, у Гарадку і на могільніку Турджэц. Так, у Гарадку было знойдзена 21 цэлая і 7 фрагментаў сініх і чорных шкляных пацерак [1, с. 133]. Пахаванне на могільніку Турджэц утрымлівала пацеркі-бісерыны ў колькасці 116 штук, а таксама 4 цёмна-сінія, 1 белую і 1 чорную пацеркі [9, с. 264].

Манеты не з'яўляюцца рэдкімі знаходкамі ў пахаваннях XVI – XVIII стагоддзяў. Білонавы солід пачатку XVI ст. быў выяўлены у ходзе раскопак на могілках каля Старога Лепеля [41]. Познесярэднявечны курган з манетай 1566 г. знаходзіўся каля в. Кузьмаўшчына Браслаўскага раёна. Солід 1664 г. выяўлены ў пахаваннях віцебскай Благавешчанскай царквы. У в. Веляшковічы Лёзненскага раёна разам з пахаваннямі былі знойдзены сярэбраныя і медныя манеты. Медная манета дрэннай захаванасці была выяўлена пад час раскопак у Гарадку. Манета Міхаіла Фёдаравіча першай паловы XVII стагоддзя знойдзена побач з каменным крыжам каля Ветрына [1, с. 125, 128, 133; Семянтоўскі, с. 27-28].

Аб звычаі класці ў пахаванне манеты паведамляюць этнографы XIX ст. М.Ф. Нікіфароўскі і П.В. Шэйн. Яны ж адзначылі, што пры капанні магіл на старых вясковых могілках нярэдка знаходзілі прылады працы: сякеры, долаты, свердзелы [46, с. 521]. Археалагічныя даследаванні гэтага не пацвярджаюць.

Асабістыя рэчы сярод знаходак сустракаюцца рэдка. Гэта крэсіва і кавалкі крэменя з познесярэднявечнага кургана каля в. Кузьмаўшчына Браслаўскага раёна, а таксама кавалкі крэменя і «жалезны трохграневы напільнік» (таксама крэсіва?) з кургана каля в. Крывец Лепельскага раёна [16, с. 77; Семянтоўскі, с. 27-28]. Абламаны жалезны ключык і кавалак нейкай жалезнай рэчы знойдзены ў пахаванні каля в. Чурылава Міёрскага раёна [16].

У ролі пахавальнага інвентару мог выступаць посуд. Фрагменты глінянага гаршка знойдзены ў пахаванні каля в. Кузьмаўшчына Браслаўскага раёна [16, с. 77]. Фрагменты познесярэднявечнай керамікі, у тым ліку венчыкі, выяўлены пры раскопках пахавання на востраве Манастыр возера Несціш у Браслаўскім раёне [14, с. 20]. Кераміка была зафіксавана пры раскопках могільніка Новы Болецк Гарадоцкага раёна [1, с. 136]. Вялікая колькасць керамікі знойдзена пры раскопках познесярэднявечных курганоў каля вв. Чамяры і Чурылава Міёрскага раёна [16, с. 78]. Кераміка выяўлена пры раскопках на полацкім гарадзішчы [12]. Пры будаўнічых работах у в. Веляшковічы Лёзненскага раёна былі знойдзены сасуды, падобныя на бакалы [38, с. 28]. Бронзавы кубак быў выяўлены ў пахаванні ў царкве Благавешчання ў Віцебску [1, с. 245].

Т.ч., вынікі нашых археалагічных даследаванняў пацвярджаюць раней зробленую выснову аб рэдкай наяўнасці інвентара ў пахаваннях Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. Разам з тым, выяўленыя асобныя знаходкі з'яўляюцца тым больш каштоўнымі. Перспектыўным уяўляецца аналіз карэляцыі наяўнасці інвентара з полам, узростам пахаваных і канструктыўнымі асаблівасцямі магільнага збудавання.



PolotskSU

PolotskSU

# 4 ЭЛЕМЕНТЫ ПАХАВАЛЬНЫ АБРАДА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.

Нараджэнне, шлюб, смерць – з такіх ключавых момантаў складаецца паўнавартаснае жыццё ва ўяўленні прадстаўнікоў кожнага грамадства, у тым ліку беларускага. Адхіленне ад гэтай схемы або штучная карэкцыя яе натуральных часавых рамак (нежаданне браць шлюб увогуле ці ў аптымальны тэрмін, самагубства) лічыліся вельмі непажаданымі [52, с. 567-568]. Непазбежнасць смерці добра ўсведамлялася: “Усё можа мінуць, толькі смерць не пераміне”, “Усякага адно магіла прыгорне” [Federowski, s. 174, 305]. Этнаграфічныя назіранні дазваляюць меркаваць аб старажытным паходжанні такіх элементаў пахавальнага абраду, як абмыванне нябожчыка, галашэнні, наяўнасць пэўнага парадку вынасу труны [3, с. 451].

“Да смерці сяляне нашы адносяцца абыякава. Калі хто-небудзь захварэе, муж або жонка..., убачыўшы хворага, запытае абавязкова: “А што ж ты... паміраць хочаш”? На гэта хворы ці хворая звычайна адказваюць наступным чынам: Ад смерці нідзе не схаваешься... да і не адкупішся”, – адзначае П.В. Шэйн [63, с. 89].

Чалавек традыцыйнай культуры ўспрымаў сваё існаванне як жыццё ў двух паралельных вымярэннях: звычайным (“прафанным”) з лінейным часам, старэннем і смерцю, і міфалагічным (“сакральным”), дзе часу не было і куды можна было патрапіць толькі пры ўмове выканання пэўных абрадаў [12, с. 551]. Пасля смерці ў адносінах да памерлага ажыццяўлялася сукупнасць рэгламентаваных дзеянняў, што складалі пахавальны абрад, або пахавальны рытуал. Ён ахопліваў час ад моманту смерці чалавека да пахавання яго на могілках. Пахавальны рытуал, па-першае, павінен быў забяспечыць нябожчыку аптымальнае існаванне ў іншым свеце, па-другое, – меў на мэце засцерагчы жывых ад шкоды з боку памерлага [1]. Такім чынам, па народных уяўленнях, існаванне чалавека ў іншасвеце непасрэдна залежала ад дакладнага, нават скрупулёзнага выканання абрадавых дзеянняў. На гэта звярнуў увагу М.Я. Нікіфароўскі: “За рэдкім выключэннем, паміраючы робіць сваі вусныя завяшчанні з падрабязнасцю, якая дзівіць, прычым... увага будзе звернута на акалічнасці і абставіны пахавання, якое мае быць” [62, с. 510]. Падобна на тое, што паміраючы імкнуўся на ўсялякі выпадак нагадаць родным паслядоўнасць рытуальных дзеянняў, бо клапаціўся аб уласным лёсе пасля смерці. Згодна з тым жа паведамленнем, беларус сярэдняга ўзросту, асабліва жанчына, “запасае “смертную” рубаху”, а старыя людзі – і труну [62, с. 510]. І ў гэтым выпадку клопат аб пасмяротным існаванні відавочны.

Паколькі смерць разглядалася як натуральная з’ява, калі ў сям’і бачылі, што стары ці хворы чалавек памірае, блізкія яму людзі імкнуліся аказаць садзеянне ў больш лёгкай смерці з дапамогай традыцыйных рытуалаў (“дапамагалі душы больш лёгка адысці ад цела”) [58, с. 358]. Вось як тлумачылі гэта на Падзвінні: “А пірабіваць жа смерць нільзя. Еслі пірабіў чалавеку смерць, ён суткі мучаіцца страшна” [57, с. 153]. На Беларусі пры цяжкай канчыне хворага пераносілі на падлогу, клалі на салому ці сена. У Паўночнай Беларусі адзвінні такога чалавека клалі на кажух, што ляжаў на на падлозе [58, с. 358]. Такім чынам, чалавек перамяшчаўся ў ніжэйжы ярус светабудовы. У некаторых выпадках, як гэта сведчаць палявыя запісы з Беларускага Падзвіння, людзі ўсведамлялі свой пераходны статус: “А вот памірала мая баба, ёй ужо плоха стала... Ляжыць на пасцелі і гаворыць: “А цяпер сцяліця палушубак, лажыце міне на зямлю” [57, с. 155]. Падчасканання хвораму давалі ў рукі грамнічную свечку, каб агонь асвятляў паміраючаму дарогу ў іншы свет да моманту смерці. Калі чалавек, сканаўшы, утрымліваў яе ў руках, разумелася, што ён памёр праведнікам [6, с. 125].

Заплюшчыць вочы нябожчыку абавязкова павінны былі родныя. Лічылася, што пакуль вочы застаюцца адкрытымі, нябожчык “выглядае” таго, хто памрэ наступным. Родныя таксама павінны былі імкнуцца “папярэдзіць усякае магчымае скажэнне” цела памерлага з-за яго зацвердзявання [62, с. 518].

Як адзначалася, пахавальны рытуал павінен быў забяспечыць нябожчыку “камфортнае” існаванне ў іншасвеце, а жывым – абарону ад непажаданых дзеянняў з боку памерлага, бо фізічная смерць не была тоеснай смерці сацыяльнай. Мэтай пахавальнага рытуалу быў сімвалічны перавод памерлага ў іншасвет. Рабіць гэта належыла з максімальнай павагай, каб нябожчык не пакрыўдзіўся і не пачаў помсціць. Таму родныя не займаліся абмываннем, апрананнем і іншымі дзеяннямі, звязанымі з пазбаўленнем ад цела – гэта рабілі “іншыя асобы” [4, с. 101; 48, с. 49; 62, с. 511]. Родныя павінны былі выказаць максімум павагі. Лічылася, што чужым людзям нябожчык помсціць не будзе. Родныя, наадварот, галасілі і плакалі (“вылі”). Гэтая натуральная рэакцыя на смерць блізкага чалавека да таго ж паказвала апошняму, як моцна яго любілі [48, с. 49].

Пахавальны рытуал працягваўся, звычайна, тры дні [57, с. 155; 58, с. 356]. Хрысціянскае тлумачэнне звяртае ўвагу на тое, што цела Ісуса Хрыста знікла на трэці дзень пасля яго распяцця. Таму і цела памёршага чалавека мусіць быць пахавана на трэці дзень [58, с. 356]. Паколькі лік “тры” фігуруе ў многіх архаічных абрадах, у тым ліку пахавальных і памінальных, мэтазгодна разглядзець гэтае пытанне больш падрабязна [21, с. 506].

Няцотнасць у лічбавай сімволіцы беларусаў увогуле адлюстроўвала сярод іншага смерць. У пачатку XIX ст. на Полаччыне на Дзяды (Дзмітраўскую суботу) гаспадары тройчы на каленях абпаўзалі вакол стала з ежай [21, с. 506]. Памінальны стол (трацiны (ізноў “тры”), дзевяціны (тройчы па “тры”), саракавіны, угодкі) пачыналіся з таго, што па кругу пускаліся тры спецыяльныя рытуальныя стравы, якія кожны з прысутных мусіў тройчы пакаштаваць [36, с. 346-347; 22, с. 138]. На жалобным стале дазвалялася выпіць толькі тры чаркі; у час вынасу труны з хаты яе тройчы апускалі на парог; калі труну апусцілі ў магілу, прысутныя (акрамя блізкай радні) кідалі ў магілу па тры жменькі зямлі; на дзевяціны звычайна запрашалі дзевяць чалавек; пасля году святы ўшанавання памерлых адзначаліся ў трэцюю суботу пасля Пакроваў (Восеньскія Дзяды) і на дзевяты дзень пасля Вялікадня (Радаўніца) [36, с. 347].

Непасрэдная хрысціянская інтэрпрэтацыя ліку “тры” не абавязкова будзе слушнай. Уплыў хрысціянства тут можа разглядацца хутчэй не як прамы, а як ускосны, прычым па двух напрамках. Па-першае, ідэя трыадзінства Бога зрабіла моцны ўплыў на трактоўку няцотнасці і асабліва на лічбу “тры”. Лік атрымаў амбівалентны характар і ў магічна-абрадавай практыцы набыў рысы гармоніі і прадукавальную накіраванасць [36, с. 347-348]. Аднак у пахавальнай і памінальнай абраднасці відавочна запатрабаваная якраз архаічная характарыстыка ліку “тры” як апазіцыі цотнасці, дакладней, такія яе аспекты, як нестабільнасць і смерць [36, с. 346]. Па-другое, у першыя стагоддзі хрысціянізацыі безумоўная перавага аддавалася знешнім, эфектным формам, што і лягло ў аснову спалучэння дзвюх рознанапраўленых [32, с. 241-242]. Падаецца, што разгляд ліку “тры” у гэтым кантэксце будзе больш слушным.

У рамках традыцыі, у немалой ступені пад уплывам хрысціянства, трохдзённы тэрмін пахавання стаў абавязковай нормай, якой прытрымліваліся нават тады, калі на пахаванне не мог прыехаць вясковы святар. На Ушаччыне ў спякотнае надвор’е, каб нябожчыка “не разносіла”, у дамавіну або пад яе клалі замкнёны замок (Ушацкі раён) [40, с. 133; 62, с. 513].

На Падзвінні пасля смерці на сорак дзён на акно ставілі шклянку вады, клалі хлеб і соль – верылі, што такі тэрмін нябожчык можа прыходзіць дамой піць або мыцца [58, с. 359; 59, с. 378]. Пасля смерці чалавека пакідалі прыкладна на дзве гадзіны на тым месцы, дзе ён памёр, а потым пачыналі мыць і пераапранаць. Звычайна, рабілі гэта людзі таго ж полу, што і нябожчык [59, с. 379; 62, с. 511]. Абмыванне павінна было ачысціць чалавека ад прыкмет “гэтага” свету, змыць пот, нацельны бруд. Чалавек, такім чынам, вяртаўся ў чысты, прыродны стан. Вада звязвалася з субстанцыяй, у якую вяртаўся чалавек пасля жыццёвага шляху [4, с. 43; 41, с. 156]. У час абмывання забаранялася прысутнасць людзей, якія не былі задзейнічаны ў гэтым працэсе. Акрамя гэтых трох чалавек, ніхто не павінен быў заходзіць у хату. Забарона тым больш тычылася цяжарных жанчын і моладзі, што яшчэ не ўзяла шлюб.

PolotskSU

Згодна з паведамленнем П. Одэрборна, абмыванне працягвалася каля гадзіны [49, с. 176; 58, с. 361; 62, с. 518].

Ваду маглі не проста награваць, але і варыць у ёй розныя зёлкі, якія збіралі на Купалле і якія мелі, на думку насельніцтва, магічныя засцерагальныя функцыі [58, с. 361]. Пасля абмывання вадзе прыпісвалі якасці нежывой, таму вылівалі там, дзе менш за ўсё хадзілі людзі і жывёла – каб выпадкова не прычыніла шкоды. [57, с. 153; 58, с. 361]. Лепш за ўсё было выліць яе пад печ, у хлеў на навоз, каля плота і г.д. [59, с. 380].

Нябожчыка прычэсвалі і апраналі ў чыстае даматканае, пажадана новае адзенне. У выпадку беднасці апошняе патрабаванне магло не вытрымлівацца [58, с. 362; 59, с. 379]. Калі памёршы чалавек не падрыхтаваў такую вопратку сам, яе неадкладна шылі. Адмова пашыць "адзенне на пахаванне" расцэньвалася як няўвага да нябожчыка, што выклікала зразумелы гнеў апошняга. Таму любая швачка, да якой звярталіся сваякі, мусіла выканаць просьбу – "ушыці на мерца". Палатно на адзенне памерламу не рэзалі нажніцамі, а разрывалі рукамі. Сшывалі тканіну ў адну нітку, іголкай ад сябе, забаранялася рабіць вузлы, што адлюстроўвала спецыфічную функцыю вопраткі [55, с. 87; 58, с. 362]. У астатнім адзенне мала чым адрознівалася ад звычайнага святочнага. Звычайна яно было белым [58, с. 362; 59, с. 379; 62, с. 512]. Інакш кажучы, мела натуральны колер адбеленага палатна. Зрэдку ў заможных сем'ях памёршым жанчыне (на галаву) ці мужчыне (на шыю) маглі надзець каляровую хустку [62, с. 512]. Нежанатага хлопца ці незамужнюю жанчыну апраналі так, як пад вянец [58, с. 362]. На Паазер'і маладым жанатым мужчынам і замужнім жанчынам расшпільвалі каўнер сарочкі, каб застаўшыеся ўдава ці ўдавец маглі на гэтым свеце ўступіць у новы шлюб [59, с. 379]. З аналагічнай мэтай пры ўбранні не завязвалі вузлоў, якія сімвалізавалі адзінства, замацаванне [7, с. 96].

Нябожчыку апраналі новыя лапці (зрэдку, у заможных сем'ях – боты або чаравікі), за пазуху клалі хустку-"насавічку". Абавязковым атрыбутам мужчынскага пахавальнага адзення былі шапка і пояс, якія клаліся ў гроб. Мужчыну маглі забяспечваць люлькай, крэмнем з крэсівам, тытунём, а таксама нажом [40, с. 132; 62, с. 512]. Адзенне, у якім чалавек памёр, а таксама прасціну, коўдру, салому, на якой гэта адбылося, спальвалі [58, с. 362]. Пасля апранання нябожчыка клалі на лаўку "ў кут", але не ў покуці, а насупраць дзвярэй. Лаўку засцілалі сенам або саломай, зверху накрывалі посцілкай. Памёршага клалі галавой да абразоў, да грудзей накрывалі палатном [58, с. 362; 62, с. 512].

Адначасова з гэтым адчынялася адтуліна ў сцяне паміж печчу і палацямі (душнік) – калі гэта не было зроблена раней для палягчэння агоніі – і выбіваўся верхні касяк дзвярэй, каб душа нябожчыка магла свабодна выходзіць і вяртацца. За акно, перад якім ляжаў памерлы, вешаўся рушнік для ягоных патрэб [62, с. 513, 520]. Людзі, што прыйшлі наведаць нябожчыка, імкнуліся выказаць смутак аб ім. Жанчыны галасілі. Лічылася, што калі жанчына, прыйшоўшы наведаць нябожчыка, не прагалосіць па ім хоць адно галашэнне, то гэта непавага да памерлага і яго сям'і. Мужчыны пачыналі доўгую размову, падчас якой звярталіся да памёршага з пытаннямі і казалі, што хаця памерлы не жывы, але ўсё добра чуе і разумее, толькі што не можа выказаць думак і пачуццяў [58, с. 366; 62, с. 520].

Бліжэй да вечара родзічы запрашалі "нанач к пакойніку" старэйшых жанчын і мужчын, якія па два-тры чалавекі па чарзе сядзелі каля труны. На Падзвінні "лі пакойніка сядзелі старушкі, пелі. Ну, вопшчэм, чыталі малітвы такія... пелі іх па-кніжнаму" [57, с. 154; 58, с. 366]. Нябожчыка ніколі не пакідалі аднаго [58, с. 366]. Верылі, што калі нябожчык не пераначуе ў сваёй хаце хаця б адзін раз, то будзе ўвесь час прыходзіць ноччу да сваёй сям'і, сядзібы і палохаць жывых [59, с. 383].

З распаўсюджаннем хрысціянства пахавальная абраднасць, як і сямейная абраднасць наогул, пачала ў значнай ступені рэгламентавацца царкоўнымі канонамі, рытуаламі, службамі. Над памерлым пачалі чытаць псалтыр, адпяваць са святаром, ставіць крыжы на магілах [13, с. 386-387]. У большай ступені гэта закранула горад, чым вёску. П. Одэборн паведамляе аб удзеле ў пахаванні "шкаляроў" (якія спявалі жалобныя песні падчас пахавання) і некалькіх святароў [49, с. 176]. На вёсцы да святара звярталіся, калі царква

знаходілася непадалёку. Пасля таго, як чалавек паміраў, старэйшы ў сям'і адпраўляўся туды, па дарозе апавядаючы аднавяскоўцам аб няшчасці. Там ён дамаўляўся з "пісалтырнікам", у Віцебскім і Себежскім паветах было таксама прынята на час браць у царкве крыж, харугву ("прачэсіну") і званочак. На зваротнай дарозе часта заходзілі ў суседнюю вёску ці карчму – паведаміць родным і знаёмым. Таму вярталіся, звычайна, калі ўжо цямнела [9, с. 270; 62, с. 508].

Пасля таго, як гаспадары кармілі прыйшоўшага чалавека (адбывалася гэта ў сенях), ён прыступаў да чытання псалтыра. Харугву ставілі на вуліцы побач з акном, пад якім ляжаў нябожчык, крыж – каля яго галавы. Чытанне павінна было адбывацца да поўначы. Побач сядзелі "некалькі аматараў псалтырнага чытання", якія па чарзе трымалі лучыну, калі сродкі не дазвалялі паліць свечку. Пасля чытання і неабходных малітваў дзячку давалі адпачыць некалькі гадзін [62, с. 509]. Ноччу маліліся, узгадвалі і расказвалі выпадкі з жыцця нябожчыка, ягоных продкаў, размаўлялі аб смерці і "тым свеце". У начны час у хаце нічога не рабілі, забаранялася таксама плакаць і галасіць [58, с. 367]. Гэта датычылася не толькі першай, але і другой ночы. Сэнс гэтай забароны дакладна невядомы. У Шаркаўшчынскім раёне зафіксавана павер'е, паводле якога плакаць нельга, таму што нябожчыку "мокра" на тым свеце, ён "тоне" ў слязах [59, с. 383].

На жаль, другі том шматтомнага выдання "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" [59], адкуль узятая гэта інфармацыя, утрымлівае не само павер'е, а толькі яго пераказ, магчыма, няпоўны, што не дазваляе рабіць высновы з вялікай доляй верагоднасці. Аднак справа выглядае больш складанай. Па-першае, не зразумела, чаму павер'е адлюстроўвае наступствы менавіта начнога плачу. Хіба ад плачу днём бывае менш слёз? Або яны не такія "шкодныя" для памерлага? Па-другое, калі справа ў слязах, то чаму нельга галасіць? Па-трэцяе, чаму аналагічных павер'яў больш нідзе не зафіксавана і ці прычына гэтага тое, што сэнс гэтай забароны ўжо паўсюдна забыты?

Вядома, што праваслаўная царква непрыхільна ставілася да народных плачаў і галашэнняў, расцэньваючы іх як адсутнасць хрысціянскай веры ў бессмяротнасць душы. У Расіі Пётр I нават выдаў спецыяльны ўказ з забаронай плакаць падчас пахарон. У рускіх народных рэлігійных расказах маляўніча паказваліся наступствы плачу маці па памёршым дзецям, якія нібыта вымушаны насіць мяцярынскія слёзы ў цяжкіх вёдрах або сядзець у балоце [5, с. 353; 34, с. 254]. Вельмі падобна на "тонучага" нябожчыка. Магчыма, тлумачэнне, зафіксаванае на Беларускім Паазер'і, адлюстроўвае якраз афіцыйную версію забароны, да таго ж уведзеную пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, таму аналагічныя павер'і больш нідзе не зафіксаваныя? У кожным выпадку, падаецца, што забарона плакаць і галасіць ноччу павінна мець нейкае больш старажытнае абгрунтаванне, на жаль, невядомае.

На наступны дзень рабілася труна (звычайна, наконт гэтага дамаўляліся адразу ў першы дзень). Яе можна было рабіць і ў дзень пахавання. "Гэта няважна калі, могуць дайжа, кагда яго на кладбішча нада везці, на трэцій дзень" – казалі на Віцебшчыне [57, с. 152; 58, с. 364]. У беларускім пахавальным абрадзе слова "труна" амаль не ўжываецца. Замест выкарыстоўваюцца такія сінонімы, як "хата", "хатка", "хатанька", "даміначка", "дамочак", "свяцёлачка", "сялібачка" і іншыя назвы, якія падкрэслівалі, што труна – месца жыхарства памерлага [58, с. 365].

На выраб дамавіны кожны гаспадар захоўваў у сядзібе дошкі і брускі. Падыходзячым матэрыялам лічылася драўніна елкі ці сасны. Труну, а таксама крыж, рабілі на двары памёршага. Калі ў гаспадарцы была сівая карова (вол) або чорны певень, дамавіну рабілі ў іншым месцы, звычайна, у суседзяў [40, с. 132; 58, с. 364; 59, с. 380]. Да вырабу труны падыходзілі адказна, бо яна расцэньвалася як жытло нябожчыка: "хатка новенькая, харошанькая, толькі цесненькая, нявідненькая ды халодненькая", "не вясёлая", "цёмная" [40, с. 132].



PolotskSU

Ва ўяўленні беларусаў нябожчык адчуваў пэўны дыскамфорт, які трэба было па меншай меры не павялічваць абы-як зробленай дамавінай, таму труну павінны рабіць адказна.

Чаму матэрыялам служыла яловая або сасновая драўніна? Елка ў балта-славянскай традыцыі ўспрымалася як дрэва, звязанае са светам памерлых. Яе вечная зеляніна асацыявалася з вечнасцю жыцця [45, с. 159]. Гэтае тлумачэнне магчыма прыняць як дадатковае. Больш актуальным, напэўна, варта лічыць практычны разлік. Звернем увагу на паведамленне М.Ф. Нікіфароўскага: "Правал магільнага насыпа часам прымалі за доказ, што нябожчык займаўся "чараўніцтвам" і што яго несупакоеная душа вяртаецца да цела дзеля асаблівых пакут; часам гэта жа служыло ўказаннем на хуткую смерць сваяка" [62, с. 517]. Значыць, родныя былі зацікаўлены ў прадухіленні правала магільнага насыпу. Праваліцца ён можа ў выпадку, калі не вытрымае крышка дамавіны, напрыклад, калі труна зроблена сяк-так або калі дрэва згніе. І елка, і сасна доўга не гніюць, бо маюць смалістую драўніну. Акрамя таго, Падзвінне багата на елкі і сосны.

Калі пазітыўны кантакт жывых з памерлымі на анімістычным узроўні быў непазбежным і ўспрымаўся нармальна, дык цела памёршага павінна было жыць у гэтай "хаце"-дамавіне, з якой няма выхаду ("без акон, без дзвярэй зроблену"), што мусіла гарантаваць неўмяшальніцтва нябожчыка, дакладней, ягонай фізічнай іпастасі, у справы жывых [40, с. 132].

Труну забаранялася рабіць не толькі сваякам памерлага (аб чым ужо казалася), але і ўдаўцам і бяздзетным мужчынам. Лічылася, што такая "хата" для нябожчыка была б нешчаслівай, а людзі, якія рабілі яе, згубілі б магчымасць ажаніцца і мець дзяцей. Выраб дамавіны быў справай адказнай, яна павінна была быць "камфортнай", каб задаволіць "гаспадара". Аднак у Віцебскай і Магілёўскай губернях зафіксаваны выраб труны з кепска або нават зусім не габляваных ("абы якіх") дошак. Адмысловая недаробленасць надавала дамавіне прамежкавы статус паміж светам жывых і светам памёршых [40, с. 132; 59, с. 380].

На працягу вырабу труны каля яе і каля нябожчыка павінны былі гучаць галашэнні. Яны мелі дзве функцыі – задобрыць нябожчыка і ачысціць прастору ад злых сіл [59, с. 380]. Калі гатовую дамавіну неслі ў хату памерлага, непажаданай лічылася сустрэча і тым больш размова з кім-небудзь. Пры сустрэчы з цяжарнай жанчынай работнікі клалі труну на зямлю і прымушалі жанчыну тройчы задам абысці яе, каб засцерагчы дзіця ад магчымай смерці [40, с. 132-133].

Калі запрашалі святара, ён акрапляў дамавіну святой вадой, у адваротным выпадку рабілі гэта самі. Пасля труну знізу ўсцілалі рэшткамі стружак і трэсак, што заставаліся ад габлявання, галінкамі бярозавых венікаў, сенам, асвечанымі зёлкамі і засцілалі палатном. Стружкі і трэскі, што засталіся пасля вырабу труны, абавязкова патрэбна было пакласці ў дамавіну або набіць імі падушку для нябожчыка ці спаліць. Нават адна трэска, што засталася ў хаце, магла прывесці да чарговай смерці [40, с. 132; 57, с. 153; 58, с. 364; 59, с. 380].

Падушку можна было набіваць стружкамі і трэскамі ад труны, але звычайна выкарыстоўвалася сухое бярозавае лісце. Наконт гэтага на Беларускім Падзвінні існавала адмысловае ўяўленне: "Падушку напіхаць пер'ем пакойніку нільзя. Чалавек жа ж гніець, будзе там жа мокрае, я буду ўся ў пер'і ляжаць. А нада венікі шмактаць, такія, што парацца... Нада харашо шмактаць... Усе раньшэ так дзелалі, галінкі абшмактаюць і паложаць у навалачку. Ну, лісцікі еты толькі" [57, с. 152-153; 59, с. 380].

Чаму выкарыстоўвалася менавіта бярозавае лісце? Па-першае, тут адлюстроўваліся выключна прагматычныя меркаванні. Бярозавы венік выкарыстоўваўся ў лазні, а таму ў любую пару года яго заўсёды магчыма было знайсці ў гаспадарцы: "У міне вісяць пары тры [венікаў], у баню йшчэ іх не брала. І тады, як памру, пажалыйста, абшмакчыця, усыпце і паложце"; або "У міне вісяць чатыры веніка, як памру, тады абшмактаюць, усыплюць і паложаць" [57, с. 153]. Венік для лазні, такім чынам, мог успрымацца ці не як рэч на выпадак смерці. Па-другое, бяроза ў міфапаэтычнай мадэлі свету выступае як медыятар паміж светам жывых і светам памерлых [35, с. 56]. Сухое, мёртвае лісце павінна было добра

суадносіцца з тым, для чаго ў дадзеным выпадку выкарыстоўвалася – служыць патрэбам нябожчыка. Дарэчы, бярозавае лісце было знойдзена падчас археалагічных раскопак на эстонскіх могілках сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. (там было прынята класці венік у труну – або для патрэб нябожчыка, або гэткім чынам пазбаўляліся ад веніка, з дапамогай якога яго абмывалі) [68, s. 147].

Зробленую і асвечаную труну нельга было ні на хвіліну пакідаць пустой або без нагляду, каб не забраўся "нячысты", які здольны апаганіць тагасветнае жыццё памерлага або авалодаць яго целам. Таму, убраўшы дамавіну, у яе адразу пераносілі цела памёршага [40, с. 133; 58, с. 364]. У труну клалі "долю" нябожчыка. У такой якасці маглі выступаць хлеб, збожжа, бліны, каша, а таксама гарэлка [40, с. 132; 58, с. 364]. Апошняе, як паведамляе М.Я. Нікіфароўскі, у XIX ст. ужо ўспрымалася сялянамі як анахранізм [62, с. 517].

Труну з целам ставілі на лаўку: "У нас, у каталікоў, кладуць сярод хаты і ў праваслаўных тожа пасярод..." [59, с. 381]. Тут труна знаходзілася да пахавання. Дагэтуль у асяроддзі сельскіх жыхароў Падзвіння захоўваецца ўяўленне аб нятоеснасці паняццяў "плакаць" і "галасіць": "Плакаць – гэта плакаць без слоў, а галасіць – гэта бальшое гора, крычаць словамі нада крэпка" [59, с. 382]. Адрозніваецца "красівае" і "некрасівае" галашэнне: "Красівае галашэнне – гэта штоб і прычытваў чалавек складна і голас харошы. А можна і без голаса, толька штоб харошае гаварыў пра етава чалавека" [59, с. 382]. Казалі наступнае: "Як галосіш ад шчырасці, тады заўсёды некрасіва" [59, с. 382]. У заходніх раёнах Падзвіння памятаюць, што некалі для галашэнняў наймалі спецыяльных плакальшчыц: "Галасіць – гэта ні кажды можыць. Эта можыць арціст, плакальшчыца, а каму па-настаяшчыму жалка, той будзіць плакаць і ўсё, патаму што слоў нет, ні ўздумаіш этыя слава ат гора. А плакальшчыцы ні так жалка, ні свайго жа хароніць, таму і словы ў яе ідуць" [59, с. 382].

Такім чынам, пасля смерці чалавека родныя і аднавяскоўцы прыступалі да выканання пахавальнага рытуалу, што меў на мэце падрыхтаваць нябожчыка да аптымальнага ўваходжання ў "іншы" свет і абараніць жывых ад магчымых дэструктыўных дзеянняў з боку памерлага. Таму члены сям'і павінны былі ўсяляк дэманстраваць смутак з-за таго, што нябожчык пайшоў з жыцця (што і так было натуральнай рэакцыяй на смерць блізкага чалавека). Ім забаранялася ўдзельнічаць у працэсах, што мелі на мэце выдаліць цела памёршага з хаты і пахаваць яго – каб нябожчык не пакрыўдзіўся на жаданне ад яго пазбавіцца. Затое падобныя дзеянні можна было рабіць неродзічам. Таму яны ўдзельнічалі ў абмыванні, апрананні памерлага, вырабе труны. Пры гэтым суседзі павінны былі таксама выказваць шкадаванне з прычыны смерці чалавека. Першыя этапы пахавальнага рытуалу ўключалі рэгламентаваныя дзеянні наконт арганізацыі абмывання, апранання нябожчыка, галашэння над ім, вырабу дамавіны. Існавалі пэўныя строгія патрабаванні да вопраткі, труны. Дакладнае іх выкананне павінна было забяспечыць нябожчыку "камфортнае" існаванне ў іншасвеце, а жывым – гэткае ж жыццё ў гэтым свеце. Гэта служыла моцным стымулам як для родных, так і для аднавяскоўцаў. Пэўны ўнёсак у справу ўласнага пахавання чалавек рабіў пры жыцці (рыхтуючы адмысловае адзенне, дошкі на труну, выказваючы апошнія пажаданні).

На Падзвінні, як і паўсюдна на Беларусі, нябожчыка хавалі на трэці дзень пасля абеду [58, с. 153, 155; 59, с. 383]. Труну выносілі з хаты чужыя людзі – зноў-такі, каб памерлы не злаваўся на сям'ю за тое, што ад яго пазбаўляюцца. У былым Віцебскім павеце, як толькі паднімалі труну для вынасу, на тое месца клалі хлеб і соль. Выносячы труну, тройчы стукалі ёю аб ганак або парог, каб нябожчык не вяртаўся дадому ў невызначаны час і не турбаваў сям'ю [13, с. 359; 58, с. 369]. Тлумачылі гэта неабходнасцю канчатковага "вытрасання" душы памёршага з цела або "вытрасаннем" непаразуменняў, што засталіся невырашанымі паміж нябожчыкам і сваякамі. Сімвалічна гэта дзеянне азначала размыканне мяжы "свайго" свету, дзякуючы чаму пахавальнае шэсце атрымлівала магчымасць нібы перамясціцца ў свет памерлых для ажыццяўлення пахавання [41, с. 157].

PolotskSU

У час вынасу памёршага яго абсявалі зернем. Выкарыстанне зерня і хлеба ў пахавальных абрадах мае мэтай аддаць памерламу яго долю. У адваротным выпадку пакрыўджаны нябожчык забярэ яе сам, прычым далёка не ў такой досыць сціплай колькасці (“каб усё багатства з хаты ня вынеслі”) [59, с. 384]. Хлеб, у разуменні земляроба, – гэта жыццё. Можна параўнаць словы “жыта” і “жыць”. Праводзячы ў апошні шлях родзіча з “хлебам-соллю”, людзі верылі і спадзяваліся на яго спрыянне і дапамогу ў дамашняй гаспадарцы, добры ўраджай, увогуле спрыянне ўсім справам [58, с. 369]. Адначасова лічылася, што птушкі, якія з’ядуць зерне, памянуць такім чынам памерлага [59, с. 384].

Труну з нябожчыкам абавязкова ставілі на некалькі хвілін на зэдлікі на двары, асабліва калі памёр гаспадар. Яму давалі магчымасць развітацца з сядзібай. Тыя, хто не ішоў на могілкі, развітваліся з ім тут. Як выносілі труну, абавязкова падымалі на ногі ўсю скаціну ў хлявах, “каб яна вялася” [58, с. 370; 59, с. 384]. Пасля дамавіну пераносілі на падрыхтаваную цялегу або сані, што стаялі пасярод двара. Пад труну падкладвалі кавалак палатна, замацоўвалі яе вожжамі, наверх клалі хлеб і соль. Для нагляду пакідалі некалькі чалавек, астатнія ішлі назад у хату – “править стол” [62, с. 513]. Той, хто затым вёў каня, абедаў каля дамавіны, прычым стравы ставіліся якраз на яе. Ежа падавалася яму адначасова з тымі, хто абедаў у хаце [62, с. 520].

Гэтая частка рытуалу магла спраўляцця як да пахавання, так і пасля яго. Згодна з назіраннямі М.Ф. Нікіфароўскага, калі могілкі знаходзіліся недалёка ад вёскі, то памінкі адбываліся пасля пахавання, калі далёка – то перад ім [62, с. 520]. Два паведамленні даследчыка, змешчаныя ў зборніку П. Шэйна, апісваюць памінкі, што адбываліся перад пахаваннем [62]. З іншага боку, у сучасных працах, здаецца, магчымасць такога варыянту не ўпамінаецца [57; 59]. Магчыма, справа ў тым, што могілкі звычайна знаходзіліся недалёка ад вёскі?

Працэдура магла працягвацца ад двух да чатырох гадзін. Калі хата была цеснай, абед адбываўся ў некалькі змен – спачатку для гаспадароў, родных і паважаных людзей, потым – для суседзяў, затым – для бедных людзей і жабракоў. Калі запрашаўся святар, то ён прысутнічаў на ўсіх трох зменах. Частавалі гаспадары. Калі яны садзіліся за стол у апошняй змене, гэта лічылася вялікім гонарам для нябожчыка і яго сям’і. Калі хата была прасторнай, усе сядалі за адзін стол адначасова, вытрымліваючы парадак старшынства [62, с. 513].

Сярод памінальных страў былі куцця з мёдам (пры яго недахопе выкарыстоўвалася сметанковае масла або алей), клёцкі з салам, бліны і каша. Пачатку памінання папярэднічала чарка гарэлкі, якую гаспадары падносілі кожнаму госцю. Перш, чым выпіць, хрысціліся, успаміналі добрыя рысы нябожчыка і прасілі Бога адправіць ягоную душу ў рай [62, с. 514].

Адначасова кармілі каня, які павінен быў везці дамавіну, прычым лепш, чым звычайна. У Віцебскай губерніі ў кожнай вёсцы трымалі спецыяльна каня, на якім адвозілі толькі нябожчыкаў. У Себежскім павеце для гэтага выкарыстоўвалі таго каня, якога памёршы больш любіў пры жыцці, і кланяліся яму да зямлі. У Лепельскім павеце гаспадар павінен быў цалаваць капыты як гэтага, так і іншых сваіх коней. Запрагалі за некалькі хвілін да адпраўлення з двара. Да дугі і замест павадоў да аброці каня, які вёз памёршага, прывязвалі ручнік ці пояс, за які вялі яго да могілак [62, с. 515, 522].

Ручнік як адзін з атрыбутаў пахавальнага абраду меў у дадзеным выпадку рытуальна-сімвалічнае значэнне. У народнай міфалогіі белы ручнік з вышыўкай па канцах адлюстроўваў трохпрасторавае ўяўленне светабудовы: правая вышываная частка – гэта надземная прастора, неба, сярэдняя белая частка – зямная прастора, “белы свет”, левая вышываная частка – “той свет”, свет продкаў. Згодна з такой сімволікай ручніка, яго белае поле адлюстроўвала зямное жыццё кожнага чалавека і адначасова мяжу паміж светам, які існаваў да нараджэння чалавека, і замагільным светам, у які ён трапіць пасля смерці. У пахавальным абрадзе такая мяжа набывала сімвалічны сэнс дарогі, што вядзе з вечнасці праз жыццё зноў у вечнасць. У пахавальным рытуале ручнік, за які вялі каня да месца пахавання, адлюстроўваў сімвалічную прысутнасць гэтай дарогі. Выкарыстанне яго замест павадоў, якія

PolotskSU

вядучы нібыта нёс наперадзе каня, увасабляла рытуальнае шэсце ў іншы свет: спераду каня атрымлівалася сімвалічная дарога, па якой ён вёз труну з памёршым [57, с. 58-59].

Па праваслаўнай традыцыі труну везлі адкрытай. Толькі калі ішоў моцны дождж або снег, яе прыкрывалі крышкай. Паводле каталіцкай традыцыі, труна мусіла быць закрытай [59, с. 385]. Калі ў вёсцы была царква, пахавальная працэсія спачатку накіроўвалася да яе. Там спраўлялася паніхіда, пасля якой рухаліся да могілак. У Гарадоцкім павеце, калі нябожчыка заносілі ў царкву для адпявання, яго жонка і ўсе родныя жаночага полу павінны былі, узяўшыся за рукі, прайсці пад труной у час, калі яе неслі да дзвярэй. Па словах М.Я. Нікіфароўскага, растлумачыць сэнс гэтах дзеянняў сяляне не здолелі [57, с. 59; 62, с. 515].

Аднавяскоўцы выходзілі на вуліцу, каб развітацца з нябожчыкам. Хто не мог ісці на могілкі, стаяў у варотах і хрысціўся або праходзіў разам з працэсіяй колькі метраў, а потым станавіўся на калені, хрысціўся і кідаў услед тры жмені зямлі або снегу. Лічылася, што нельга спаць, калі вязуць памерлага, асабліва дзецям (соннага можа забраць смерць), а трэба калі не выйсці на вуліцу, дык хаця б глядзець у акно. Пажаданым было патрэсці вулей з пчоламі, каб яны не загінулі [57, с. 59-60; 59, с. 384-385]. Цяжарным жанчынам глядзець на нябожчыка забаранялася. У адваротным выпадку дзіця магло нарадзіцца занадта бледным. Каб прадухіліць непажаданую сустрэчу, уперад маглі пасылаць аднаго з удзельнікаў жалобнага шэсця [57, с. 60; 59, с. 384]. Труну нельга было абганяць, інакш чалавек мог памерці. Тое ж датычылася людзей, якія ідуць насустрач – яны павінны былі спыніцца, каб не зрабіць сабе горш [59, с. 384-385].

Падчас руху на могілкі нікому з удзельнікаў пахавання нельга было азірацца назад, каб у вёсцы хутка ніхто не памёр. Пры кожным прыпынку жалобнага шэсця каля капліцы ці дарожнага крыжа ўсе яго ўдзельнікі бралі па жменьцы зямлі, расціралі яе пальцамі і кідалі наперад, каб гэты нябожчык быў у іх вёсцы апошнім [59, с. 385].

З увядзеннем ва ўсходнеславянскіх землях хрысціянства месцы імкнулася вызначаць царква, утвараліся могілкі пры цэрквах. Пры гэтым старыя месцы таксама працягвалі функцыянаваць. Так было не толькі на Беларусі і не толькі ў славян. Напрыклад, у скандынаўскай і эстонскай пахавальных традыцыях прынята адрозніваць старыя могілкі, што выкарыстоўвалі з паганскіх часоў, і новыя могілкі каля цэркваў, а дакладна – “царкоўныя двары” (адпаведна “cementeries” і “churchyards” у англамоўным варыянце) [57, с. 68; 67; 68]. Але прыцаркоўныя месцы пахавання не маглі цалкам задаволіць патрэб насельніцтва. У суседняй Расіі ў 1731 г. было загадана не праводзіць пахаванні “ў гарадах, сяленнях і слабодах”, а рабіць гэта на спецыяльных месцах за межамі населеных пунктаў – “кладбищах” [57, с. 68]. Гэтая традыцыя мела месца і сярод праваслаўных вернікаў Беларусі, тым больш, што ў хуткім часе беларускія землі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі. Напрыклад, у канцы XVIII ст. каля Полацка былі заснаваныя новыя могілкі [52, с. 60; 57, с. 68].

Чаму працягваліся пахаванні каля старых могілак, калі з хрысціянізацыяй у Вялікім княстве Літоўскім пашыраецца сетка парафій з парафіяльнымі могілкамі, тое ж датычыцца і праваслаўных прыходаў? На думку М. Космана, акалічнасцей было некалькі. Па-першае, восенню і вясной з прычыны дрэнных шляхоў зносін жыхарам праблематычна было адвозіць памёршых на новыя, царкоўныя могілкі. Па-другое, новыя могілкі часткова або поўнасцю былі пазбаўлены якой-небудзь агароджы, таму сабакі і свінні вырывалі рэшткі памерлых. Косткі былі раскіданы па ўсёй тэрыторыі такіх могілак, бо клір быў не ў стане сачыць за парадкам. Па-трэцяе, пахаванні на старых могілках каштавалі ўтрая танней, чым на новых. Дарэчы, праходзілі яны без удзела святара. Старыя могілкі былі асабліва папулярныя да канца XVI ст., калі з ініцыятывы касцёла частка іх была ліквідавана [33, с. 40].

Магілу звычайна капалі пасля поўдня ў дзень пахавання. У беларусаў, у тым ліку на Падзвінні, гэта ўваходзіла ў абавязак мужчын, звычайна сярэдняга і старэйшага ўзросту, дужых. У час іх работы непажаданай была прысутнасць жанчыны на могілках, а ўдаве, якая нядаўна згубіла мужа, у гэты момант наогул забаранялася набліжацца [57, с. 68]. Паводле М.Ф. Нікіфароўскага, пры капанні новай магілы нярэдка натыкаліся на старую, аб чым сведчылі рэшткі костак. Па чутках, у такіх магілах неаднаразова знаходзілі бутэлькі з

гарэлкай, некалі пакладзеныя ў дамавіну нябожчыка. “Далакопы не толькі не грэбавалі падобнай знаходкай, а з задавальненнем ужывалі яе тут жа на месцы. Але за то “ўмацаваўшаяся” гарэлка так хутка і моцна дзейнічае, што яны ледзь паспяваюць адысці прочкі ад магілы, як зваляцца з ног і засынаюць дужа моцным сном” – адзначае даследчык [62, с. 517].

Пасля прыезду пахавальнай працэсіі на могілкі труну ставілі на зямлю каля выкапанай магілы, якую святар (пры яго наяўнасці) акрапляў святой вадой. У развітальных галашэннях на могілках гучалі матывы “апошняй мінутачкі”, прабачэння, канчатковага развітання, хуткай сустрэчы нябожчыка з тымі, хто памёр раней, чакання яго з’яўлення ў выглядзе птушкі або расліны, зварот да продкаў ці да зямлі прыняць памёршага [59, с. 385]. Святар чытаў адпаведныя малітвы. Перад тым, як канчаткова закрыць труну і забіць яе цвікамі, родныя цалавалі нябожчыка ў твар або ў руку [59, с. 385]. Пасля развітання “грабаўшчыкі” адразу закрывалі дамавіну векам, забівалі цвікамі і затым разам з магільшыкамі на доўгіх палатняных ручніках або вяроўках апускалі ў магілу [57, с. 69].

Паўсюль на Падзвінні перад апусканнем труны ў магілу кідалі грошы. На Гарадоччыне гэта тлумачаць так: “Грошы і ціпер кладуць. За места плоцяць. Абычна бываець, што на адным месце не адзін чалавек схаронены: хто-та тут ужо быў, і на тым месце другога хароняць. “Ну вот, – гаворачь, – зямлю купляець у пакойніка”, у тога, значыць, хто быў закапаны раньшэ там” [59, с. 385].

На свежай магіле адзін з тых, хто яе капаў, рабіў крыж так, каб ён размяшчаўся нібыта на грудзях нябожчыка [59, с. 386]. На Беларусі не заўсёды сапраўдны крыж на магіле ставіўся ў дзень пахавання. Царкоўны вынасны крыж, з якім працэсія ішла на могілкі, пасля пахавання забіраўся назад. Часам над свежай магілай рабіўся часовы знак – г.зв. “сіямінутны крыж”, які па форме толькі нагадваў крыж і быў вельмі падобны на метку, якую ставілі на магілах няхрышчаных і ў месцах дзе было невядома, хто і калі пахаваны. Часовы знак утвараўся з вертыкальнага кіёчка вышынёю каля 50 см і доўгага гарызантальнага прутка. Апошні быў мершаю велічыні ямы для тых, хто капаў магілу, і адпавядаў даўжыні дамавіны. Мерку заціскалі ў расшчэпіне вертыкальнага кіёчка, утвараючы такім чынам канструкцыю, падобную на крыж з доўгімі гарызантальнымі канцамі. Часам мерку пераломвалі папалам і утваралі сіямінутны крыж з двух яе частак [54, с. 49]. Паводле М.Ф. Нікіфароўскага, гэта мог быць невялікі часовы крыж, змайстраваны на месцы, пры дапамозе нажа, з сырога сука алешыны ці бярозы [62, с. 515-516]. Часовы крыж замянялі больш даўгавечным або каменем прыблізна праз год [41, с. 158].

Размяшчэнне крыжа на магіле абумоўлівалася бытаваннем старадаўніх паганскіх і больш новых хрысціянскіх уяўленняў. Згодна з язычніцкай традыцыяй, крыж успрымаўся як знак, які не магла пераступіць “нячыстая сіла”. Таму яго патрэбна было ставіць у галавах памёршага. Ён быў над нябожчыкам і ахоўваў яго ў магіле. Хрысціянская традыцыя патрабуе стаўленне крыжа ў нагах пахаванага, каб у час уваскрасення чалавек мог бачыць перад сабой крыж і хрысціцца [57, с. 71].

З-пад труны выграбалі сена або салому, якую пакідалі на акраіне могілак. Пастухам, калі яны пасвілі жывёлу недалёка, забаранялася дазваляць жывёле есці гэтае сена. Хлеб і соль, суправаджаўшыя нябожчыка, аддавалі жабраку, які спецыяльна прыйшоў на могілкі, або нават адсылалі дадому, калі не змог прыйсці [62, с. 516].

Дадому вярталіся хутка, ніхто не павінен быў азірацца. Конь павінен быў ісці парожнім або мог везці вельмі старога чалавека, прычым не роднага памерламу. Калі патрэбы везці больш не было, дома каня распрагалі. Летам у гэты дзень яго адводзілі на пашу, зімой – кармілі асобна ад астатніх. На наступны дзень каня можна было выкарыстоўваць ў гаспадарчай рабоце [59, с. 386; 62, с. 516].

Пасля вяртання абавязкова мылі рукі і, калі не спраўлялі памінак да могілак, садзіліся за стол. Працэдура мала чым адрознівалася ад практыкаваўшайся перад пахаваннем, хіба за натуральным выняткам частавання на дамавіне чалавека, які вёў каня. Таксама, калі хапала



PolotskSU

месца, садзіліся ўсе разам, у адваротным выпадку паміналі па чарзе. У другім выпадку радні і “капачы” (тыя, хто капаў магілу) елі ў апошнюю чаргу, бо абслугоўвалі астатніх [59, с. 386].

Як казалася, кожны ўдзельнік абеду павінен быў выпіць ці хаця б прыгубіць тры чаркі гарэлкі і паспрабаваць не менш, як тры стравы. Верылі, што на “гарачы абед” душа памёршага заклікала і іншыя душы раней памерлых членаў рода. Таму лічылі, што парам, які ідзе ад гарачых страў, частуюцца душы. Пасля трэцяй чаркі госці дзякавалі гаспадароў, выказвалі ім свае спачуванні і ішлі дадому. Лічылася, што хто раней выйдзе з хаты, раней і памрэ. Таму першым павінен быў выходзіць старэйшы па ўзросту чалавек. Гэта не датычылася толькі царкоўных служак і асоб, якія адпявалі нябожчыка [58, с. 373].

Такім чынам, рытуалізаваныя дзеянні, што ахоплівалі прамежак часу ад вынасу нябожчыка з хаты да яго пахавання на могілках, мелі на мэце давесці да лагічнага завяршэння справу пераводу нябожчыка са свету жывых у свет памерлых. Апошні шлях – дарога ад хаты да могілак – успрымалася як вельмі адказная працэдура, парушэнне рэгламенту якой патэнцыйна несла небяспеку ўсёй вёсцы. Памёршага трэба было забяспечыць ягонай доляй, развітацца з ім, як належыць, давесці да могілак і апусціць дамавіну ў загадзя падрыхтаваную адпаведна з традыцыяй магілу. Родныя і аднавяскоўцы ўдзельнічалі ў памінальным абедзе, што да таго ж выконваў функцыю пераразмеркавання долі пасля змянення колькасці членаў сельскай абшчыны. Удзел святара ў пахавальным абрадзе не быў абавязковым. Скрупулёзнае выкананне неабходных рытуальных дзеянняў павінна было прывесці да пажаданага выніку, калі нябожчык і жывыя працягваюць адносна камфортна існаваць – кожны ў сваім свеце.

Археалагічныя даследаванні паказваюць, што пахавальная абраднасць мела свае асаблівасці ў двух археалах: паўночна-ўсходнім (могільнік каля в. Дубраўка) і паўднёвым (могільнікі Івесь, Доўгае, Жарнасекава, Клешчыно, Бірулі, Мураўшчына). У паўночна-ўсходнім арэале выяўлены звычай падпахавання дарослых людзей ва ўжо існуючыя магілы, аднак пры гэтым ранейшыя пахаванні імкнуліся не парушаць. Таксама выяўлены звычай развядзення вогнішчаў на магіле. У паўднёвым арэале выяўлена дзіцячых падпахаванняў ва ўжо існуючыя магілы. Даследаваныя пахаванні адносяцца да праваслаўных могілак за выключэннем пахаванняў на могільніку каля в. Васькавічы. Эвалюцыя пахавальна-памінальнай абраднасці прасочваецца ў змяншэнні памера камянёў і перавазе абкладак магільнага насыпа па перыметры над суцэльнымі вымасткамі. . Пахаванні XVII–XVIII стст. (могільнікі каля вёсак Клешчыно і Жарнасекава) адрозніваюцца менш працаёмкімі ў вырабе канструкцыямі каменных надмагілляў у параўнанні з пахаваннямі XIV–XVI стст. Таксама у пахаваннях XVII–XVIII стст. часцей сустракаецца пахавальны інвентар, што маркіруе сацыяльны статус памерлага.

PolotskSU

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Такім чынам, улічваючы шматузроўневую структуру пахавальных помнікаў, іх класіфікацыю трэба праводзіць на кожным узроўні. На ўзроўні могільнікаў (пахавальных груп) вылучаюцца віды, тыпы і катэгорыі. Крытэрыем вылучэння віда служаць знешнія асаблівасці пахавальных комплексаў, што ўтвараюць групу. Вылучаюцца курганныя, грунтовыя (у т.л. жальнікі) і змешаныя могільнікі. Тып могільнікаў (гарадскія, сельскія) вызначаецца з улікам таго, адносіліся пахавальныя групы да гарадоў або выкарыстоўваліся сельскім насельніцтвам. У залежнасці ад наяўнасці на могільніку або пры ім культавай пабудовы, могільнікі дзеляцца на две катэгорыі. На ўзроўні пахавальных комплексаў класіфікацыя праводзіцца паводле пахавальнага збудавання з вылучэннем наступных відаў: курганныя, грунтовыя (у т.л. жальнічныя) пахаванні, а таксама пахаванні ў культавых пабудовах. Унутры жальнічных пахаванняў вылучаюцца наступныя тыпы: з надмагіллямі ў выглядзе кладкі і ў выглядзе абкладкі. Зыходзячы з канструктыўных асаблівасцей надмагілляў, тыпы падзяляюцца на варыянты (надмагіллі без буйных камянёў у галавах і нагах, надмагіллі з буйнымі камянямі ў галавах і нагах, надмагіллі з буйнымі камянямі ў галавах, надмагіллі з каменнымі крыжамі).

Пераважная большасць пахавальных помнікаў лакалізавана на левабярэжжы Заходняй Дзвіны (гл. мал. А.1) [44]. Можна казаць як мінімум аб двух адасобленых арэалах распаўсюджанасці пахавальных помнікаў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі. Першы размешчаны на правым беразе Дзвіны ў Гарадоцкім раёне. Другі – на тэрыторыі Глыбоцкага, паўднёвым захадзе Полацкага, Лепельскім, Докшыцкім раёнах. Найбольшая шчыльнасць пахавальных комплексаў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі назіраецца ў Глыбоцкім, на паўднёвым захадзе Полацкага і ў Лепельскім раёнах.

Заходні арэал распаўсюджання каменных надмагільных канструкцый на Беларускім Падзвінні мяжуе з рэгёнам найбольшага пашырэння каменных магіл – Панямоннем. Можна казаць аб сувязі насельніцтва гэтых рэгёнаў. Разам з тым, А.В. Квяткоўская ўказвае на наяўнасць адметнасцей у пахавальных традыцыях насельніцтва Панямоння і Падзвіння. Так, у Беларускім Падзвінні пахаванні збольшага безынвентарныя [18]. А.В. Квяткоўская кажа аб сувязі каменных надмагільных канструкцый з пахавальным абрадам балцкіх (яцвяжскіх) плямён. У такім разе, наяўнасць такой істотнай лакальнай асаблівасці павінна сведчыць або аб змешванні прыйшлага і аўтахтоннага насельніцтва (на гэта ўскосна ўказвае "левабярэжная" традыцыя наяўнасці на могілах кургаоў побач з каменнымі магіламі), або аб моцным уплыве хрысціянскай рэлігіі на практыку ажыццяўлення пахавальнага абрада (праяўляецца ў безынвентарнасці) пры захаванні некаторых яго адметных рысаў (пабудова каменных надмагілляў). Улічваючы этнічныя і канфесійныя працэсы, можна казаць аб паступовай асіміляцыі балцкага насельніцтва славянскім пры захаванні адметных традыцый пахавальнага абрада, якія, у прынцыпе, не супярэчылі хрысціянскім дагматам і аб прыстасаванні гэтых традыцый да нормаў хрысціянства.

У гэтым кантэксце варта асабліва вылучыць пахавальныя комплексы з каменнымі крыжамі. Высокая канцэнтрацыя пахаванняў з каменнымі крыжамі назіраецца ў Глыбоцкім, паўднёвым захадзе Полацкага і ў Бешанковіцкім раёнах. Арэал іх распаўсюджанасці збольшага супадае з арэалам пашырэння іншых каменных намагільных канструкцый. Калі разглядаць каменныя крыжы як маркер больш позніх пахавальных помнікаў (у межах XIV – XVIII стст.), то супадзенне арэалаў распаўсюджвання пахаванняў з каменнымі надмагільнымі канструкцыямі і з каменнымі крыжамі можна разглядаць як прыкмету эвалюцыі ў вырабе надмагільных збудаванняў, пераемнасці у традыцыях стварэння надмагілляў.

Археалагічныя даследаванні паказваюць, што пахавальная абраднасць мела свае асаблівасці ў двух археалах: паўночна-ўсходнім (могільнік каля в. Дубраўка) і паўднёвым (могільнікі Івесь, Доўгае, Жарнасекава, Клешчыно, Бірулі, Мураўшчына). У паўночна-

ўсходнім арэале выяўлены звычай падпахавання дарослых людзей ва ўжо існуючыя магілы, аднак пры гэтым ранейшыя пахаванні імкнуліся не парушаць. Таксама выяўлены звычай развядзення вогнішчаў на магіле. У паўднёвым арэале выяўлена дзіцячых падпахаванняў ва ўжо існуючыя магілы. Даследаваныя пахаванні адносяцца да праваслаўных могілак за выключэннем пахаванняў на могільніку каля в. Васькавічы.

Эвалюцыя пахавальна-памінальнай абраднасці прасочваецца ў змяншэнні памера камянёў і перавазе абкладак магільнага насыпа па перыметры над суцэльнымі вымасткамі. . Пахаванні XVII–XVIII стст. (могільнікі каля вёсак Клешчыно і Жарнасекава) адрозніваюцца менш працаёмкімі ў вырабе канструкцыямі каменных надмагілляў у параўнанні з пахаваннямі XIV–XVI стст. Таксама у пахаваннях XVII–XVIII стст. часцей сустракаецца пахавальны інвентар, што маркіруе сацыяльны статус памерлага.



PolotsSU

PolotskSU

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Анучин Д.Н. Погребальные обычаи// Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. [Электронный ресурс]. – Электрон. дан. и прогр. – СПб.: Медиалэнд, б.г. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM): Зв., цв., 12 см. – Систем. требования: Pentium 166 MHz, 32 MB RAM, DVD-ROM, Windows 98/ME/XP/2000; зв. карта. – Загл. с этикетки диска.
2. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск: Беларуская навука, 1997 – 2001. – Т. 4. Помнікі XIV – XVIII стст./ В.М. Ляўко [і інш.]; Пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.; іл.
3. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.; іл.
4. Багамольнікаў У., Рыер Я. Пахавальны абрад// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. М – Пуд/ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд. і інш.). – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 450-451.
5. Багамольнікаў, У. Пахавальны абрад / У. Багамольнікаў, Я. Рыер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. М – Пуд / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд. і інш.). – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 450-451.
6. Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. – СПб.: Наука, 1993. – 223 с.
7. Беларусы: У 8 т. Т. 5. Сям'я/ В.К. Бандарчык, Т.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 375 с.; іл.
8. Брей, У. Археологический словарь / У. Брей, Д. Трамп. – М.: Прогресс, 1990. – 368 с.; ил.
